Особенно большой вклад в подготовку учителей риторики внес знаменитый поэт, теоретик литературы и ораторского искусства, философ и талантливейший педагог Матей Казимир Сарбевский (1595-1640). Его творчество оказало большое влияние на европейскую культуру. Выдающимся его учеником являлся Николай Кмитиц (1601-1632).

Полоцкие иезуиты осуществляли подготовку учителей риторики до 1631-32 учебного года. Группа будущих преподавателей во главе со своим наставником Сигизмундом Лауксманом, который в течение последнего учебного года читал курс риторики в Полоцке, перебралась в Несвиж, где подготовка молодых специалистов продолжалась до 1636-37 учебного года.

В иезуитских школах нашего региона трудился различный контингент учителей. Среди них были высококвалифицированные педагоги, внесшие весомый вклад в подготовку кадров для учебных заведений, как средних, так и высших, одаренные писатели, а также профессоры, количество которых достигло довольно внушительной цифры по сравнению с первыми десятилетиями деятельности ордена иезуитов на Витебской земле. Присутствие их положительно сказывалось на результатах учебного процесса в школах. Молодым, только вступившим на педагогическую стезю, иезуитам было у кого учиться и с кого брать пример в этом труднейшем человеческом ремесле. Они имели возможность не только получить у этих преподавателей консультацию по интересующему их вопросу, но и конкретную практическую помощь в проведении занятий с учащимися. Более того, «Устав» обязывал наиболее опытных профессоров отводить работе с магистрами три часа времени еженедельно. Это в свою очередь способствовало росту профессионального мастерства последних и, следовательно, более плодотворному обучению учащихся.

Новым явлением в учебных заведениях ордена, расположенных в регион, было введение в программу иностранных языков. В Оршанской школе это осуществилось в 1751-1752 учебном году.

В Полоцкой школе, одной из самых крупных в Беларуси, он был введен значительно позднее, чем в других учебных заведениях. Это событие впервые состоялось в 1757-1758 учебном году, когда в педагогическом штате коллегии появилась должность профессора математики и французского языка. Ее исполнял Ян Гробель. Интересен следующий факт. Первоначально руководство провинции привлекало к обучению молодежи иностранным языкам иезуитов немецкого и французского происхождения. Этот факт положительно сказывался на учебном процессе: на занятиях учащиеся слышали правильную иностранную речь, лишенную каких-либо искажений. Впоследствии иностранные языки преподавались членами Литовской провинции.

Другим новым явлением, имевшим место в большинстве учебных заведений иезуитов в регионе, было введение в их программу изучения истории и географии. В 1749-1750 учебном году история была введена в Полоцкой школе, а в 1751-1752 учебном году в Витебской школе.

Преподавали ее не магистры, а ксендзы-профессоры. География преподносилась ученикам как часть истории. Лишь в Витебской школе она указана в каталоге как отдельный предмет. Белорус Франтишек Папроцкий (1723-1805), вступивший в орден «Общество Иисуса» в Полоцке в 1740 г и ставший профессором в 1758 г. его перу принадлежит ряд историко-географических трудов, некоторые из них переиздавались несколько раз: «Польские домашние сведения и Великого

княжества Литовского», где основная ее часть была посвящена истории Великого княжества Литовского. Последние страницы учебника были отведены вопросам географии и истории. Он автор и учебника по географии, который нашел широкое применение даже после закрытия орденских школ в школах Адукационной комиссии.

1. Блинова,Т.Б. Иезуиты в Беларуси / Т.Б. Блинова. – Гродно, 2002.

**Яршоў І.А.**

## КУЦЕІНСКІ "БУКВАР" СПІРЫДОНА СОБАЛЯ

Вялікае значэнне ў гісторыі асветніцтва і адукацыі беларускага народа ў XVI–XVII ст. мела друкаванне кірылічных вучэбных кніг для першапачатковага навучання грамаце. Гэта было выклікана сацыяльна-палітычным становішчам, якое склалася на Беларусі. Пасля Люблінскай уніі 1569 г. у Вялікім княстве Літоўскім (далей – ВКЛ) узмацнілася феадальна-каталіцкая рэакцыя. У адказ на яе праваслаўнае гарадское насельніцтва пачало ствараць праваслаўныя брацтвы, якія вялі барацьбу супраць наступства каталіцкай царквы і асімілятарскай палітыкі Польшчы. У пачатку XVII ст. у выніку Берасцейскай уніі 1596 г. праваслаўная царква апынулася ў цяжкім становішчы, паколькі большасць праваслаўных епіскапаў на чале з мітрапалітам Міхаілам Рагозам перайшлі ва ўніяцтва. Звужалася кола носьбітаў царкоўнаславянскай мовы і праваслаўныя брацтвы сталі ствараць брацкія школы і друкарні для выпраўлення сітуацыі. У друкарнях друкаваліся не толькі кнігі царкоўнага ўжытку, але і вучэбныя – граматыкі, слоўнікі, буквары славянскай мовы. З 1590 па 1653 гг. на Беларусі было надрукавана 16 азбук і буквароў на кірыліцы [2, с. 354]. Сярод іх аўтараў пачэснае месца займае кнігадрукар і асветнік Спірыдон Собаль – аўтар Куцеінскага "Буквара".

Дакладных звестак аб даце нараджэння С. Собаля не захавалася, але вядома, што ён быў сынам магілёскага купца Б. Собаля, актыўнага ўдзельніка магілёўскага праваслаўнага брацтва, аднаго з кіраўнікоў паўстання магілеўчан супраць уніяцкага архіепіскапа І. Кунцэвіча. Выхаванне ў праваслаўнай сям'і, навучанне ў магілёўскай брацкай школе безумоўна сталі галоўнай прычынай далейшага выбару ім жыццёвага шляху, які быў звязаны з кнігадрукаваннем, праваслаўнай асветніцкай і педагагічнай дзейнасцю. У выніку ўскладнення сацыяльна-палітычнага становішча на ўсходніх землях Беларусі пасля Магілёўскага 1618 г. і Віцебскага 1623 г. паўстанняў супраць уніяцкага архіепіскапа І. Кунцэвіча, развіццё

кірылічнага кнігадрукавання было тут немагчыма. Хутчэй за ўсё, таму С. Собаль і пераязджае ў Кіеў, які пасля прызначэння ў 1922 г. Кіеўскім праваслаўным мітрапалітам Іова Барэцкага стаў цэнтрам праваслаўя ў Рэчы Паспалітай. У Кіеве С. Собаль вывычаў друкарскую справу. Першыя кнігі былі ім выдадзены ў Кіеўскай друкарні ў 1638-1630 гг. і прызначаліся для царкоўных патрэб.

У 1630 г. С.Собаль атрымаў запрашэнне ад І.Труцэвіча – ігумена праваслаўнага Куцеінскага мужчынскага Богаяўленскага манастыра, які быў пабудаваны пад Оршай на сродкі праваслаўнага феадала Б. Статкевіча, узначаліць манастырскую друкарню. Куцеінскі манастыр стаў у першай палове XVII ст. цэнтрам праваслаўя на ўсходзе Беларусі. Ва ўмовах палітыкі акаталічвання і паланізацыі яго дзейнасць была накіравана на ўмацаванне праваслаўя, развіццё праваслаўнай адукацыі, выхаванне беларускага насельніцтва ў духу нацыянальнай самасвядомасці. Запрашэнне ў Куцейна С. Собаля не было выпадковым. Ігумен Куцеінскага манастыра І. Труцэвіч і многія манахі былі членамі магілёўскага праваслаўнага брацтва, таму ведалі і бацьку С. Собаля, і яго самаго як актыўных удзельнікаў гэтага брацтва, прыхільнікаў праваслаўнай асветніцкай дзейнасці. С. Собаль прыняў прапанову і ў 1630 г. пераехаў у Куцейна, дзе разам з ігуменам І. Труцэвічам стварыў на сродкі Б. Статкевіча друкарню і наладзіў друкарскую справу. Захаваўся пералік друкарскага абсталявання, якое ён прывёз з Кіева: 2 шрыфты, 13 дошак-заставак, 3 дошкі-канцоўкі, некалькі дзесяткаў буйных і малых ініцыялаў, 2 рамкі для тытульных лістоў [3, с.135]; астатнія прыстасаванні зрабілі манахі і мясцовыя жыхары.

У 1631–1632 гг. С. Собаль надрукаваў у Куцейна кірыліцай кнігі рэлігійнага характару "Брашна духоўнае", "Малітвы паўсядзённыя" і "Часаслоў", якія выкарыстоўваліся і для навучальных патрэб, але мала адпавядалі апошнім. Вось чаму С. Собаль падрыхтаваў неабходныя матэрыялы і выдаў у Куцеінскай друкарні ў 1631 г. вучэбную кнігу для першапачатковага навучання грамаце. На яе тытульным лісце было надрукавана: "Буквар", а ніжэй літарамі меншага памеру: "сиречь начало учения детям начинающим чтению извыкати". Некаторыя даследчыкі ў свой час прызнавалі першынство С. Собаля ва ўвядзенні назвы "буквар" для кнігі, якая прызначалася для першапачатковага навучання грамаце, таму што раней такія кнігі называлі "азбукай" [4, с.135]. Але трэба адзначыць, што першае выданне пад назвай "буквар" выйшла ў 1618 г. з друкарні Святадухаўскага манастыра ў Еўі, што пад Вільняй. Хутчэй за ўсё, як лічыў даследчык М. Батвіннік, назва "буквар" паходзіць ад літараў старaславянскага алфавіту "буки" і "веди" ці ад слова "буква" [1, с. 61]. Тым не менш, менавіта пасля выдання ў 1631 г. Куцеінскага "Буквара" гэта назва вучэбных кніг стала найбольш распаўсюджанай і

захоўваецца ў якасці назвы падручніка для пачатковай школы да нашага часу.

Куцеінскі "Буквар" С. Собаля фактычна з'яўляўся падручнікам для навучання першапачатковай грамаце (чытанню і пісьму), і ўзорам для яго паслужыў еўінскі "Буквар" 1618 г. Састаўлены "Буквар" С. Собалем паводле літараскладальнага метаду. У структуру кнігі ўключаны алфавітны рад (у прамым і адваротным пачатку), склады (двух- і трохлітарныя), элементы граматыкі, дыдактычны матэрыял. Кніга мела 40 лістоў (80 старонак), і яе можна ўмоўна падзяліць на дзве часткі [1, с.69-70]. У першай змяшчаліся першапачатковыя звесткі аб грамаце, асноўныя граматычныя паняцці. У другую частку С. Собаль уключыў біблейскія тэксты маральнага зместу, якія адначасова былі і сродкам навучання чытанню, і сродкам выхавання хрысціянскай маралі. Такім чынам, "Буквар" рашаў і задачу навучання і выхавання дзяцей у праваслаўным накірунку. М. Батвіннік адзначаў, што Куцеінскі "Буквар" адрозніваецца ад папярэдніх і пазнейшых выданняў такіх вучэбных кніг кампазіцыйнай зладжанасцю, невялікім аб'ёмам, зручнасцю карыстання, мэтанакіраванасцю, паслядоўнасцю ўвядзення вучняў у свет ведаў і выпрацоўкай у іх пэўных жыццёвых пазіцый. Перавыданне "Буквара" С. Собалем у 1636 г. у Магілёўскай друкарні сведчыць аб тым, што ён надаваў асаблівае значэнне выданню вучэбных кніг для пашырэння пісьменнасці народа.

Даследчыкам не ўдалося дакладна высветліць, дзе жыў і працаваў С. Собаль у 1633-1634 гг. Па адной версіі ён застаўся ў Куцейна і перавыдаў тут свае кіеўскіе выданні, толькі не з куцеінскімі, а кіеўскімі выхаднымі дадзенымі. Па другой версіі ў 1632 г.друкар пераехаў пад Магілёў і выдаваў гэтыя кнігі ў Буйніцкай друкарні Б. Статкевіча. Дакладна вядома, што ў гэтай друкарні ў 1635 г. ім быў выдадзены "Псалтыр". Вяртанне С. Собаля ў Магілёў можна растлумачыць тым, што Куцеінская друкарня пад кіраўніцтвам І. Труцэвіча, дзе С. Собаль у 1630-1632 гг. наладзіў друкарскую справу, магла працаваць самастойна (дзейнасць яе пад кіраўніцтвам І. Труцэвіча працягвалася да 1654 г.), а магілёўскаму праваслаўнаму брацтву быў патрэбны вопытны друкар. У 1633 г. кароль Рэчы Паспалітай Уладзіслаў IV выдаў магілёўскаму праваслаўнаму брацтву прывілей на права адкрыцця друкарні і выдання навучальных і іншых кніг на "рускай" (старабеларускай), грэчаскай, лацінскай і польскай мовах. Брацтва гэта права перадало С. Собалю. У 1636–1638 гг. С. Собаль працуе ў брацкай друкарні Магілёва і выдае некалькі кніг, у тым ліку і "Буквар" 1636 г. Гэты "Буквар" меў адрозненні ад куцеінскага: была скарочана значная частка граматычнага матэрыялу, павялічаны аб'ём тэкстаў з "Бібліі", спрошчана паліграфічнае афармленне.

Пра апошнія гады жыцця С. Собаля дакладных звестак захавалася вельмі мала. У канцы 30-х гадоў XVIIст. паміж магілёўскім епіскапам Сільвестрам Косавым і магілёўскім праваслаўным брацтвам не было поўнай згоды, а ўніяты чынілі ўсё большыя перашкоды дзейнасці брацтва. У 1637 і 1639 гг. С. Собаль звяртаўся да маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча з прапановай распачаць друкарскую справу ў Маскве, але атрымаў адмоўны адказ, таму што ў Маскве на яго глядзелі як на патэнцыяльнага ерэтыка. Далейшы лёс С. Собаля невядомы. Ёсць думка, што ён пастрыгся ў манахі і памёр ад хваробы ў 1645 г. [3, с. 144].

Друкар С.Собаль усяго выдаў 19 найменняў кніг. Але галоўным дасягненнем яго друкарскай і асветніцкай дзейнасці лічыцца "Буквар". Гэта кніга карысталася вялікім попытам, таму пасля Куцейны перавыдавалася ў Магілёўскай друкарні ў 1636 і 1649 гг., Куцеінскай друкарні ў 1653 г. [4, с. 252]. "Буквар" С. Собаля меў вялікае значэнне для распаўсюджвання асветы і адукацыі на Беларусі, Украіне, Расіі. Гэта вучэбная кніга ва ўмовах палітыкі насаджэння каталіцызму і паланізацыі дала магчымасць беларусам захаваць сваю мову, духоўную культуру. А імя С. Собаля – асветніка і кнігадрукара, патрыёта сваёй Радзімы назаўсёды засталося ў памяці нашчадкаў, гісторыі адукацыі нашай краіны.


1. Ботвинник, М. Откуда есть пошел букварь / М. Ботвинник. – Минск: Вышэйшая школа, 1983. – 198 с.
2. Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя: У 2 т. – Т. 1: Абаленскі – Кадэнцыя / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2005. – 688 с.
3. Зернова, А.С. Белорусский печатник Спиридон Соболь / А.С. Зернова // Книга: исследования и материалы: сб. X. – М., 1965. – С. 126 – 144.
4. Симмонс, Дж.С.Г. О некоторых старопечатных кириллических книгах в Дублине / Дж.С.Г. Симмонс // Книга: исследования и материалы: Сб. VIII. – М., 1963. – С. 245–253.



**Орлова А.П., Зинькова Н.К.**


## ГИМНАЗИЧЕСКОЕ ОБРАЗОВАНИЕ В ВИТЕБСКЕ (XIX – начало XX ст.)

Закономерный интерес к историческому прошлому вызывает возрождение и функционирование гимназий в г. Витебске. Исторический опыт позволяет восстанавливать преемственность культуры в образовании.

В Витебске гимназическое образование стало формироваться в начале XIX века, и было представлено двумя известными учебными заведениями: Александровской мужской гимназией (1808 г.) и жен-

ской Мариинской гимназией (1866 г.). Они внесли существенный вклад в культурно-образовательную среду города и губернии.

Витебская мужская гимназия (1808-1918 гг.), пережила несколько этапов реформирования, внесших как прогрессивные (автономность, бессословность), так и регрессивные (усиление сословного принципа образования, утверждение классицизма, ужесточение контроля за деятельностью преподавателей и учащихся) начинания. За 110 лет своего существования гимназия выпустила около 32 тысяч юношей. Впоследствии ряд выпускников гимназии стали известны как в Беларуси, так и в России: государственный деятель России, сенатор Кублицкий-Пиоттух, декабрист И.И. Горбачевский, организатор библиотечного дела в России В.И. Собольщиков, философ Н.О. Лосский, ученый-медик С.И. Чирьев и др.

Гимназия являла собой среднее учебное заведение, готовившее своих воспитанников к продолжению образования в университете или к государственной службе, что обуславливало ее престиж. Финансирование осуществлялось за счет незначительных поступлений Министерства народного просвещения, но, в основном, за счет частных пожертвований. Плата за обучение вводится лишь с 40-х годов, хотя в российских гимназиях она взималась с 1817 года. От платы освобождались десять-двадцать процентов учащихся, но на практике их количество было значительно больше.

Социальный состав гимназистов, в основном представлен выходцами из дворянского сословия (в середине 40-х годов они составляли почти 90%). На рубеже XIX-XX веков, количество учащихся из городского и сельского населения составляло 30-35%.

Следует отметить тесную связь Александровской гимназии с университетами - Виленским, Санкт-Петербургским. Инспектирование гимназии осуществлялось визитаторами, – известными профессорами и академиками университетов. Такое сотрудничество не только освобождало гимназию от излишнего бюрократического администрирования, но и играло важную роль в совершенствовании учебно-воспитательного процесса: университеты брали на себя заботу об обеспечении гимназии книгами, наглядными пособиями, приборами, оказывали большую методическую помощь.

Несмотря на перегрузку учебного плана Витебской Александровской гимназии, он обладал определенной логикой, был структурирован в соответствии с канонами классического образования. Основные предметы - Закон Божий, древние языки, русский язык и словесность, математика, физика, география, всеобщая история, космография, чистописание, помимо этого включались немецкий, французский, логика, черчение, рисование. Учебный план изменялся в соответствии с проводимыми образовательными реформами и запросами

общества. Так, для желающих поступить на государственную службу, впоследствии было введено законоведение, ввиду нехватки межевых чиновников – землемерные курсы.

Характерная черта учебного плана – наличие факультативов и деление предметов на главные и второстепенные. Неуспеваемость по второстепенному предмету не являлась препятствием для перевода учащихся в следующий класс. Однако многие педагогов считали такую практику вредной, поскольку побуждали учащихся относиться с меньшим усердием к некоторым предметам.

Постепенно в учебном процессе гимназии наметился переход от словесно-догматического преподавания к методам, способствующим развитию познавательных интересов учащихся. Практиковались лекции, беседы, работа с учебником, наглядные пособия, экскурсии познавательного характера, написание рефератов. С отстающими занимался учитель или гимназист-старшеклассник, получавшие за это вознаграждение «из гимназических сумм».

В гимназии практиковались так называемые репетиции (повторение учебного материала параллельно с проверкой знаний учащихся), на которых присутствовали родители, родственники, почетные граждане города. Они заменяли обычные переводные экзамены.

Процесс образования в гимназии был неразрывно связан с воспитанием. Школьный устав XIX – начала XX веков давал предписание: «воспитание и преподавание суть две нераздельные задачи». Воспитывало все: и четкий распорядок работы школы и воспитательный потенциал обучения, и ориентация гимназистов на высокие идеалы и жизненные ценности, и личный пример педагогов.

Воспитательная работа предполагала такие формы, как литературные беседы, чтения, читательские беседы, любительские спектакли, музыкально-литературные вечера, участие в создании школьного музея. Поощрялось стихосложение, была издана в городской типографии книга «Избранные стихотворения учеников Витебской мужской гимназии 1885-1899 гг.». В годы I мировой войны гимназисты привлекались к оказанию материальной помощи нуждающимся, создавали трудовые дружины.

В гимназии трудились высокообразованные (почти 80% преподавателей имели университетские дипломы), профессионально компетентные, преданные своему делу педагоги: доктора философии В.Ю. Красовский и М.Ф. Свинецкий, ученые-этнографы П.В. Шейн, Н.Я. Никифоровский, историк-краевед и археограф А.П. Сапунов и многие другие. Педагоги гимназии помимо преподавательской деятельности занимались сбором краеведческого материала, составлением ежегодных исторических записок школы и увлекали этой деятельностью своих учащихся.

Нельзя не отметить, что и педагогический совет гимназии и учителя обладали определенными академическими свободами: самостоятельностью решать финансовые вопросы, утверждать авторские учебные программы, вводить курсы, не предусмотренные Министерством. Бывали случаи, когда педагогический совет отказывался выполнять распоряжения попечителя учебного округа. Учитель имел право выбора учебника (например, в 1 классе по географии пользовались шестью различными учебниками), высказывать свои замечания по поводу учебных книг. Это способствовало развитию творчества учителей и благотворно влияло на содержание учебно-воспитательного процесса.

Педагоги проводили научно-исследовательскую работу, печатали статьи, писали книги, защищали диссертации. Им разрешалось давать частные платные уроки ученикам своего класса в свободное от занятий время, читать публичные лекции, вести платные и бесплатные курсы для детей и взрослых, совмещать преподавание в нескольких учебных заведениях. Руководство учебного округа старалось создать благоприятные условия для работы педагогов гимназии, были расширены их права и привилегии, улучшено материальное вознаграждение (годовой размер жалования преподавателя гимназии составлял от 2,3 до 4 тысяч рублей; для сравнения размер жалования вице-губернатора доходил до 4,5 тысяч рублей). Все это способствовало тому, что выпускники университетов охотно шли на преподавательскую работу.

Особого внимания заслуживают взаимодействие гимназии с городским сообществом. Почетные граждане Витебска являлись соучастниками жизни гимназии, их приглашали на экзамены, торжественные акты, литературно-музыкальные вечера.

Витебская мужская гимназия внесла существенный вклад в решение такой важной для того времени проблемы как подготовка педагогических кадров. Она готовила кадры педагогов для собственных нужд, направляя выпускников на учебу в Московский и Санкт-Петербургский университеты. При гимназии в 1834-1839 гг. работала первая на территории Беларуси учительская семинария по подготовке учителей приходских школ. Была введена практика экзаменов для желающих занять должность домашнего учителя или учителя уездного или начального училищ.

Большой вклад в развитие образования г. Витебска в XIX – начале XX ст. у внесла Мариинская женская гимназия (1866 г.), принадлежавшая ведомству императрицы Марии. Это было платное среднее учебное заведение, в которое принимались девушки всех сословий и вероисповеданий по результатам вступительных экзаменов.

Учебный план женской гимназии был насыщенным и включал достаточно широкий круг общеобразовательных предметов: Закон

Божий, русский язык, немецкий, французский, география, история, естествознание, чистописание, рисование, пение, рукоделие, танцы, педагогика, а также различные факультативы и курсы по выбору.

Отличительной особенностью учебного процесса в Мариинской гимназии был большой объем приобретаемых учащимися практических сведений и житейских рекомендаций. Преподавание педагогики в гимназии в старших классах и в восьмом дополнительном педагогическом классе обеспечивало право выпускницам гимназии работать в качестве домашних учителей.

Учебно-воспитательный процесс в Мариинской гимназии был направлен на реализацию главной цели – формирование у девушек качеств, необходимых хранительнице семейного благополучия и наставнице детей. Девушек, обучающихся или окончивших гимназию, можно было сразу распознать по осанке, безупречной походке, женственности.

Высокий уровень обучения и воспитания, профессионализм преподавательского корпуса, гуманное отношение к учащимся, наличие академических свобод и тесная связь гимназий с жизнью городского сообщества делали эти гимназии элитными и престижными учебно-воспитательными учреждениями XIX – начала XX ст. Историко-педагогическое осмысление их деятельности важно в целях творческого использования прогрессивных идей и опыта в современных условиях развития гимназического образования.

**Сімакова І.М.**

## ВУЧЭБНЫЯ КАЛЕКЦЫІ ВІЦЕБСКАЙ ГІМНАЗІІ

Распаўсюджанай з’явай у развіцці музейнай справы на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII ст. становіцца ўзнікненне музейных калекцый пры навучальных установах. Звычайна яны ўяўлялі сабой вучэбныя кабінеты з нагляднымі сродкамі навучання. Некаторыя з іх, дзякуючы намаганням адданых сваёй справе выкладчыкаў, пераўтварыліся ў паўнавартасныя калекцыі з яскрава акрэсленымі сацыяльнымі музейнымі функцыямі. Так з’явіліся каштоўныя зборы пры Гродзенскай медыцынскай акадэміі, Полацкім калегіуме, Літоўскай галоўнай школе. Іх вывучэнню надаецца значная ўвага ў работах А.А. Гужалоўскага [1].

Гэты значны ў развіцці музейнай справы працэс ахапіў таксама і сярэднія навучальныя ўстановы, аднак спецыяльных даследванняў у дадзенай галіне не праводзілася. Мэтай работы з’яўляецца аналіз станаўлення вучэбных калекцый Віцебскай гімназіі як збору музейнага характару. Пра існаванне тут вучэбных кабінетаў згадвае А.П. Сапуноў.

Звесткі аб стане калекцый мы знаходзім у апублікаваных ім актах рэвізій гімназіі. У справаздачах установы ўтрымліваюцца вопісы маёмасці са сціплым пералікам прадметаў, якія ўваходзілі ў склад збору.

Пасля ўваходжання Віцебска ў склад Расійскай імперыі ў 1772 г. тут працягвалі дзейнічаць езуіцкі калегіум, прыкляштарныя і касцёльныя школы, аднак большасць з іх не ўжывала ў адукацыйным працэсе наглядных дапаможнікаў, таму не засталося звестак пра існаванне пры іх вучэбных музейных калекцый. Па ініцыятыве Кацярыны II на Віцебшчыне і Магілёўшчыне пачалі з'яўляцца народныя вучылішчы, якія павінны былі не толькі арганізоўваць працэс навучання, але і апісваць стан развіцця навук у губерні, ствараць бібліятэкі, вучэбныя кабінеты са зборамі прыродазнаўчых прадметаў, апаратаў для фізічных вопытаў і іншых дапаможнікаў, неабходных для забеспячэння нагляднасці пры вывучэнні тых ці іншых дысцыплін [4, с. 2].

29 студзеня 1786 г. было адкрыта Віцебскае галоўнае народнае вучылішча. З гэтага часу пачынаецца працэс уладкавання яго бібліятэкі і вучэбных кабінетаў. Але магчымасці дырэктара і выкладчыкаў былі абмежаваны недахопам сродкаў і памерамі памяшкання. Вучылішча размяшчалася ў невялікай кватэры, дзе не хапала месца для размяшчэння нават самага неабходнага абсталявання. Таму ў 1803 г. кіраўніцтва вучылішча звярнулася да мясцовай адміністрацыі з просьбай аб паляпшэнні стану ўстановы. У наступным годзе быў распрацаваны яе новы статут, і толькі ў 1808 г. Віцебскае народнае вучылішча было рэарганізавана ў гімназію.

Вядома, што да гэтага часу бібліятэка гімназіі ўжо налічвала 342 выданні, аднак сярод іх можна было убачыць у асноўным мастацкую літаратуру, некалькі навуковых сачыненняў па гісторыі, матэматыцы і фізіцы. Больш шырока былі прадстаўлены перыядычныя выданні. Першым загадчыкам бібліятэкі стаў выкладчык польска-лацінскай літаратуры П.М. Кошка. Сярод наглядных дапаможнікаў у 1808 г. узгадваюцца толькі два глобусы і два макеты нябеснай сферы, некалькі геаметрычных і фізічных прыбораў, дванаццаць геаграфічных карт, сорак шэсць архітэктурных чарцяжоў, малюнкі, мікраскоп, аптычныя прыборы і некаторыя іншыя [4, ст. 18]. Аднак ужо ў 1809 г. рэвізорам Крусінскім вучэбныя кабінеты гімназіі былі названы музеем.

Пры рэвізіях неаднаразова падкрэсліваўся востры недахоп апаратаў для прыродазнаўчых вопытаў і метэаралагічных назіранняў. Дзякуючы намаганням дырэктара гімназіі К.А. Канароўскага-Саховіча вучэбныя калекцыі і бібліятэка паступова папаўняліся, і з цягам часу гэтае становішча было выпраўлена: у 1811 г. фізічны кабінет узбагаціўся пнеўматычным абсталяваннем, газавымі і метэаралагічнымі апаратамі. Праз год для яго былі набыты электрычная машына і некалькі апаратаў для фізічных эксперыментаў. Планы па папаўненні кабінета распрацоўваў

яго тагачасны загадчык выкладчык фізікі Ф.К. Тамашэўскі. Ён жа сачыў за захаваннем і выкарыстаннем дапаможнікаў.

У 1813 г. пачынае фарміравацца калекцыя мінералагічнага кабінета гімназіі. У яе аснову быў пакладзены збор ад'юнкта Віленскага універсітэта Рамана Сымановіча, перададзены навучальнай установе пасля яго смерці братам нябожчыка Якавам Сымановічам. Калекцыя складалася з 1466 мінералаў, сабраных на тэрыторыі Віцебшчыны. Пазней яна папаўнялася эпізадычна за кошт прыватных ахвяраванняў [4, с. LXX]. Усе прадметы мінералагічнага кабінета былі размешчаны ў чатырох спецыяльных замкнёных шафах з драўлянымі крышкамі і ўтрымліваліся ў належным стане з 1823 г. выкладчыкам хіміі Ф.Д. Бароўскім.

З 1879 г. кабінеты размяшчаліся ў новым будынку гімназіі на трэцім паверсе ў светлым і прасторным пакоі. Вялікая ўвага надавалася і ўладкаванню бібліятэкі. Яе каштоўнасць была адзначана Віцебскім губернатарам князем Далгарукавым, які наведаў гімназію ў лютым 1885 г. Згодна справаздачы за 1895 г. фундаментальная бібліятэка ўстановы была значна пашырана і ўяўляла сабой грунтоўны збор з 6 895 найменняў навуковай і вучэбнай латаратуры ў 15 637 тамах. Для забеспячэння адукацыйных патрабаванняў навучэнцаў дадаткова былі скамплектаваны яшчэ дзве спецыяльныя бібліятэкі. Адна з іх прызначалася для вучняў гімназічных, другая – падрыхтоўчых класаў. Тут для выхаванцаў гімназіі было прадстаўлена 770 выданняў у 1363 тамах. У параўнанні з 1886 г. вучэбны фонд быў павялічаны амаль у два разы, што з'яўляецца заслугай выкладчыка французскай мовы А.І. Глебава, які загадваў бібліятэкай у канцы XIX ст. [2, с. 5].

Калекцыя фізічнага кабінета ў 1895 г. налічвала 279 апаратаў і прыбораў для эксперыментальных заняткаў; прыродазнаўчы кабінет складаўся з калекцый заалагічнай (41 прадмет) і менералагічнай (986 прадметаў). Калекцыі нумізматыкі і фалерыстыкі ўяўлялі сабой самы каштоўны збор гімназіі, дзе было прадстаўлена 317 манет і медалёў. Акрамя таго, не былі ўключаны ні ў адзін з вышэйзгаданых кабінетаў 889 экзэмпляраў вучэбных дапаможнікаў: атласы, глобусы, геаграфічныя і гістарычныя карты, мадэлі для малявання, нотныя сшыткі і музычныя інструменты [3, с. 9].

Аднак паступова фізічны і прыродазнаўчы кабінеты перасталі папаўняцца і прыйшлі ў заняпад, у асноўным па прычыне несумленнага выкарыстання навучэнцамі прадметаў збораў і скасавання выкладання прыродазнаўчых дысцыплін у гімназіі. Па сведчанням Б. Брэжгі ў належным стане захоўваліся толькі калекцыя нумізматыкі і фалерыстыкі, у склад якой ў 1896 г. уваходзіла ўжо 427 польскіх, расійскіх і заходнееўрапейскіх манет і медалёў. Пасля закрыцця гімназіі ў 1918 г. збор быў згублены [5, с. 24].

Існаванне падобных вучэбных кабінетаў было абумоўлена ў першую чаргу неабходнасцю забеспячэння нагляднасці адукацыйнага працэсу, гэта значыць прычынамі утылітарнага характару. Калекцыі, якія збіраліся пры навучальных установах, у тым ліку Віцебскай гімназіі, не з'яўляліся музеямі ў сучасным сэнсе слова. Іх фарміраванне было падначалена бягучым патрэбам выкладчыкаў і навучэнцаў, імкненнем да аптымізацыі ўспрымання інфармацыі. У функцыянаванні вучэбных кабінетаў не прасочваюцца навукова-даследчы і навукова-фондавы накірункі музейнай дзейнасці. Для недасканала сістэматызаванага размяшчэння прадметаў па шафах і вітрынах не былі яшчэ ўласцівы навукова абгрунтаваныя метады і прынцыпы пабудовы экспазіцый. Аднак, нягледзячы на гэта, можна дакладна сцвярджаць, што вучэбныя калекцыі выконвалі адукацыйна-асветную музейную функцыю, спрыялі засваенню ведаў, пашырэнню навуковага кругагляду вучняў, абуджэнню цікавасці да вучэбных дысцыплін. Таму, безумоўна, зборы дадзенага тыпу нельга выключаць з прадметнага поля гісторыі музейнай справы.


1. Гужалоўскі, А.А. Нараджэнне беларускага музея / А.А. Гужалоўскі. – Мінск: НАРБ, 2001. – 124 с.
2. Отчет о состоянии Витебской гимназии за 1886-1887 учебный год / Сост. секретарь педсовета А. Булаков. – Витебск: Типография Г.А. Малкина, 1888. – 49 с.
3. Отчет о состоянии Витебской гимназии за 1894-1895 учебный год / Сост. секретарь педсовета В.К. Соколов. – Витебск: Губернская типография, 1896. – 109 с.
4. Историческая записка 75-летия Витебской гимназии, 1808-1883 / сост. А. Сапунов. – Витебск: Типография губ. правл., 1884.
5. Brеżgo, B. Muzea witebskie / B. Brеżgo // Magazyn Polski. – 2007. – № 1. – С. 24 – 30.



**Шухлеў К.В.**


## ПОЛАЦКІЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ Ў ПАЧАТКУ XIX ст. ПЕРАДУМОВЫ АДКРЫЦЦЯ Ў ПОЛАЦКУ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ

Паводле Статута 1804 г., які складзены ў адпаведнасці з французскай асветніцкай філасофіяй XVIII ст., школьная сістэма будавалася на прынцыпе адзінства і пераемнасці: кожная школьная ступень была звязана з папярэдняй і наступнай, пераход у школу ажыццяўляўся без экзамена, на падставе дакумента аб заканчэнні папярэдняй школы. Навучанне аб'яўлялася бясплатным. Сістэма адукацыі ўключала ў сябе прыходскія вучылішчы з гадавым тэрмінам навучання, двухгадовыя пачатковыя вучылішчы, чатырохгадовыя гімназіі і ўніверсітэты [4, с. 290].

Такім чынам, у ходзе рэформы на Беларусі павялічылася сетка светскіх агульнаадукацыйных школ і колькасць навучэнцаў у іх, скарацілася колькасць манастырскіх вучылішчаў. Трывалае месца ў навучальных планах занялі прыродазнаўчыя дысцыпліны. Былі адкрыты прагрэсіўныя для свайго часу ланкастэрскія школы, у канцы 1830-х у краі дзейнічала 13 такіх школ, для небагатых вучняў [3, с. 201]. Акрамя таго, паступова заваёўвала прызначэнне жаночая адукацыя. Гімназіі Віленскай навучальнай акругі мелі 6 класаў, павятовыя вучылішчы – 3 класы. Выкладанне вялося на польскай мове, а руская мова падавалася як адна з вучэбных дысцыпін.

Рэформа сістэмы адукацыі не ўхіліла ў школах заходніх губерняў каталіцкага ўплыву. Значная частка навучальных устаноў Беларусі падпарадкоўвалася ордэну езуітаў. Гэта была ўступка ўрада ўплывовым колам спаланізаванага дваранства. У езуіцкіх вучылішчах налічвалася каля тысячы чалавек. Існавалі таксама гімназіі духоўныў ордэнаў, ці “гімназіяльныя вучылішчы”. Гэтыя навучальныя ўстановы карысталіся папулярнасцю і садзейнічалі распаўсюджванню каталіцызму [4, с. 290].

Віленская навучальная акруга, створаная ў 1803 г., пачала сваю дзейнасць з рэвізіі стану асветы на землях, якія ўвайшлі ў яе падпарадкаванне. Полацкія запісы Сявергіна асабліва дакладныя і падрабязныя – Полацк быў першым беларускім горадам на яго шляху. Рэвізор убачыў тут тыповую для ўсходніх беларускіх зямель таго часу карціну, адзначыў існаванне ў горадзе ў 1803 г. двух вучылішч: традыцыйнага духоўнага - езуіцкага і новага свецкага - рускага народнага. Ён даў вельмі падрабязнае іх апісанне. Цікавыя, напрыклад, яго звесткі пра побыт выхаванцаў езуіцкага вучылішча, іх “рэжым дня”, лячэнне, харчаванне.

Полацкае езуіцкае вучылішча мела багатыя традыцыі, а па колькасці вучняў (321) было самай буйной навучальнай установай на ўсходзе Беларусі. У сямі яго класах і шасці факультатывах чатырнаццаць настаўнікаў (прафесараў) выкладалі латынь, польскую мову, геаграфію, свяшчэнную і ўсеагульную гісторыю, арыфметыку, геаметрыю і пачаткі алгебры (малодшыя класы), паэзію, рыторыку, метафізіку, фізіку, хімію, астраномію і багаслоўе (старэйшыя класы), рускую, нямецкую, французскую мовы, архітэктуру. Быў і пачынальны клас, дзе 51 вучань ва ўзросце ад 8 да 20 гадоў вывучалі ”складамі польскую і лацінскую грамату”. Вяршынь навук дасягаў не кожны: 1 клас наведвала 116 вучняў, апошні, 7 кл. – толькі 3. Падручнікі выдаваліся ў полацкай езуіцкай друкарні. Вучні мелі доступ да багатай кляштарнай бібліятэкі, хімічнай лабараторыі, ”натуральнага кабінета”.

Полацкае рускае народнае вучылішча было заснавана ў 1789 г. як галоўнае. Але ў 1803 г. з прычыны страты горадам губернскага статусу было ўжо малым, гэта значыць мела толькі 2 класы і 2

настаўнікаў. Яно магло даць больш сціплую адукацыю, але адчыняла дзверы і для дзяцей самых бедных мяшчан, і для дзяўчынак: рускія народныя школы, ствараемыя па ўзору аўстрыйскіх, актыўна выкарыстоўвалі новыя педагагічныя прынцыпы і падыходы. У 1803 г. у полацкім малым народным вучылішчы было 50 вучняў, якія вывучалі рускую граматыку, геаграфію і гісторыю Расіі, ўсеагульную гісторыю, арыфметыку і геаметрыю, асновы хрысціянскага веравучэння. Сявергін прапанаваў увесці ў курс гэтага вучылішча, суцэльнага рускага па мове і духу, вывучэнне польскай і нямецкай моў, неабходных для мясцовых жыхароў. Прыкмеціў ён і тое, што гарадская дума вылучала на ўтрыманне вучылішча недастатковыя сродкі, і ад гэтага пакутавалі і настаўнікі, і вучні: заняткі праходзілі ў цесных і халодных пакоях Богаяўленскага манастыра, не хапала падручнікаў. Матэрыялы рэвізіі Сявергіна, здзейсненнай добрасумленна і старанна, зафіксавалі становішча ў галіне народнай адукацыі ўсходнебеларускага рэгіёна, ў тым ліку і Полацка, напярэдадні маштабнай рэформы асветы, якая распачалася ў Расійскай імперыі ў пачатку XIX ст.

Праблема вышэйшай адукацыі Беларусі ў XIX ст. з-за палітыкі расійскага ўрада набыла не толькі асветніцкую, але і палітычную, і нацыянальную афарбоўку. Нявырашанасць гэтай праблемы шмат у чым паўплывала на развіццё падзей у краі. Беларуская моладзі было абумоўлена ў праве атрымоўваць вышэйшую адукацыю на радзіме. А дазвол вучыцца ва ўніверсітэтах і інстытутах іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі абмяжоўваў як колькасць студэнтаў з Беларусі, так і магчымасць больш-менш здольным выхаванцам вярнуцца на працу ў Заходні край. Менавіта таму цяпер многія ўраджэнцы Беларусі з'яўляюцца вядомымі расійскімі ці польскімі мастакамі, кампазітарамі, вучонымі. Зразумела, добра, што гэтыя людзі змаглі рэалізаваць свае здольнасці, але менавіта па той жа прычыне працэс фарміравання нацыянальнай беларускай інтэлігенцыі і нацыянальнай свядомасці ішоў даволі марудна.

Пра гэта сведчыць першая спроба рэфармаваць сістэму вышэйшай адукацыі ў заходніх губернях, адразу ж пасля Айчыннай вайны 1812 г. Частка выкладчыкаў і студэнтаў Віленскага ўніверсітэта, а таксама толькі што заснаванай Полацкай езуіцкай акадэміі, падтрымалі Напалеона і яго планы наконт аднаўлення Княства Літоўскага. З-за гэтага, пасля вызвалення краю ад французаў у расійскім урадзе з'явіліся прыхільнікі жорсткіх рэпрэсіўных мераў. Так, міністр народнай асветы прапанаваў перанесці ўніверсітэт у Полацк, зачыніўшы такім чынам там езуіцкую акадэмію, а ў Вільні пакінуць толькі медычны факультэт, які стаў бы фактычна асобнай ВНУ. У былых жа будынках універсітэта ў Вільні павінна было пасяліцца вайсковае вучылішча. Намер, аднак, не ажыццявіўся з-за рашучых супрацьдзеянняў папячы-

целя Віленскай навучальнай акругі Адама Чартарыйскага, які тады яшчэ не страціў свайго ўплыву на Аляксандра I і змог пераканаць яго ў памылковасці праекта міністра народнай асветы [5, с. 34].

Такім чынам, у краі захавалася старая сістэма адукацыі, пры якой асноўным цэнтрам культуры з'яўляліся Вільня і Полацк. Адносіны між імі былі даволі напружаныя, бо Полацкая акадэмія не падпарадкоўвалася Віленскаму ўніверсітэту і, па сутнасці, ўтварала асобную навучальную акругу, што змяншала сферу ўплыву ўніверсітэта. А таму адразу ж пасля ліквідацыі акдэміі ў 1820 г. была прадпрынята спроба арганізаваць у Полацку юрыдычны ліцэй са статутам Дзямідаўскага і з курсам навучання ў 3 гады. Такая ВНУ была б прыдаткам да Віленскага універсітэта – яго юрыдычным факультэтам. Але прапанова, прадстаўленная ў сакавіку 1820 г., не знайшла належнай падтрымкі нават на мясцовым узроўні [10, с.150]. Частка шляхты на чале з мітрапалітам Станіславам Богушам Сестранцэвічам дабілася дазволу Аляксандра I на перадачу былых езуіцкіх вучылішчаў іншым манаскім ордэнам, пасля чаго памяшканні былой акадэміі ў Полацку былі перададзены піярам з мэтай адкрыцця імі там Вышэйшага вучылішча. Так была заснавана самая малавядомая цяпер беларуская навучальная ўстанова. Доўгі час пра яе нічога не пісалася, да і сёння даследчыкі не вельмі часта звяртаюць на яе ўвагу. Напрыклад, У.Арлоў падае звесткі аб полацкай "піярскай вучэльні" як аб калегіўме, гэта значыць – як аб сярэдняй навучальнай установе [1, с. 369 – 370]. Аднак у дакументах 20г. XIXст. назва калегіўм не сустракаецца.

Доказам таго, што ў Полацку існавала менавіта Вышэйшае піярскае вучылішча, можа служыць справаздача візітара, прафесара Пецярбургскага вучылішча В.Сянкоўскага, які ў 1826 г. дзеля рэвізіі наведаў полацкае вучылішча. Ён адзначыў, што гэтая навучальная ўстанова мела аддзяленні: падрыхтоўчы клас з назвай прыхадскога вучылішча, 4 ніжэйшыя класы, дзе даваўся курс гімназіі другога разрада, і 3 класы, якія В.Сянкоўскі называе "курсами высших наук". Тут, па словах візітара, "курс гимназических наук не только заканчивался, но и далеко заходил за их пределы". Зыходзячы з гэтага, В. Сянкоўскі робіць вывад, што "Полоцкое Высшее училище, относительно числа и объема наук [...] много походило на наши лицеи ". І далей візітар піша ў сваёй справаздачы аб гэтай навучальнай установе ўжо толькі як аб вышэйшай [9, с. 74].

Навучанне ў піярскім вучылішчы вялося на польскай мове і фінансавалася дзяржавай. Кожны год піяры атрымоўвалі 28 тысяч рублёў. Платным было і знаходжанне ў канвікце, выхаванцы ўносілі за сваё ўтрыманне па 500 - 600 рублёў. Вучылішча падтрымлівала сувязі з Віленскім універсітэтам. Так, у 1822 г. лекцыі па сусветнай гісторыі тут чытаў вядомы гісторык І. Лялевель.

Але аб дзейнасці вучылішча нельга гаварыць толькі ўстаноўча. Піяры, гаспадары навучальнай установы, былі, па словах В. Сянкоўскага, ”некогда самыми просвещенными между польскими орденами, но […] пришли [...] в совершенный упадок” [9, с. 74 – 75]. Узровень падрыхтоўкі навучэнцаў быў вельмі нізкім. Ды і выкладчыцкі корпус пасля рэпрэсій 1823-1825гг. не далічыўся найбольш адукаваных прадстаўнікоў. Аднак прычынай ліквідацыі піярскага вучылішча стала не яго адсталасць, а “прапольская” накіраванасць. Яно, разам з Віленскім універсітэтам і Крамянецкім ліцэем, было, на думку расійскіх улад, ”культурным центром польскай цывілізацыі” ў краі. Менавіта таму, ў 1830 г. было вырашана заснаваць на месцы вучылішча Кадэцкі корпус, які быў арганізаваны ”для проведения на Западном крае идеи русского просвещения, русского патриотизма и русского дела”.

Тут трэба падкрэсліць, што стварэнне Кадэцкага корпуса было не адзіным варыянтам рэарганізацыі піярскага вучылішча. Яшчэ ў 1828 г. будучы мітрапаліт Іосіф Сямашка ўзняў пытане аб адкрыцці ў Полацку Духоўнай Грэцка-ўніяцкай акадэміі. Гэтая ідэя знайшла падтрымку ва ўрадзе, які такім шляхам імкнуўся пазбавіць уніяцкую моладзь уплыву каталіцкіх выкладчыкаў Галоўнай семінарыі ў Вільні – адзіным месцы, дзе ўніяты маглі атрымоўваць вышэйшую духоўную адукацыю, але толькі разам з католікамі. Такім чынам, прапанаваўшы арганізаваць асобную ўніяцкую акадэмію з лаяльнымі расійскімі выкладчыкамі, І. Сямашка прадугледзеў магчымасць зрабіць гэтую ВНУ ў будучым фарпостам барацьбы з каталіцызмам на ўсім захадзе імперыі. 22 красавіка 1828 г. у Сенат быў перададзены ўказ Мікалая І дзе, між іншым, патрабавалася знайсці сродкі на “...основание Полоцкой Духовной Академии” [8, с. 142].

І хаця нідзе не гаварылася, што ствараецца яна будзе коштам піярскага вучылішча, дзяржаўная дапамога акадэміі ў памеры 28 тысяч рублёў у год сведчыла пра спыненне фінансавання Вышэйшага вучылішча. Акадэмія атрымала б і былую езуіцкую бібліятэку, друкарню і музей, што, дарэчы можа выратавала б іх ад раскрадання ў 1830 г. Праблема з выхаванцамі акдэміі таксама вырашылася хутка. Ужо 26 мая 1828 г. было забаронена пасылаць юнакоў з уніяцкіх епархій у Віленскую Галоўную семінарыю, дзе нават скасавалі пасаду ўніяцкага духоўніка. Адкрыццё акадэміі, аднак, было адкладзена спачатку на год, каб падрыхтаваць для яе памяшканні і знайсці выкладчыка, потым, па той жа прычыне - на два. А калі пачалося паўстанне 1830-1831 гг., наогул было не да акадэміі. Тым болей, што ўрад ужо адобрыў арганізацыю ў Полацку Кадэцкага корпуса. Як піша гісторык Г.Кіпрыяновіч, ”проект открытия Полоцкой академии […] не был осуществлен по своей непрактичности” [6, с. 66]. А сабраныя сродкі накіравалі на набыццё царкоўных кніг. Аднак, нягледзячы на тое, што

акадэмія ў Полацку не была заснавана, пастановы ўрада наконт уніяцкай моладзі засталіся ў сіле. З гэтага часу яна магла атрымоўваць вышэйшую адукацыю толькі ва універсітэтах Масквы і Пецярбурга, а таксама ў Пецярбургскай праваслаўнай акадэміі. Так што галоўная мэта ўсёй задумы - "выратаваць" уніятаў ад небяспечнага ўплыву каталіцкіх выкладчыкаў Галоўнай семінарыі ажыццявілася.

Так ці інакш, у другой палове 30 – 40 гг. XIX ст. ў краі не рабіліся ніякія захады, каб стварыць тут універсітэт, духоўную акадэмію ці ліцэй. Стваралася ўраджанне, што патрэбы мясцовай моладзі ў вышэйшай адукацыі сапраўды забяспечваюцца Горы - Горацкім інстытутам і расійскімі ўніверсітэтамі.

Але памылковасць такога меркавання добра відаць на прыкладзе падзей 50 - х гадоў. Пасля паражэння ў Крымскай вайне і прыходу да ўлады Аляксандра II у Беларусі ўзмацніліся патрабаванні адчыніць мясцовы ўніверсітэт. Вельмі актыўна выступала за гэта шляхта Віцебскай губерні. 17 лютага 1856г. яна звярнулася да віцебскага грамадзянскага губернатара з прапановай "об открытии университета в Полоцке [...] или другом удобном месте Витебской губернии". Адказ міністра ўнутраных спраў Ланскога быў атрыманы ўжо 25 сакавіка 1856 г. У ім выказвалася здзіўленне просьбай мясцовай шляхты : "Витебское дворянство не имело даже основания [...] к образованию молодых людей [...] имеет все средства, т.к. там существует 2 гимназии и Кадетский корпус [...] в следствии чего Государь повелел оставить прошение без последствий" [7, спр. 17].

Аднак няўдача не расчаравала прыхільнікаў стварэння Полацкага ўніверсітэта. Праз 2 гады, ў верасні 1858 г., была прадпрынята чарговая спроба, на гэты раз у Мінску, дзе сабралася шляхта Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў для сустрэчы Аляксандра II. Прадстаўнікі Віцебска выступілі са спецыяльным хадатайствам, дзе гаварылася і аб арганізацыі польскага ўніверсітэта ў Полацку. Рэакцыя цара была адмоўнай: ён заявіў, што ў гэтым добра відаць імкненне "к сохранению мнимой польской народности", імкненне, якое "не имеет за собой никакого, даже исторического основания. Известно, что край этот никогда не был самостоятельным и никогда не считался за вновь приобретенный, он был только отобран от Польши, как исконная собственность России" [2, с. 170]. Такая заява Аляксандра II засведчыла ўсю бессэнсоўнасць спроб мясцовага насельніцтва дабіцца арганізацыі ВНУ.

Але патрэба ў іх была відавочнай, асабліва калі пасля падаўлення паўстання 1863 г. зачынілі Горы-Горацкі інстытут. Зразумеў гэта ў час сваёй інспекцыйнай паездкі па Беларусі ў верасні 1872 г. і міністр народнай асветы граф Д. Талстой. У Полацку ён прысутнічаў пры адкрыцці настаўніцкай семінарыі і ўбачыў магчы-

масць заснаваць тут універсітэт, што стала асноўнай тэмай яго справаздачы Аляксандру II. У ёй Д. Талстой параўноўваў Полацк з захопленым немцамі Страсбургам, дзе апошнія адразу адчынілі нямецкі ўніверсітэт. Акрамя гэтага міністр пісаў аб тым, што “отсутствие ВУЗа неблагоприятно сказывается как на Северо-Западном крае, так в особенности на местном училищном ведомстве”. Ён адзначыў, што беларуская моладзь накіроўваецца ва ўніверсітэты Расіі, дзе і так мала месца. Як раз таму Д. Талстой і прапанаваў заснаваць універсітэт у Полацку ў будынку былой езуіцкай акадэміі. А каб гэтая ідэя не была вельмі страшнай для казны, міністр палічыў магчымым спачатку адчыніць толькі 2 гуманітарныя факультэты з першым курсам.

Праект аддалі ў Камісію па разгляду справаздачы Міністэрства народнай асветы, якая нечакана выступіла з рэзкай крытыкай прапановы Д. Талстога. Яна звярнула ўвагу на тыя абставіны, што ў існуючых універсітэтах не хапае 135 выкладчыкаў, а ў Наварасійскім універсітэце патрэбны медыцынскі факультэт, таму “едва ли своевременно учреждать новый университет” [11, с. 9 – 18]. Такім чынам, спроба заснаваць полацкую ВНУ засталася толька на паперы.

Правал праекта Д. Талстога засведчыў усю бесперспектыўнасць барацьбы за арганізацыю ВНУ ў Беларусі. З таго часу расійскі ўрад наогул рабіў выгляд, што пытанне аб заснаванні вышэйшай школы яго не датычыцца. І вось вынік гэтага: на пачатку ХХ ст. ва ўсіх універсітэтах Расіі існавалі групы ўраджэнцаў Беларусі. Згадаю Эпімаха-Шыпілу ў Пецярбургу, Любаўскага, Нікольскага, Турцэвіча ў Маскве, Доўнар-Запольскага ў Кіеве, Карскага і Леантовіча ў Варшаве, Лапо і Ігнатоўскага ў Дэрпце. Яны і ім падобныя працягвалі дзейнасць Віленскага ўніверсітэта ў справе навуковага даследвання Беларусі, яе славутага мінулага.

1. Арлоў, У. Таямніцы полацкай гісторыі / У. Арлоў. – Мн.: Беларусь, 1994. – 478 с.

2. Блинова, Т.Б. Иезуиты в Белоруссии / Т.Б. Блинова. – Мн.: Беларусь, 1990. – 186 с.

3. Великович, Л.М. Чёрная гвардия Ватикана / Л.М. Великович. – М.: Школа-Пресс, 1985. – 215 с.

4. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч 1. Ад старажытных часоў – па люты 1917 г.: вучэб. дапам. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – 416 с.

5. Из истории Виленского университета // Журнал министерства Народного Просвещения. – 1917. – № 5. – С. 34.

6. Киприянович, Г.А. Жизнь Иосифа Семашки митрополита литовского и виленского / Г.А. Киприянович. – Вильна, 1897. – 187 с.

7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 221, воп. 2, спр. 17.

8. Никотин, И.А. Столетний период русского законодательства в воссоеденённых от Польшы губерниях / И.А. Никотин. – Вильна, 1886. Т.1. – 240 с.
9. Новосёлов, А. Ревизия профессором Сенковским Белорусских училищ 1826 г. // Журнал министерства Народного Просвещения. – 1872. – № 5. – С. 22 – 75.
10. Рождественский, С.В. Исторический обзор деятельности Министерства Народного Просвещения / С.В. Рождественский. – СПб., 1902. – 190 с.
11. Силиванчик, П.П. Деятельность Коммунистической партии Белоруссии по осуществлению культурной революции в республике (1919 – 1937 гг.) / П.П. Силиванчик. – Мн.: Издательство БГУ, 1961. – 233 с.

**Игнатовец Л.М.**

## ОБРАЗОВАНИЕ БЕЛОРУССКОГО УЧЕБНОГО ОКРУГА: ПРЕДПОСЫЛКИ И ПРОЕКТЫ

В середине 20-тых годов XIX ст. произошла трансформация системы управления учебными заведениями Витебской и Могилевской губерний Российской империи.

В 1804 г. учебные заведения этих губерний были включены в состав Виленского учебного округа, находившегося последующие двадцать лет под попечительством князя А. Чарторыйского. Учебный процесс в них был практически полностью полонизирован, так как все усилия А. Чарторыйского были направлены к осуществлению польской патриотической мечты. Плоды этой деятельности, которая приводилась в жизнь с активной поддержкой римско-католического духовенства, правительство не могло не заметить еще в 1812 г. Деятельность же тайных обществ в начале 20-тых годов еще более усилила в правительстве мнение о ненормальном состоянии учебного дела в округе и вынудило его (правительство) принимать деятельные меры «к устранению зла, пустившего слишком глубокие корни» [Цит. по: 2, № 4, с. 161].

Инициатором преобразований выступил белорусский генерал-губернатор Н.Н. Хованский, который в 1824 г. представил императору Александру записку о состоянии учебного дела в белорусских губерниях [1, с. 194 – 197]. По мнению Н.Н. Хованского, в гимназиях не было «надлежащего устройства, от коего обучающиеся в оных могли бы со временем быть полезны государству». В школах, учрежденных при кляшторах разных монашеских католических орденов, юношество обучается «по методам старинных авторов, науки преподаются на польском и латинском языках; словесность заключается в обучении польскому, латинскому, некоторым иностранным языкам, а русский остается в совершенном небрежении». Система преподавания в этих училищах «состоит в том, чтобы в учащихся поселить дух полонизма, в чем они и достигли своей цели… От этой системы воспитания про-

истекает еще и то главнейшее зло, что природные белорусы не только пожилых лет, но и молодые, не смотря на давность присоединения края, питают какое-то равнодушие и неприязнь к коренным русским и ко всему русскому» [1, с. 194 – 196].

Важным накірункам дзейнасці савецкіх органаў улады на Віцебшчыне была работа па павышэнню адукацыйнага ўзроўня ўсіх этнічных супольнасцей у галіне адукацыі. Вызначаная работа праводзілася на родных мовах мясцовага насельніцтва. У процівагу русіфікатарскай палітыцы, якая здзяйснялася ў дакастрычніцкі перыяд, савецкае кіраўніцтва пачало фарміраваць культуру нацыянальную па форме. Толькі так, на яго думку, можна было дасягнуць фактычнага раўнапраўя ўсіх народаў былой імперыі, знішчыць культурную адсталасць нацыянальных ускраін. Адначасова бальшавікамі стваралася культура сацыялістычная (пралетарская) па зместу. У гэтым праяўлялася дыялектыка нацыянальнай палітыкі савецкай улады ў духоўным жыцці грамадства. Урэшце ствараліся перадумовы для кансалідацыі насельніцтва былой імперыі на дабраахвотнай аснове ў рамках адзінай супольнасці.

Нацыянальная палітыка савецкай улады была накіравана на вырашэнне практычных задач дзяржавы. Справа ў тым, што без адукаваных і выхаваных у духе камуністычнай ідэалогіі спецыялістаў з ліку прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей нельга было разлічваць на стварэнне новай, класава арыентаванай эліты – партыйных і савецкіх работнікаў, інтэлігенцыі.

Першаступеннай для бальшавікоў у сферы рэфармаванне сістэмы народнай асветы была работа па стварэнню сеткі нацыянальных дашкольных устаноў, працоўных і прафесійна-тэхнічных школ, сярэднеспецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў, перад якімі, акрамя адукацыйнай, ставілася і важная палітычная задача – выхаваць падрастаючае пакаленне ў духе савецкай ідэалогіі.

У першыя гады савецкай улады рэформа адукацыі ахапіла толькі Віцебскую, Магілёўскую і ўсходнія паветы Мінскай губерній, якія не былі акупаваны нямецкімі войскамі. Рэарганізацыя адбывалася

ў адпаведнасці з пастановамі і дэкрэтамі савецкіх органаў улады аб асвеце і савецкай школе. Так, ужо 23 студзеня 1918 г. урад РСФСР прыняў дэкрэт “Аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы”. У выніку забаранялася выкладанне рэлігійных дысцыплін “во всех государственных и общественных, а так же частных учебных заведениях, где изучаются общеобразовательные предметы” [1, с. 13]. 18 лютага 1918 г. Народны камісарыят асветы прыняў пастанову “Аб савецкай школе” [2, с. 320], а 31 кастрычніка 1918 г. пастанову “Аб школах нацыянальных меншасцяў” [2, с. 835]. Народам Савецкай Расіі гарантавалася права навучання на роднай мове.

Такім чынам, у лістападзе 1917 – 1918 г.г. савецкія органы ўлады дэкларавалі правы народаў Расіі ў галіне асветы, аднак у складаных умовах грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі не здолелі пачаць рэалізацыю праграмы на практыцы.

З пачатку 1919 г. пачаўся новы этап рэалізацыі нацыянальнай палітыкі савецкай улады ў галіне адукацыі. Трэба адзначыць, што ў гэты час беларускія землі ўваходзілі ў склад розных дзяржаўных утварэнняў: БССР (з 27 лютага 1919 г. – ЛітБелССР) і РСФСР (Віцебская, Гомельская і Смаленская губерні). У сувязі з польскай інтэрвенцыяй палітыка савецкай улады ў сферы практычнай рэалізацыі прынцыпаў нацыянальнай палітыкі на тэрыторыі БССР (ЛітБелССР) да ліпеня 1920 г. зноў жа не была эфектыўнай і насіла толькі дэкларатыўны характар. У адпаведнасці з Канстытуцыяй БССР (3.02.1919 г.) абвяшчалася раўнапраўнасць працоўных усіх нацыянальнасцей, а пастановай урада Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі “Аб нацыянальных правах насельніцтва” (21.03.1919 г.) на тэрыторыі краіны агульнадзяржаўнымі прызнаваліся пяць моў: літоўская, беларуская, руская, польская і яўрэйская. На кожнай з іх дазвалялася выкладаць у школе. Фактычна толькі пасля канчатковага вызвалення тэрыторыі Беларусі ад польскіх войск, абвяшчэннем у другі раз БССР дэкрэты савецкай улады пачалі праводзіцца ў жыццё больш эфектыўна.

17 снежня 1920 г. ІІ Усебеларускі з’езд Саветаў па дакладу аб народнай асвеце прыняў рэзалюцыю, дзе адзначалася, што палітыка савецкага ўрада заключаецца ў тым, каб зрабіць усе народы рэспублікі сапраўды раўнапраўнымі. Прапаноўвалася ствараць школы на роднай мове для ўсіх этнічных супольнасцей Беларусі.

У першую чаргу актывізоўвалася “беларуская” работа. Беларускім аддзелам Наркамасветы БССР з 1921 г. на базе БДУ былі арганізаваны дзесяцімесячныя курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў для беларускіх школ, пачалося выданне падручнікаў. У выніку такой мэтанакіраванай працы ў 1921 – 1922 навучальным годзе беларускамоўнымі сталі каля 20 % пачатковых і 5 % школ-сямігодак. У 1922—1923 годзе іх удзельная вага вырасла адпаведна да 60 і 10 %.

Усяго ў БССР на гэты час працавала 4157 працоўных школ першай і другой ступеняў [3, с. 24].

У пачатку 1920-х гадоў рабіліся першыя крокі па беларусізацыі тэхнікумаў і ВНУ. Беларуская мова, літаратура, айчынная гісторыя і геаграфія з 1921 г. уводзіліся ў вучэбныя планы гэтых устаноў у якасці абавязковых дысцыплін [3, с. 25]. Да канца 1922 г. былі поўнасцю "беларусізаваны" БДУ, Мінскі, Барысаўскі і Бабруйскі педагагічныя тэхнікумы. Значна цяжэй абстаяла справа з пераводам на беларускую мову сельскагаспадарчых, індустрыяльна-тэхнічных, медыцынскіх, музычных і мастацкіх сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Гэта тлумачылася адсутнасцю дастатковай колькасці беларускамоўных падручнікаў для гэтага тыпу навучальных устаноў, а таксама кадравай праблемай. У пераважнай большасці гэтых устаноў працавалі выкладчыкі яўрэі і рускія па нацыянальнасці, якія зусім не валодалі беларускай мовай.

У 1921 г. змаглі арганізаваць сваю работу яўрэйскі і польскі аддзелы Народнага камісарыята асветы БССР. На Беларусі пачала фарміравацца і пастаянна пашыралася сетка яўрэйскіх і польскіх школ, працавалі нацыянальныя дзіцячыя сады, летнія пляцоўкі, прафесійна-тэхнічныя ўстановы. Для падрыхтоўкі настаўнікаў ў Мінску былі арганізаваны педагагічныя курсы, былі адкрыты Яўрэйскі (1921 г.) і Польскі (1922 г.) педагагічныя тэхнікумы. Пашырэнне сеткі нацыянальных устаноў адукацыі адбывалася нават у складаных сацыяльна-эканамічных умовах 1922 – 1923 гадоў. Спецыяльным цыркулярам Наркамасветы БССР (сакавік 1922 г.) абвяшчалася, што "при сокращении школ школы нацменшинств не сокращаются" [4, с. 18]. Гэта было абумоўлена тым, што нацыянальныя ўстановы адукацыі ахоплівалі да 1922 г. толькі каля 50 % дзяцей школьнага ўзросту.

Акрамя беларускіх, польскіх і яўрэйскіх школ у 1923 – 1924 навучальным годзе на тэрыторыі БССР дзейнічала 13 латышскіх школ. Настаўнікаў для гэтага тыпу ўстаноў рыхтавалі Ленінградскі латышскі педтэхнікум і Камуністычны універсітэт народаў Захаду.

На тэрыторыі "беларускіх" губерній РСФСР станаўленне сістэмы нацыянальных устаноў адукацыі пачалося ўжо з пачатку 1919 г., фактычна на два гады раней, чым на тэрыторыі БССР.

У адпаведнасці з інструкцыямі Наркамнаца і Наркамасветы РСФСР у лютым 1919 г. пры ўсіх аддзелах народнай адукацыі пачалі стварацца спецыяльныя пададдзелы, якія вырашалі пытанне аб адкрыцці нацыянальных школ, клапаціліся аб іх матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні. Так, яшчэ ў кастрычніку 1919 г. пры Віцебскім губана была створана польская секцыя, а ў жніўні 1921 г. – яўрэйская і латышская [5]. У верасні 1921 г. таксама пачалася работа па арганізацыі беларускай секцыі. Некалькі разоў дадзенае пытанне

абмяркоўвалася на паседжаннях калегіі Віцебскага губана, але безвынікова. У пастановах фіксавалася, што "вопрос об организации белсекции несвоевременный, для проведения белорусской работы нет ни средств, ни школьных работников" [6, с. 50]. У выніку на тэрыторыі Віцебшчыны ў 1919 – 1924 г.г. не было ніводнай школы, якая б працавала на роднай мове беларускага насельніцтва. Наўрад ці гэта было абумоўлена толькі дэфіцытам сродкаў у бюджэце губана. Хутчэй за ўсё савецкія органы ўлады ў дадзеным пытанні падпарадкоўваліся рашэнням ІІІ-й Віцебскай губернскай партканферэнцыі, якая праходзіла 20 студзеня 1919 года. У рэзалюцыі гэтай канферэнцыі адзначалася: "Население губернии совершенно обрусело и здесь нет вообще белорусской культуры" [7]. Як бачна, на тэрыторыі Віцебшчыны ў адрозненні ад БССР – увогуле не рэалізоўвалася праграма па забеспячэнню ўстановамі адукацыі на роднай мове прадстаўнікоў карэннай нацыянальнасці.

У той жа час, як і на тэрыторыі БССР, у "беларускіх" губернях РСФСР праводзіўся комплекс мерапрыемстваў у галіне народнай асветы ў адносінах да нацыянальных меншасцей. Па-першае, стваралася і пастаянна расла сетка навучальных устаноў для прадстаўнікоў нетытульных этнічных супольнасцей – латышоў, палякаў, яўрэяў, літоўцаў. Па-другое, наладжвалася работа педагагічных курсаў, адкрываліся сярэднеспецыяльныя прафесійныя ўстановы для падрыхтоўкі савецкіх настаўнікаў у нацыянальныя школы. Так, у Віцебску ў 1921 г. быў адкрыты Яўрэйскі педтэхнікум.

У развіцці нацыянальнай школы і адукацыі на Беларусі ў другой палове 1920-х – сярэдзіне 1930-х гадоў вызначальную ролю адыграла пастанова ІІ сесіі ЦВК БССР "Аб практычных мерапрыемствах па правядзенні нацыянальнай палітыкі". У другім раздзеле гэтай пастановы гаварылася аб тым, што "навучанне і выкладанне ва ўсіх установах сацыяльнага выхавання і прафтэхнічнай адукацыі павінна весціся на роднай мове абслугоўваемага насельніцтва… мова беларуская і руская – першая як мова большасці насельніцтва БССР, другая як мова, якая мае агульнасаюзнае значэнне, з'яўляюцца абавязковымі прадметамі выкладання ва ўсіх вучэбных установах БССР" [8, с. 4].

З улікам прынятых пастаноў савецкага ўрада на тэрыторыі БССР працягвалася практычнае ажыццяўленне нацыянальнай праграмы бальшавікоў у галіне асветы. Першаступеннай у гэты час стала задача беларусізацыі ўстаноў адукацыі. Трэба адзначыць, што яшчэ ў 1923/1924 навучальным годзе ўсе сельскія пачатковыя школы БССР былі пераведзены на беларускую мову. З 1925/1926 вучэбнага года на беларускую мову пачалі пераходзіць старшыя класы. Безумоўна, гэты працэс напачатку выклікаў пэўныя цяжкасці: не хапала беларускіх падручнікаў, кваліфікаваных педагогаў, якія б маглі весці заняткі на

беларускай мове. У сувязі з гэтым з 1925 г. значна пашыралася сетка курсаў беларусазнаўства ў рэспубліцы, у тым ліку і на Віцебшчыне. Такая мэтанакіраваная работа органаў народнай асветы прывяла да таго, што на 1927 год 85,3 % школ, 49,3 % дзіцячых садоў, 71,5% педтэхнікумаў БССР былі беларускімі [9, с. 44-46].

У вызначаны перыяд праводзілася далейшая работа па пераводу школ нацыянальных меншасцей на іх родныя мовы. Паводле архіўных звестак на 1926 г. толькі ў Віцебскай акрузе дзейнічалі 15 польскіх школ з выкладаннем на польскай мове і 1 польска-беларуская школа [10]. Усе яны ўтрымліваліся за дзяржаўны кошт. Колькасць навучэнцаў у іх складала 1025 чалавек, выкладчыкаў – 35 чалавек. Гэтыя школы ахоплівалі 88% усіх дзяцей польскай нацыянальнасці па акрузе. Як бачна, гэты працэнт быў даволі высокім. Аднак сама забяспечанасць школ падручнікамі і іншымі метадычнымі матэрыяламі была даволі нізкай і задавальняла толькі 30% ад запатрабаванага. Прыкладна такая ж сітуацыя назіралася з яўрэйскімі, латышскімі і літоўскімі школамі Віцебшчыны. На шляху станаўлення нацыянальных школ былі і іншыя праблемы: недахоп педагагічных кадраў, адсутнасць цеснай сувязі паміж гэтымі ўстановамі адукацыі, “значная недагрузка школ вучнямі” ў сувязі з “раскіданасцю” нетытульнага насельніцтва. Тым не менш савецкімі органамі ўлады рабілася ўсё магчымае, каб праз выкарыстанне нацыянальных моў узняць узровень пісьменнасці сярод нацыянальных меншасцей Беларусі: складаліся перспектыўныя планы ўсеагульнага навучання для кожнай нацыянальнасці, адчыняліся новыя школы па меры запатрабавання мясцовага насельніцтва. З мэтай падрыхтоўкі кваліфікаваных педагагічных і тэхнічных кадраў у БССР, у тым ліку і на Віцебшчыне, працягвалі сваю працу яўрэйскія (у Віцебску, Гомелі і Мінску) і польскі (у Мінску) педтэхнікумы.

Тэндэнцыя пашырэння сеткі школ і дашкольных устаноў для насельніцтва Віцебшчыны захоўвалася да сярэдзіны 1930-х гадоў, пакуль не стаў адбывацца працэс пераводу школ нетытульных этнічных супольнасцей у школы агульнага тыпу, дзе мовамі выкладання ў большасці выпадкаў была руская ці беларуская. Гэты працэс на Беларусі пачаўся яшчэ ў верасні 1934 г., калі Бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР прынялі сумесную пастанову “Аб выніках перагляду становішча польскіх школ”. Адпаведна вызначанай пастанове пачалося рэзкае скарачэнне колькасці польскіх нацыянальных школ. Са 136 школ, якія працавалі ў 1933/1934 вучэбным годзе, у наступным годзе засталося толькі 15 школ. Канчаткова пытанне аб нацыянальных школах было вырашана на паседжанні Аргбюро ЦК УКП(б) ад 1 снежня 1937 г., калі было прызнана шкодным “существование особых национальных школ на территории соответствующих республик” і прапанавана “реорганизовать указанные школы в советские школы обычного типа”. Народ-

ным камісарыятам асветы нацыянальных рэспублік было загадана "представить в ЦК ВКП(б) предложения о ликвидации национальных школ, педтехникумов, домов просвещения и других культурно-просветительных учреждений". У выніку прыняцця такіх рашэнняў партыі і ўрада, у БССР, у тым ліку і на Віцебшыне ў 1938/1939 навучальным годзе ўжо не было ніводнай школы для нацыянальных меншасцей. Дзеці сталі атрымоўваць адукацыю ва ўстановах агульнага тыпу, дзе навучанне вялося на рускай ці беларускай мовах.


1. Собрание узаконений и распоряжений рабоче-крестьянского правительства РСФСР. – М.: Изд-во СНК РСФСР, 1918. – № 80. – 424 с.
2. Собрание узаконений и распоряжений рабоче-крестьянского правительства РСФСР. – М.: Изд-во СНК РСФСР, 1919. – № 67. – 462 с.
3. Андрэева, Е.Г. Гісторыя народнай асветы Беларусі / Е.Г. Андрэева – Мн.: Народная асвета, 2001. – 326 с.
4. Жылінскі, Г. Ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі ў 1920-я гады / Г.Жылінскі // Адукацыя і выхаванне. – 1996. – № 8. – С. 16-20.
5. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). Ф. 10050. Воп. 1. Спр. 355. Арк. 60.
6. Зелянкова, А. Палітыка савецкай улады ў галіне адукацыі на беларускіх тэрыторыях у складзе РСФСР (1919-1926) / А. Зелянкова // Весці НАН Беларусі. – Сер. гуманітарных навук – 2001. – № 2. – С. 47 – 53.
7. ДАВВ. Ф. 10050. Воп. 1. Спр. 24. Арк. 2.
8. Собрание узаконений и распоряжений рабоче-крестьянского правительства БССР. – Мн.: Изд-во СНК БССР, 1927. – 380 с.
9. Практическое разрешение национального вопроса в БССР. Часть 2. Работа среди национальных меншинств. – Мн.: Беларускае дзяржвыдавецтва, 1928. – 156 с.
10. ДАВВ. Ф. 170. Воп. 1. Спр. 54. Арк. 30.


**Сухоцкая С.Ю.**

## ОБРАЗОВАНИЕ НА ВИТЕБЩИНЕ В 1920-Х ГОДАХ: НАЦИОНАЛЬНЫЙ АСПЕКТ

Одним из направлений национальной политики советской власти в области образования в начале 1920-х годов было создание национальных школ, где школьники могли обучаться на родном языке. Общее реформирование школьного образования началось в 1917 году. В основу построения новой школы были положены следующие документы: Положение «О единой трудовой школе РСФСР» и Декларация «Основные принципы единой трудовой школы», утвержденные ВЦИК РСФСР от 16 октября 1918 года. Согласно данным документам новая школа была построена на таких принципах, как светскость на всех ступенях обучения, национальная школа с обучением на родном языке, равноправие в отношении образования мужчин и женщин, демокра-

тическая организация обучения, которая должна носить трудовой характер, преемственность всех звеньев образования. Обучение составляло 9 лет. Школы разделялись на 2 концентра: 1-й с 5-летним курсом обучения для детей 8-13 лет, и 2-ой с 4-летним для детей 13-17 лет.

Школы национальных меньшинств начали создаваться после принятия 31 октября 1918 года Коллегией Народного комиссариата просвещения РСФСР постановления «О школах национальных меньшинств». На основании «Инструкции об организации и деятельности подотделов просвещения национальных меньшинств на местах» от 9 ноября 1918 года создавались подотделы просвещения национальных меньшинств при отделах просвещения местных исполкомов, которые руководили всей работой национальных школ. 22 февраля 1919 года при Витебском отделе народного образования был создан подотдел национальных меньшинств, при котором существовали еврейская, латышская и польская секции [8, с. 278]. Деятельность секций носила разнообразный характер, в частности, латышская секция занималась оказанием помощи колониям латышей в организации школ, преподавании на родном языке, снабжении школ учебниками, мебелью, оборудованием [8, с. 279].

Все еврейские, латышские, польские школы были тесно связаны с национальными партийными органами и культурно-просветительными организациями. Согласно решению президиума Витебского губисполкома, с 1 ноября 1923 года подотдел по делам национальностей был ликвидирован. При организационном подотделе секретариата была учреждена должность инспектора по национальным делам, который и продолжал деятельность губернского подотдела по делам национальностей.

Присоединение Витебщины к БССР (март 1924 г.) обусловило распространение на ее землях политики белорусизации, что способствовало дальнейшему развитию национальных школ. Принятое 2-й сессией Центрального исполнительного комитета БССР «Постановление о мерах по проведению национальной политики» от 15 июля 1924 года гласило, что обучение и преподавание во всех учреждениях социального воспитания и профтехнического образования, а равным образом и обслуживание всех прочих культурно-просветительских потребностей населения должно вестись на их родном языке. Это привело к значительному увеличению количества школ национальных меньшинств.

В 1924-1925 учебном году всего по городу числилось школ 1-й ступени 40, школ 2-й ступени—13, в них обучалось 8326 учащихся. По национальному составу учащиеся распределялись таким образом: белорусов—20%, русских—13%, евреев—52%, поляков—7%, и прочие -8%. По социальному составу учащиеся делились: рабочих—21%, служащих— 29%, крестьян—9%, кустарей—17%, красноармейцев—2% и

прочих—2% [2, л. 95]. Кроме того, действовали 4 вечерние школы рабочей молодежи, в них занималось 719 человек, 12 школ для малограмотных. Для беспризорных было создано 8 детдомов и школьных коммун. В школах работало 620 учителей [3, л. 95]. Также в городе насчитывалось 15 библиотек и Дом книги, который имел передвижные библиотеки в 70 пунктах города, политико-просветительских учреждений в1924 году, то есть изб-читален и Нардомов, — 56 [1, л. 95].

Сеть еврейских образовательных учреждений по округу в 1924-1925 учебном году состояла из 17 школ (2670 учащихся), 5 детдомов и 6 садиков, которые включали в себя 454 детей и 28 руководителей. Помимо того, следует отметить полит-просветительные учреждения: 1 школа рабочей молодежи, 4 ликпункта, 2 клуба, 2 избы-читальни, 6 библиотек, 1 партшкола; профобразовательные учреждения: 1 Евпедтехникум со 160 курсантами, 1 школа швейников (60), 1 школа кожевенников (50) и 1 швейная мастерская (40) [6, л. 129].

Сеть латышских образовательных учреждений включала в себя 7 школ (367), 1 детдом, 1 клуб. Кроме этого, в Витебском округе насчитывалось 20 культурно-просветительских кружков с 427 членами, 8 библиотек с книжным фондом в 4052 томов [6, л. 129].

Сеть польских образовательных учреждений состояла из 1 школы-семилетки (150), 7 школ 1-й ступени (1045), 1 детдома (48), 1 школы для взрослых (72). При каждой школе имелась изба-читальня [6, л.129].

В основу политики белорусизации был положен принцип перевода образовательных и культурно-просветительных учреждений на белорусский язык. По городу в учебном 1925 году целиком на белорусский язык перешел Белорусский Педтехникум. Частично начала переводиться 1 нулевка и 2-я группа в 6-и семилетках и 5-и начальных школах. По округу перешли на белорусский язык около 60 школ. В политпросветучреждениях на белорусский язык переводилась деятельность изб-читален и ликпунктов, которые составили 75 % всех культурно-просветительных учреждений округа. Во всех школах нацменьшинств белорусский и русский языки вводились как предметы преподавания с 3-го и 4-го года обучения. Частично на белорусский язык была переведена Витебская совпартшкола [3, л. 291 – 292].

Продолжали развиваться открытые после Октябрьской революции первые высшие учебные заведения – педагогический и ветеринарный институты. Работали 2 педагогических, промышленно – экономический и механический техникумы, 2 музыкальные школы, 3 медшколы, медкурсы. Молодое поколение рабочего класса готовили 5 профтехшкол (текстильщиков, швейников, кожевников, обувщиков, печатников) [5, с. 260].

На примере профобразовательных учреждений города Витебска можно видеть, как реализовывалась национально-образовательная по-

литика в Витебском регионе. Практически во всех профобразовательных учреждениях города значительную часть учащихся составляли представители еврейской национальности. Медицинское образование получали в основном русские, евреи и белорусы. Представители польской национальности учились в музыкальном и медицинском техникумах. Также в городе работали два национальных техникума - Евпедтехникум, где учились одни евреи и Белпедтехникум, где основную часть учащихся составляли белорусы [5, л.77]. См. таблицу.

| Название техникума | Белорусы | Евреи | Поляки | Великорусы | Латыши | Прочие |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Электро-механический | 33% | 62% | 1% | 3% | - | 1% |
| Художественный | 63% | 32% | 2% | 1% | 1% | 1% |
| Музыкальный | 27% | 58% | 8% | 12% | - | - |
| Медицинский | 28,2% | 32% | 3,8% | 34,5% | 1,5% | - |
| Евпедтехникум | - | 100% | - | - | - | - |
| Кооперативный | 25,7% | 62,5% | 2,3% | 9,5% | - | - |
| Белпедтехникум | 83% | 13% | 3% | 0,5% | - | 0,5% |

Таким образом, работа в сфере образования на Витебщине вытекала из политики советской власти в 1920-е годы, которая предполагала комплекс мер, направленных на развитие национальной культуры, организацию школ для национальных меньшинств. Специфика национального состава населения Витебского региона в 1920-х годах привела к созданию национальной системы образования на языках основных этносов, проживавших на этой территории.


1. Государственный архив Витебской области (далее ГАВО), ф. 118, оп. 1, д. 3
2. ГАВО, ф. 118, оп. 1, д. 524.
3. ГАВО, ф. 118, оп. 1, д. 526.
4. ГАВО, ф. 476, оп. 1, д. 24.
5. ГАВО, ф. 10051-п, оп. 1, д. 64.
6. ГАВО, ф. 10051-п, оп. 1, д. 89.
7. Зайко, К.И. На крутым павароце гісторыі / К.И. Зайко // Памяць: Гіст.–дакум. хроніка Віцебска: у 2-х кн. Кн. 1-я / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2002. – С. 250 – 271.
8. Ширма, В. Развитие латышского школьного образования на территории Витебщины в 20-е годы XX века / В. Ширма // Latgale ka kulturas pierobeza. – Daugavpils, 2008. – С. 277 – 282.

**Шишанов В.А.**

# МАТЕРИАЛЫ ГОСУДАРСТВЕННОГО АРХИВА ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ О ШКОЛЕ В УСАДЬБЕ «ЗДРАВНЕВО»

Изучение деятельности начальной школы в усадьбе И.Е. Репина «Здравнево», представляет значительный интерес не только для освещения пребывания в усадьбе семьи младшей дочери известного художника Татьяны Ильиничны Репиной-Язевой, но и для понимания процесса становления системы начального образования в первые послереволюционные годы. Наряду с материалами по другим сельским школам, выявленные документы являются ценными источниками для анализа кадрового состава, положения учителей, хозяйственного состояния школ, для изучения развития новых принципов и сложностях организации учебного процесса, изменений в отношении населения к образованию.

«Крайняя необходимость» создания школы в усадьбе Здравнево была установлена 24 июня 1918 г. на заседании Верховского волостного совета по народному образованию [2, л. 15 об., 16]. На собрании жителей близлежащих деревень 30 августа был принят протокол, в котором отмечалось, что при значительном числе детей школьного возраста, ближайшие школы находятся на слишком большом расстоянии, чтобы можно было зимой отпускать детей одних в школу. В тоже время крестьяне заявляли, что «желание учить детей у них крайне велико» и постановили просить открыть школу в Здравневе, где имеется подходящее помещение, которое они обязались отремонтировать, заготовить дрова, «заготовить или доставить откуда потребуется парты» и брали на себя «мойку полов». Крестьяне ходатайствовали о переводе в эту школу учителем сына местного священника Ивана Дмитриевича Дьяконова, как человека им «известного, местного, добросовестного», которому они могли «смело, без колебаний доверить воспитание своих детей» [2, л. 27—27 об.]. Переехавшая в Здравнево из Петрограда Т.И. Репина-Язева также дала согласие на размещение в усадьбе школы [2, л. 25] и по постановлению волоно от 3 сентября 1918 г. просьба крестьян была удовлетворена.

Школа разместилась в нескольких комнатах главного усадебного дома и флигеле. В начале 1920-х гг. для нее было построено новое здание, но некоторые комнаты в главном доме еще продолжительное время использовались под классы.

1 сентября 1918 г. И.Д. Дьяконов приступил к занятиям. После введения 22 января 1922 г. в системе народного образования должности заведующего школой И.Д. Дьяконов стал заведующим Здравневской школой [7, л. 1 об., 3 об.]. Документы архива позволяют просле-

дить изменение преподавательского состава школы, среди учителей которой были Н.Ф. Быченок, И.М. Косаренко, Л.В. Слупский.

1 февраля 1919 г. Т.И. Репина-Язева была назначена «третьим штатным учителем в Верховскую школу, с возложением на нее преподавания рисования как по назначенной школе, так и по Здравневской и Глодницкой школе» [5, л. 3]. С началом нового учебного года Татьяна Ильинична стала штатным учителем Здравневской школы [3, л. 40]. Обратившись к ее личной карточке можно узнать о напряженном расписании уроков: в I группе – все предметы, во II, Ш, IV – рисование, в IV группе – немецкий язык. Однако 12 августа 1922 г. Т.И. Репина-Язева из-за ухудшения слуха оставила преподавательскую работу [5, л. 35 об].

На 1919/20 учебный год в Здравневской шлоле выявилась необходимость открыть третий комплект. Воспользовавшись этим, внучка Репина Татьяна Николаевна Язева подала заявление в Верховский волоно о предоставлении ей места учительницы. В ходатайстве волоно в уоно отмечалось, что Т.Н. Язева «является желательной учительницей не только для волостного отдела, но и для населения данного района, как проявившая много знания и любви к делу, помогая в прошлом учебном году учащим данной школы» [9, л. 2—2 об.].

С 1922 по 1925 г. Т.Н. Язева и ставший ее мужем И.Д. Дьяконов, преподавали в Здравневской школе вдвоем. Но весной 1925 г. в волоно донесли, что Т.Н. Дьяконова «была на исповеди в церкви» [1]. 22 июня 1925 г. на заседании комиссии по укомплектованию школ Кузнецовского района было принято постановление: «Сократить тов. Язеву Татьяну по должности учительницы Здравневской школы с 1 октября с.г. вследствие сокращения комплекта в школе. В виду того, что тов. Язева выполняет все христианские обряды, воздержаться от назначения Язевой Татьяны в другую школу в качестве учительницы и предложить ей место технического работника в учреждениях Наробраза не исключая из Союза Рабпрос» [12, л. 116]. Постановление бюро Кузнецовского райкома КПБ было еще жестче: «Ввиду того, что школьная работница т. Язева фанатично религиозно настроена, что отрицательным образом действует на деревенскую молодёжь, просить через Окружком КПБ – комфракцию Рабпрос о снятии Язевой со школьной работы» [13, л. 194]. Т.Н. Язева-Дьяконова получила должность делопроизводителя в Храповической школе, но 1 октября 1925 г. уволилась «по собственному желанию» [12, л. 186].

В архиве выявлено значительное количество документов связанных с решением хозяйственных вопросов [5; 11]. Это переписка об обеспечении школы оборудованием, учебниками, топливом, о ремонте школы и выделении ей земельного участка, о распределении одежды, конфет между учениками и материальном обеспечении учителей.

Количество учеников в школе за период с 1918 по 1930 г. колебалось от максимальной – 77 чел. (1919-1920 уч. год), до 35 чел. (1926-1927 уч. год).

Вся переписка в начальный период существования школы велась от имени избранного 28 января 1919 г. школьного совета, в который входили учителя, представители от учащихся и их родителей, позже – представитель сельсовета.

Документы позволяют восстановить непритязательный быт школы. Инвентарь состоял из 14 парт, изготовленных местным крестьянином в 1918 г., 1 школьной доски, 10 чернильниц, 2 ведер, кружки для воды и школьной печати [5, л. 26; 11, л. 15]. Неоднократно в 1925-27 гг. И.Д. Дьяконов просил районо выделить школе шкаф для книг, стол, стул, но в отношении оборудования дело обстояло «кепска» [10, л. 108 и об.; 11, л. 15].

Богаче выглядят списки учебников и наглядных пособий. В них – таблицы по естествознанию, ботанике, биологии, карты России, полушарий, Витебской губернии, глобус и как обязательные атрибуты – портреты В.И. Ленина, А.И. Рыкова, А.В. Луначарского, Л.Д. Троцкого, Г.Е. Зиновьева.

После того, как в марте 1924 года часть Витебской губернии вошла в состав БССР и началась политика белоруссизации преподавание в здравневской школе стало вестись на белоруском языке. В списках имущества появились портреты А.Г. Червякова, В.М. Игнатовского, И.А. Адамовича, белорусские учебники.

Концепция советской единой трудовой школы строилась на приоритете трудового воспитания, тесно связанного с жизнью и приучающего к коллективному труду. Обязательное наличие участка земли при школе предусматривалось 25-й статьей «Положения о единой трудовой школе». Вынашивались планы превращения школ в некое подобие коллективных хозяйств. В апреле 1919 г. Здравневской школе было выделено 5 дес. земли.

В отличие от «учебно-воспитательной» направленности указаний уоно, инструкция Наркомпроса «Относительно организации и проведения школьной посевной кампании» [8, л. 64 и об.] от 13 мая 1921 г. придавала кампании гораздо большее хозяйственное значение и призывала на съездах учащихся и школьных работников «ставить этот вопрос как боевой, требующий напряжения всех культурных сил». Инструкция требовала самого тщательного ухода за огородами и полями, охраны их от хищений в течение всего лета и проведения расследования, если урожай окажется ниже ожидаемого. Полученные со школьного участка продукты должны были поступать «в общий котел школы для школьной столовой для коммунального питания учащих и учащихся». В фонд поощрения участников работы разрешалось пере-

давать от 10 до 25% урожая.

Но реальная жизнь рассудила по-своему. И превратить школу в рассадник коллективизма и источник рабочей силы удалось лишь отчасти. Участок Здравневской школы обрабатывался или учителями, или малоземельными крестьянами.

Особенно сложным периодом было начало 1920-х гг., когда школы были переданы на содержание местных властей. Единственным источником материального обеспечения школ и учителей стало так называемое самообложение, выражавшееся в сдаче крестьянами определенного количестве денег и продуктов питания на нужды народного образования. Истощенные поборами родители весьма неохотно расставались с далеко не лишними продуктами и, в некоторых случаях, чтобы избежать уплаты, не пускали детей в школу. Примечателен и тот факт, что крестьяне, как одно из условий проведения самообложения, ставили вопрос о преподавании вероучения в школах [6, л. 26].

Надо сказать, что состояние школ находилось под постоянным вниманием властей и доклады заведующих школами регулярно заслушивались на заседаниях президиума сельсовета. Выявлен протокол заседания Николаевского сельсовета от 5 марта 1927 г. с записью доклада И.Д. Дьяконова и прениями: «т. Дзіяканаў далажыў аб становішчы школы, а таксама аб пачатку заняткаў у школе, якія пачаліся з 18 кастрычніка 1926 г. і абучалось усяго вучняў 17, к 1 лістапада вучнеў з’явілась больш якіх лік дасціг 36 <…> Школа падразделена на 3 группы, пасешчаемасьць школы вокало 85%. <…> Кепска справа абстаіць з тым, што кола ў мінулым годзе не атрымала апалу<…>. Кнігамі школа забяспечана, так як маецца вокало 175 кніг (вучэбнікаў), што датыкаецца інвентара, то такога мала, як немеецца скрынкі для хаваньня кніг, стала, 1 туборэта. школа адрымантавана на адпушчаные сродкі раёнам у сумме 15 руб., якога яшчэ не хапае. <…>

Тав. Вераб’ёў: <…> Добра, што к экзамену будзіць падрыхтавана, але толькі вучобу ў школе не аслабліваць да канца году <…>.

Тав. Дзіаканаў: <…> кепска ў тым, як эканамічныя сродкі не пазваляюць, няма вопраткі і друг., но справа абстаіць кепска і аб тым, як насельніцтва не прывязываюць сабак на ланцугі, на што вучні жалуюцца <…>” [10, л. 14 и об.].

В июле 1930 г., спасаясь от репрессий семья Репиных-Дьяконовых выехала в Финляндию к И.Е. Репину [14, с. 23-43; 15, с. 53-59; 16, с. 102-115]. Школа в Здравневе продолжала свое существование вплоть до начала Великой отечественной войны, но отсутствие в ГАВО документов не дает возможности осветить ее деятельность в 1930-е гг.

1. Письмо Т. Репиной-Язевой в «Пенаты» 9 мая 1925 г. Ксерокопия // ВОКМ, н/в 10054/5.

2. Государственный архив Витебской области (ГАВО). Ф. 91. Оп. 1. Д. 64.
3. ГАВО. Ф. 91. Оп. 1. Д. 74. Л. 40.
4. ГАВО. Ф. 91. Оп. 1. Д. 75. Л. 3.
5. ГАВО. Ф. 91. Оп. 1. Д. 85. Л. 35об.
6. ГАВО. Ф. 221. Оп. 1. Д. 79. Л. 26.
7. ГАВО. Ф. 221. Оп. 1 Д. 156 Л. 1об, 3об.
8. ГАВО. Ф. 221. Оп. 1. Д. 119. Л. 64 и об.
9. ГАВО. Ф. 221. Оп. 2. Д. 67. Л. 2 и об.
10. ГАВО. Ф. 571. Оп. 1. Д. 78. Л. 14 и об.
11. ГАВО. Ф. 571. Оп. 1. Д. 464. Л. 15.
12. ГАВО. Ф. 734. Оп. 1. Д. 27. Л. 116.
13. ГАВО. Ф. 10051. Оп. 1. Д. 145. Л. 194.
14. Кичина Е.М. И.Е. Репин и Здравнёво. В обретении и разлуке. 2-е изд., перераб. и доп. – Витебск, 1994. – 112 с.
15. Падліпскі А.М. Здраўнёва: тут жыў І.Я. Рэпін. – Мн., 1995. – 63 с.
16. Шышанаў В. Невядомае Здраўнёва // Віцебскі сшытак. – 2000. – №4. – С.90—115.

**Пархімовіч М.М.**

## ВІЦЕБСКІ РАБОЧЫ ФАКУЛЬТЭТ: НА ПАЧАТКУ ШЛЯХУ

Рабочыя факультэты – агульнаадукацайныя навучальныя ўстановы, якія існавалі ў БССР у 1920-х – пач. 1940-х гадоў. Іх галоўнай задачай была падрыхтоўка дарослых рабочых і сялян, што мелі пачатковую адукацыю, да паступлення ў ВНУ. У межах сучаснай Рэспублікі Беларусь першы рабфак быў створаны ў ліпені 1920 г. пры Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце.

Мэтай нашай працы з’яўляецца даследаванне працэсу стварэння і першых крокаў Віцебскага рабочага факультэта. У беларускай гістарыяграфіі няма спецыяльных прац, прысвечаных абранай намі тэме, таму асноўнай крыніцазнаўчай базай работы сталі фонды Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці. Разам з тым, мы выкарысталі працу І.М. Раманавай [6]. У гэтым даследаванні аўтар разгледзела працэс стварэння і дзейнасці рабфакаў на тэрыторыі Беларусі ў 20-х гг. ХХ ст. І.М. Раманава вызначыла ролю дзяржавы ў стварэнні рабочых факультэтаў, прааналізавала сацыяльны склад навучэнцаў, вучэбныя планы, адзначыла станоўчыя і адмоўныя бакі дзейнасці гэтых устаноў. У працы вельмі добра прасочана і эвалюцыя рабфакаў у 1920-я гады. Аднак дадзеныя здабыткі аўтарам дасягнуты за кошт аналізу дзейнасці дзяржаўных органаў, рабфака БДУ, Горацкага, Аршанскага. На жаль, Віцебскі рабфак даследчыца нават не згадвае. Пытаннямі стварэння і дзейнасці рабочых факультэтаў у БССР займаўся і М.Ф. Чудаеў [7, 8]. Аднак, у першай працы ён даследаваў

выключна дзейнасць рабфака БДУ, а другая – не зусім супадае з храналагічнымі межамі нашай работы.

Віцебскі дзённы рабочы факультэт быў адкрыты ў 1928 годзе згодна пастанове Народнага камісарыята асветы [1]. Яго галоўнай задачай стала падрыхтоўка рабочай і сялянскай моладзі да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Сістэма адукацыі, якая існавала ў 1920-я гг.не мела пераемнасці паміж рознымі ступенямі. Таму, напрыклад, асоба, што скончыла сямігадовую школу, не мела магчымасці паступіць у ВНУ. Пасля сямігодкі можна было трапіць толькі ў тэхнікум. Для паступлення ў ВНУ патрабавалася дадаткова скончыць агульнаадукацыйныя курсы на базе 7-гадовай школы, альбо рабфак. Рабочы факультэт даваў адну з магчымасцей для пераросшага ўжо школу маладога рабочага і селяніна паступіць у вышэйшую навучальную установу.

Першы набор студэнтаў на Віцебскі рабочы факультэт быў праведзены ў верасні 1928 года. Кожны паступаючы на рабфак павінен быў прад’явіць камандзіровачнае пасведчанне. Яно выдавалася партыйнымі арганізацыямі, прафсаюзамі, камсамолам, прамысловымі прадпрыемствамі. Без такой камандзіроўкі паступіць на рабочы факультэт было немагчыма. Акрамя таго паступаючыя павінны былі мецъ запоўненую і завераную па месцы працы анкету. У ёй абавязкова адзначалася колькі гадоў дадзеная асоба займаецца фізічнай працай (працоўны стаж). Неабходна было паведаміць у анкеце і аб грамадскім стажы. Пад апошнім меўся на ўвазе ўдзел у працы саветаў і грамадскіх арганізацый. Калі ў паступаючага не было стажу фізічнай працы, то ён страчваў усе шанцы на паступленне. Праўда, калі абітурыент быў членам кампартыі ці кандыдатам, то партыйны стаж прыраўноўваўся да стажу фізічнай працы. Дакументаў аб адукацыі не патрабавалі. У анкеце трэба было толькі паведаміць аб яе ўзроўні на момант падачы дакументаў. Такім чынам, трапіць на рабфакі маглі толькі рабочыя, сяляне, кандыдаты і члены УКП(б). Гэта значыць, што рабочыя факультэты, выконвалі пэўны сацыяльна-палітычны заказ дзяржавы - фарміраваць высокакваліфікаваныя кадры амаль выключна за кошт рабоча-сялянскай часткі насельніцтва краіны.

Паступаючыя на Віцебскі рабфак павінны былі вытрымаць іспыты. Яны праводзіліся ў пісьмовай і вуснай формах па матэматыцы, беларускай і рускай мовах. Адзнакі вызначаліся словамі “здавальняюча” і “нездавальняюча” У шэрагу іспытаў важнае значэнне меў экзамен па беларускай мове. Прыёмная камісія нікога не вызваляла ад гэтага экзамену. Спробы ж з боку абітурыентаў ухіліцца ад здачы беларускай мовы былі. Так, 6 паступаючых з Гомельскай акругі напісалі заяву ў камісію па прыёму з просьбай вызваліць іх ад іспытаў па беларускай мове. Тлумачылі гэта тым, што тэрыторыя, з якой яны

прыехалі, была ўключана ў склад БССР толькі ў 1926 годзе. У выніку – яны мовы не ведаюць. Камісія не задаволіла просьбу гэтых абітурыентаў і яны не прайшлі ўступных выпрабаванняў. У далейшым на рабфаку таксама будуць паважліва ставіцца да беларускай мовы. Згодна распараджэнню кіраўніцтва Віцебскага рабфака ўсе прадметы, за выключэннем ваеннай справы і рускай мовы, ў 1928/29 навучальным годзе выкладаліся на роднай мове. Нават на занятках па нямецкай мове тлумачэнні даваліся па беларуску. Кіраўніцтва патрабавала не толькі выкладання на беларускай мове, студэнты рабфака адказваць на занятках таксама павінны былі па-беларуску. Гэты факт сведчыць аб тым, што ў Віцебскім рабфаку ў 1928 годзе беларусізацыя мела месца.

Уступныя іспыты паказалі нізкі ўзровень паступаючых. З 246 падаўшых заявы камісія з цяжкасцю магла набраць 96 чалавек, якія былі вызначаны Народным камісарыятым асветы для навучання ў Віцебскім дзённым рабфаку. Затое быў выкананы сацыяльны заказ. Сярод 96 чалавек 64 паходзілі з рабочых, 23 з сялян, выхаванцаў дзіцячых дамоў было 8 і толькі адзін служачы [2]. Апошні стаў студэнтам толькі таму, што на момант паступлення быў кандыдатам у члены КП(б)Б.

Інфармацыі аб адкрыцці рабфака ў Віцебску не аказалася ў шэрагу рэгіёнаў Беларусі. Не былі дакладна вядомы тэрміны падачы дакументаў і прыёмных іспытаў. Вынікам гэтага промаху стала тое, што некаторыя з паступаючых з’явіліся ў Віцебску раней, чым пачалася ўступная кампанія. Адным з іх быў Алесь Шкілевіч з Менскай акругі. Ён прыехаў у Віцебск у жніўні 1928 года, задоўга да ўступных экзаменаў. У сваёй заяве ён прасіў камісію рабфака залічыць яго без экзаменаў. Тлумачыў Шкілевіч сваю просьбу вялікімі выдаткамі на праезд назад дадому і зноў на экзамены ў Віцебск. Аднак камісія адмовіла прасіцелю [3].

Загадчыкам Віцебскага рабочага факультэта быў прызначаны Павел Біндзюк, які працаваў да гэтага моманту выкладчыкам Менскага рабфака. У Менску ён выкладаў беларускую мову. Выконваючы абавязкі загадчыка ў Віцебску Біндзюк таксама меў за сабой вучэбныя гадзіны беларускай мовы. П. Біндзюк не меў вышэйшай адукацыі, а толькі сярэднюю спецыяльную. У 1921 годзе ён скончыў Віленскія беларускія настаўніцкія курсы. Сярод 10 выкладчыкаў, якія былі зацверджаны НКА для працы ў Віцебскім рабфаку, у 3-х была вышэйшая, у 3-х н/вышэйшая і ў 4-х сярэдняя спецыяльная. У іх ліку былі 2 выпускнікі Петраградскага ўніверсітэту. Быў сярод іх і выхаванец Віцебскага настаўніцкага інстытута, выкладчык матэматыкі Л.М. Каліцін. Па ўзроўню падрыхтоўкі выкладчыкі Віцебскага рабфаку не саступалі сваім калегам з аналагічных устаноў на Беларусі і былі ў стане забяспечыць добры ўзровень падрыхтоўкі студэнтаў. У першы

год працы на Віцебскім рабфаку стаўка выкладчыка была вызначана ў 12 гадзін на тыдзень. Па гэтай стаўцы ён атрымліваў 90 рублёў у месяц. Прыбіральшчыца на рабфаку зарабляла 30 рублёў у месяц. Выкладчыкі звычайна сумяшчалі працу на рабфаку з працай у іншых установах. На рабфаку прытрымліваліся строгай працоўнай дысцыпліны. Кожны выкладчык, пасля праведзеных заняткаў, у той жа дзень павінен быў зрабіць аб гэтым запіс у спецыяльнай кнізе. Загадчык рабфаку асабіста кантраляваў гэты працэс і папярэджваў выкладчыка аб тым, што пры адсутнасці запісаў заработная плата яму налічана не будзе. У першы год працы такіх выпадкаў на рабфаку не было.

Віцебскі дзённы рабочы факультэт, згодна пастанове НКА, меў статус самастойнай гаспадарчай адзінкі. У яго складзе былі два памяшканні, дзе размяшчаліся вучэбныя аўдыторыі і інтэрнат. Акрамя вучэбных класаў у складзе рабфаку былі вучэбныя лабараторыі, бібліятэка, сталовая для студэнтаў. Праца рабфака была арганізавана па трыместрах. На рабочым факультэце ў першы год існавання выкладаліся: матэматыка, беларуская і руская мовы, біялогія, геаграфія, нямецкая мова, ваенная падрыхтоўка і палітграмата. Выкарыстоўваўся класна-урочны метад выкладання. Ён прадугледжваў тлумачэнне, апытанне і 1 кантрольную работу ў тыдзень па 1-му з прадметаў выкладання. Кантрольныя па прадметах павінны былі чаргавацца. Кожны дзень студэнты рабфака працавалі па 6 гадзін (урокаў) у аўдыторыі. Кожная вучэбная гадзіна складалася з 40-ка астранамічных хвілін. Прадугледжвалася, што самі студэнты яшчэ тры гадзіны ў дзень будуць працаваць самастойна. Якраз у 1928 годзе на дзённым адзяленні рабфакаў быў уведзены 4-х гадовы тэрмін навучання [6, с. 116].

Па выніках кожнага трыместра праводзілася нарада выкладчыкаў, на якой давалася характарыстыка кожнаму студэнту: вызначаліся яго здольнасці, узровень дасягнутай адукацыі, адносіны да працы, перспектывы на далейшае навучанне. Акрамя таго штомесяц выкладчыкі павінны былі прадстаўляць у навуковую частку звесткі аб паспяховасці студэнтаў, з мэтай вывучэння яго перспектывы на навучанне на 2-м курсе. На паседжанні па выніках першага трыместра аказалася, што 38% студэнтаў не паспявалі па рускай мове, 32 – беларускай, 31 – нямецкай і па палітграмаце – 9%. Сярод прычын такога становішча былі слабая першапачатковая падрыхтоўка студэнтаў, няўменне рабфакаўцаў карыстацца кнігай, нежаданне працаваць дома, недахоп здольнасцяў у пэўных студэнтаў, абыякавыя адносіны да вучобы. Каб выправіць сітуацыю на рабфаку стварылі рознаўзроўневыя вучэбныя студэнцкія групы, замацавалі за адстаючымі лепшых студэнтаў, больш дэталёва растлумачылі навучэнцам навыкі работы з кнігай [4].

Навучэнцы рабфакаў забяспечваліся інтэрнатам (праўда, не ўсе), навучаліся за кошт дзяржавы, атрымлівалі стыпендыю. Па апошняму паказчыку студэнты рабочых факультэтаў значна пераўзыходзілі студэнтаў ВНУ. Так, у 1928/1929 навучальным годзе 99% усіх рабфакаўцаў мелі стыпендыю. Сярод студэнтаў ВНУ гэты паказчык не перавышаў 65 %.[6, с. 113] І. Раманава не ўпамінае аб гэтым, а навучэнцы ж рабфакаў мелі яшчэ скідкі ад 50 да 100% (у залежнасці ад адлегласці), на праезд дадому і назад. Праўда гэтыя скідкі можна было выкарыстаць толькі на час канікул. У канікулярны час студэнты маглі таксама з'ездзіць на экскурсію па зніжанаму на 25% кошту білета. Аднак рабіць гэта трэба было ў складзе груп. Практыкавалася, у працы рабочых факультэтаў і пасылка студэнтаў у дамы адпачынку, з поўным дзяржаўным забеспячэннем. Акрамя гэтага студэнт мог паехаць на курорт, атрымаўшы на рабфаку для гэтай паездкі пэўную суму грошай. Так, у маі 1929 года студэнты Віцебскага рабфаку Равякова, Осман былі накіраваны ў дом адпачынку. Студэнт Багдановіч атрымаў 60 рублёў, а Карбут 50 для паездкі на курорт [5]. Канешне, такія магчымасці мелі не ўсе. Справу вырашаў прэзідыум рабфака. Улічвалася паспяховасць і стан здароўя. Такім чынам, на канец 1920-х гадоў студэнты рабфакаў былі нядрэнна сацыяльна абаронены.

Адным з адмоўных момантаў у працы Віцебскага рабфака быў класавы падыход да фарміравання студэнцкага кантынгенту. Ён вытрымліваўся не толькі падчас набору студэнтаў, але і ў час навучання. Калі, напрыклад, высвятлялася, што бацькі студэнта-вяскоўца пераводзіліся ў катэгорыю заможных падаткаплацельшчыкаў, яго выключалі з ліку студэнтаў.

Такім быў пачатак Віцебскага рабочага факультэта. Ужо ў пачатку свайго існавання рабфак засведчыў сваю дзеяздольнасць і пераўтварыўся ва установу, якая магла вырашаць агульнаадукацыйныя і сацыяльна-палітычныя задачы. Менавіта гэтыя задачы і ставіла перад рабфакамі тагачаснае кіраўніцтва краіны.


1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф.796, воп. 1, спр. 12, арк. 1.
2. Там жа, спр. 7, арк. 37.
3. Там жа, спр. 11, арк. 16.
4. Там жа, спр. 5, арк. 28, 46.
5. Там жа, спр. 5, арк. 7.
6. Раманава, І. Рабочыя факультэты ў БССР у 20-ыя гады / І. Раманава // Адукацыя і выхаванне. – 1998. – № 8. – С. 111 – 118.
7. Чудаеў, М. З гісторыі рабочагафакультэта БДУ імя У.І. Леніна / М. Чудаеў // Веснік БДУ. Сер. 3. – 1976. – № 1. – С. 15 – 18.
8. Чудаеў, М. Рабочыя факультэты Беларусі ў гады рэканструкцыі народнай гаспадаркі і першых пяцігодак (1927 – 1938 гг.) / М. Чудаеў // Веснік БДУ. Сер. 3. – 1976. – № 2. – С. 25 – 29.

**Плытник Е.Г.**

# ПРОФЕССИОНАЛЬНАЯ ПОДГОТОВКА СОТРУДНИКОВ ВИТЕБСКОЙ ГУБЕРНСКОЙ МИЛИЦИИ В 1920-е гг.

В наше время появляется множество публикаций по истории правоохранительных органов. Однако главный интерес исследователей обычно сосредоточен на вопросах внутренней организации и борьбе с преступностью, как основной функции милиции и иных силовых структур. В данной работе мы постараемся рассмотреть историю развития профессионального обучения сотрудников Губернской милиции г. Витебска, так как вопрос подготовки милицейских кадров в регионах является малоисследованным. В основу этой статьи была положена работа И.А. Абрамовой, а также документы Государственного архива Витебской области.

В Российской империи в системе подготовки сотрудников правопорядка действовало 14 губернских школ урядников (чины сельской полиции), где они получали первоначальную юридическую подготовку. При сыскных отделениях работали двухмесячные курсы, в которых будущие сыщики из числа полицейских изучали государственное и полицейское право, уголовное законодательство, судебную медицину, приемы самообороны, знакомились с основами криминалистики.

После Октябрьской революции политическая ситуация в стране привела к разгулу преступности, из-за развала существовавшей полицейской системы вновь организованная милиция была еще не в состоянии противостоять преступникам, во многом из-за отсутствия профессионализма и опыта. В условиях гражданской войны прежняя система профессиональной подготовки сотрудников правоохранительных органов прекратила своё существование. Следовательно, возникла насущная необходимость создания собственной системы профессиональной подготовки и воспитания с ее помощью образцового охранника общественного спокойствия и порядка.

С этой целью в штаты милиции вводились должности военных инструкторов. Также уже в декрете СНК «О советской рабоче-крестьянской милиции» от 3 апреля 1919 г. предусматривалось обязательное обучение военному искусству. С целью повышения общеобразовательного уровня в г. Витебске и уездных городах организовывались библиотеки, избы-читальни. Так, например, в г. Витебске в 1920 г. была организована библиотека для милиционеров имени убитого на фронте белогвардейцами милиционера И.И. Картоля [1, с. 110].

Особая ответственность за проведение просветительской работы была возложена на политические органы. В 1920 году в штатах губернского и уездных управлений витебской милиции была введена

должность политсекретаря. Несмотря на напряжённость работы, устраивались коллективные просмотры киносеансов, театральных представлений. Среди неграмотных и малограмотных сотрудниками политсекретариата проводились громкие читки газет. При этом прочитанное комментировалось, а также подробно разъяснялась суть политических событий в стране и за рубежом.

В начале 1920-х гг. в Витебской губернии были организованны специальные 2-х месячные курсы для подготовки командного состава. 11 апреля 1921 г. в Главное Управление милиции БССР была направлена программа курсов, а также смета на их содержания, которая включала зарплату 5 лекторов. Во вступлении говорится о том, что курсы организуются «…с целью пополнения рядов опытными и подготовленными сотрудниками…» [5, л. 3]. Рассчитаны занятия были на 70 человек. В программе курсов были расписаны 8 недель занятий, первая неделя была идеологически-просветительская. Также за время обучения милиционеров знакомили с судопроизводством, делопроизводством, теорией обыска. Отдельно предусматривались занятия по фотографированию и дактилоскопированию. На последней неделе предусматривалась проверка знаний учащихся и почетный выпуск с парадом и митингом. Ежедневно после теоретических занятий проводилась строевая подготовка [5, л. 4].

Однако в работе курсов возникли некоторые объективные сложности. Из-за недостаточного финансирования занятия откладывались, не было возможности снять помещения. Плюс ко всему не все понимали важность данных курсов, да и неспокойная ситуация в стране привела к тому, что не всегда была возможность направлять милиционеров на подобные занятия. В архиве хранится доклад начальника Сенненского района за апрель 1921 г., в котором говорится о том, что от каждого района будут высланы по 1 старшему милиционеру, но из-за неблагоприятной ситуации на местах и повышения преступлений курсанты будут обучаться сроком не более 1 месяца, а по истечении данного времени будут заменены другими лицами [5, л. 5].

Но всех перечисленных мер было явно недостаточно для поднятия общего уровня образованности сотрудников, тем более в 1922 г. по Витебской губернии была проведена «чистка кадров». Со службы были выгнаны неблагонадежные элементы: за пьянство, политическую неблагонадежность, привлечения к суду и взятки [4, л. 1 – 3]. Отдельно стоит упомянуть и о следующем факте, который неблагоприятным образом сказался на общем уровне подготовленности милиции в 1920-х гг. В 1922 г. поступило распоряжение об откомандировании в полевые части Красной Армии сотрудников милиции, рожденных в эти годы, и заменой их красногвардейцами 1896 – 1897 годов. Тем не менее, не учитывался тот факт, что люди были подготов-

лены к работе, опытные, не первый год служившие. В ответе на телеграмму вышестоящего начальства начальник Витебского губернского отдела уголовного розыска отмечал, что «среди рядовых красноармейцев сложно найти лиц, которые с пользой для дела могли бы успешно работать в уголовном розыске, где требуются люди хорошо усвоившие грамматику и достаточно развитые, чтобы энергично бороться с уголовной преступностью… лица 1900 – 1901 годов имеют наилучшие характеристики и их уход со службы, несомненно, отзовется на деятельности Уголовного Розыска в смысле понижения процента раскрываемости преступлений…» [3, л. 40]. Всё это сделало проблему профессиональной подготовки сотрудников милиции ещё более острой.

В то же время, попытки внедрения курсов по специализированной подготовке сотрудников, имевшие место в самом начале 1920-х гг., были недостаточно эффективными. Они рассчитывались на командный состав и мели ограниченное число курсантов. Таким образом, необходимо было создание специализированного учреждения, которое помогло бы решить вопрос о нехватке высококвалифицированных кадров в Губернской милиции.

С этой целью было принято решение об открытии при Витебском губернском управлении советской школы милиции для подготовки младшего командного состава. Школа милиции была сформирована по первому разряду согласного приказу от 1922 года. За основу при организации школы был взят опыт Петрограда. 15 декабря 1922 года приступили к занятиям. Первые курсанты были набраны из состава младших милиционеров уездной милиции. Часть из них была направлена от профсоюзных и партийных организаций. Преподавательский коллектив включал 12 человек [1, с. 111].

Курсанты, в зависимости от уровня подготовки, делились на два отделения. Менее подготовленные начинали своё обучение в младшем отделении. В этом курсе изучали следующие общеобразовательные предметы: русский язык, арифметику, географию, природоведение, основы Конституции. Из специальных предметов: политграмота, строевой устав, уличный бой, пулемётное и гранатное дело, стрелковое дело, дисциплинарный устав, гимнастика и способы самозащиты. На старшем отделении также преподавали предметы общеобразовательного характера. И, конечно, более углублённо велось преподавание специальных предметов, которые изучались не только теоретически, но и практически. В первых числах ноября 1923 года состоялся первый выпуск [1, с. 112]. И преподаватели, и курсанты сталкивались с большими трудностями, так как не хватало учебников и учебных пособий. Однако следует отдать должное большому энтузиазму коллектива школы. Нехватку учебников компенсировали лекторы, имевшие большой профессиональный опыт и подготовку. Например, в качестве

преподавателя истории был приглашён известный в г. Витебске коллекционер и знаток военной истории Антон Бродовский [1, с. 112].

С некоторыми перерывами витебская школа милиционеров продолжала свою деятельность до начала Великой Отечественной войны. Обучение в школе милиции хоть и велось разнопланово, в то же время не охватывало всех тех областей и ситуаций, с которыми приходилось сталкиваться в работе милиционеру. Многое приходилось постигать на личном опыте, посещать специализированные курсы, знакомится с нововведениями самостоятельно. Однако, несмотря на всё это, появление в Витебске специального образовательного учреждения, готовившего кадры для правоохранительных органов губернии, можно считать положительным фактом, свидетельствовавшим о том, что руководство страны искало наиболее оптимальный путь профессиональной подготовки милиционеров и активно решало данную проблему.

1. Абрамова, И.А. Витебская губернская милиция (1917 – 1924 гг.) / И.А. Абрамова. – Б.м., б.г.
2. Государственный архив Витебской области (ГАВО), ф. 7, оп. 1 д. 110;
3. ГАВО, ф. 7, оп. 1, д. 38;
4. ГАВО, ф. 7, оп. 1, д. 188;
5. ГАВО, ф. 7, оп. 1, д. 111;
6. История милиции Белорусской ССР (1917 – 1967): Краткий очерк. – Мн., 1967.

**Карпекін К.Р.**

## АНТЫХЕДЭРНЫЯ КАМПАНІІ 1920-х гг. ЯК ЭЛЕМЕНТ ПРАЦЭСУ СТАНАЎЛЕННЯ СІСТЭМЫ САВЕЦКАЙ АДУКАЦЫІ (ПАВОДЛЕ МАТЭРЫЯЛАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ)

У 1920-я гг. на тэрыторыі Віцебшчыны пражывалі прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў, у тым ліку і яўрэі. Паводле дадзеных 1923 г., апошнія складалі 35 – 75 % ад агульнай колькасці жыхароў гарадоў і мястэчак. Яўрэі мелі сваю традыцыйную сістэму адукацыі, асноўным звяном якой з’яўляўся хедэр – пачатковая школа, дзе навучаліся пісьменнасці і асновам іудзейскай веры. З усталяваннем на тэрыторыі Беларусі савецкай улады працэс станаўлення новай сістэмы адукацыі прыйшоў у сутыкненне з традыцыйнай адукацыяй, існуючай у яўрэйскім асяроддзі.

Мэтай дадзенага даследавання з’яўляецца аналіз антыхедэрных кампаній 1920-х гг. на Віцебшчыне, якія былі складовай часткай працэсу станаўлення савецкай сістэмы адукацыі. Для гэтага неабходна вызначыць прычыны закрыцця хедэраў, шляхі ліквідацыі сеткі гэтых

навучальных установ, а таксама акрэсліць выніковасць антыхедэрных кампаній.

Комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на скарачэнне ролі рэлігійнай адукацыі на савецкіх тэрыторыях, у тым ліку і на Віцебшчыне, падмацоўваўся заканадаўчымі дакументамі. Найперш – дэкрэтам СНК "Аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы" (23 студзеня 1918 г.). Паводле дэкрэта, забаранялася выкладанне рэлігійных вучэнняў у дзяржаўных, грамадскіх і прыватных навучальных установах, дзе выкладаліся агульнаграмадскія дысцыпліны. Увогуле, савецкія законы прадугледжвалі, што любая асоба, старэйшая за 18 гадоў можа навучацца рэлігіі, але толькі прыватным чынам. Адпаведна, маладзейшым за 18 гадоў выкладанне рэлігіі забаранялася. 16 верасня 1922 г. на аснове савецкага заканадаўства Віцебскім губернскім выканаўчым камітэтам была прынята абавязковая пастанова, паводле якой на тэрыторыі губерні ўсе яўрэйскія рэлігійныя школы, у тым ліку і хедэры, трэба было зачыніць у 3-дзённы тэрмін, а меламедам (выкладчыкам хедэраў) – зарэгістравацца на працягу 7 дзён. У выпадку, калі б улады выявілі, што нехта працягвае навучаць дзяцей рэлігіі, то яму б пагражала судовая адказнасць. Такім чынам, на Віцебшчыне пачалося закрыццё хедэраў.

Магчыма вылучыць дзве асноўныя прычыны разгортвання антыхедэрных кампаній. Па-першае, хедэры ўспрымаліся савецкай уладай як асяродкі распаўсюджвання іудзейскіх традыцый, перадачы іх падрастаючаму пакаленню. У сваю чаргу іудзейскія традыцыі бачыліся савецкай уладзе "клерыкальна-нацыяналістычнымі", гэта значыць спрыяючымі адасабленню яўрэяў ад удзелу ў развіцці савецкага грамадства. На думку бальшавікоў, прызвычайванню дзяцей да новага ладу маглі спрыяць толькі савецкія школы. Па-другое, з пункту погляду савецкага ўраду, хедэры, як і іншыя іудзейскія навучальныя ўстановы і сінагогі, з'яўляліся арганізацыйнымі цэнтрамі антысавецкай дзейнасці, апорнымі пунктамі гэтак званага клерыкалізму (пад клерыкалізмам у 1920-я гг. разумелася распаўсюджанне сацыяльна-палітычнага ўплыву рэлігійных арганізацый на насельніцтва).

Антыхедэрныя кампаніі на Віцебшчыне мелі месца з пачатку 1920-х гг. Сутнасць дадзеных кампаній заключалася ў дэталёвым абследаванні навучальных установ, публічнай іх крытыцы з далейшым пераводам дзяцей у савецкія школы. Дзеля згаданай мэты да канца 1921 г. была распрацавана спецыяльная анкета, якая ўключала 17 пунктаў: 1) месцазнаходжанне хедэра, 2) колькасць навучэнцаў (хлопчыкаў і дзяўчынак), 3) узрост дзяцей, 4) сацыяльнае становішча бацькоў, 5) санітарны стан хедэра, 6) у якім памяшканні размяшчаецца хедэр (у прыватным альбо малітоўным), 7) колькі гадзін доўжацца заняткі, 8) якія дысцыпліны вывучаюцца, 9) у які час хедэр адчынены,

10) імя і прозвішча меламеда, 11) колькі яму гадоў, 12) чым займаюцца меламеды акрамя выкладання ў хедэры, 13) чым займаліся меламеды да адкрыцця хедэра, 14) адукацыя меламеда, 15) ці з'яўляецца меламед членам якога-небудзь саюза, арганізацыі, 16) ці ведае меламед рускую мову, арыфметыку, іншыя прадметы, 17) заключэнне камісіі па выніках абследавання хедэра [1, арк. 13 – 13 адв.]. Паводле гэтай анкеты спецыяльныя камісіі пачалі збор матэрыялаў пра хедэры Віцебшчыны. У камісіі ўваходзілі прадстаўнікі ўлад, настаўнікі яўрэйскіх школ, а непасрэдна ў Віцебску – яшчэ і навучэнцы Яўрэйскага педагагічнага тэхнікума і Камуністычнага універсітэта. Паводле вынікаў абследавання аказалася, што ў 1922 г. у адным толькі Віцебску ў хедэрах навучалася больш за 1 тыс. дзяцей. На працягу студзеня – красавіка 1922 г. нязначная частка гэтых дзяцей (175) была ўладкавана ў 2 яўрэйскія школы (№№ 6 і 33), астатніх меркавалася ўладкаваць у школы №№ 7 і 8.

На працягу 1922 г. аналагічныя захады ажыццяўляліся не толькі ў Віцебску, але і ў Бешанковічах, Оршы, Полацку.

Савецкай уладай прымаліся меры па правядзенні агітацыйных мерапрыемстваў супраць хедэраў. Адной з найбольш прыкметных кампаній стаў "суд над хедэрам", які праходзіў у студзені 1921 г. у Віцебску. Згодна з "Справаздачай Цэнтральнага Бюро яўрэйскай секцыі РКП(б)", "... ён працягваўся некалькі дзён, зацягваючыся да позняй ночы і прывабліваючы да сябе шматтысячныя масы насельніцтва. Яму быў прысвечаны шэраг спецыяльных бюлетэняў, якія выпускаліся яўсекцыяй. Прысуд, юрыдычна абгрунтаваны і вельмі змястоўны, вынесены быў а 5-й гадзіне раніцы пры напружанай увазе ўсёй шматтысячнай аудыторыі і самых сур'ёзных адносінах да гэтага прысуду" [2, арк. 99]. Як зазначалася ў дадзенай справаздачы, для азнаямлення насельніцтва Віцебшчыны з ходам гэтага мерапрыемства была выпушчана брашура "Суд над хедэрам" (на 112 старонак). Надалей антыхедэрныя кампаніі асвятляліся ў перыядычным друку, што павінна было сфармаваць адмоўнае стаўленне яўрэйскага насельніцтва да хедэраў і адначасова паспрыяць пераводу дзяцей у савецкія школы.

Акрамя агітацыйных захадаў, савецкай уладай былі прыняты некаторыя меры па паляпшэнні матэрыяльнага становішча школ. У яўрэйскіх школах Віцебшчыны, куды пераводзіліся дзеці з зачыненых хедэраў, праводзіўся рамонт памяшканняў: зашкляліся вокны, здабывалася паліва для ацяплення і да т.п. Прыкладам клопату пра новых навучэнцаў можа быць і пастанова пасяджэння яўрэйскага бюро Віцебскага губернскага аддзела народнай адукацыі, прынятая 30 сакавіка 1922 г. У гэтай пастанове адзначалася, што "прымаючы пад увагу абсалютную адсутнасць абутку, а часам і вопраткі ў дзяцей, трэ-

ба прасіць Яў(рэйскі) грам(адскі) кам(ітэт) у інтарэсах замацавання вынікаў праведзенай работы і далейшага паспяховага пераводу дзяцей з хедэраў, аказаць магчымую матэрыяльную дапамогу" [4, арк. 25]. Такім чынам, стаўка рабілася на тое, што дзеці і іх бацькі, значная частка якіх мела зусім малы заробак, аддадуць перавагу добрым умовам, а не зместу навучання, і гэта будзе трымаць дзяцей у савецкіх школах. Акрамя паляпшэння матэрыяльных умоў, у сувязі з павелічэннем колькасці вучняў, у яўрэйскія школы накіроўваліся новыя настаўнікі. Там, дзе настаўніцкіх кадраў не хапала, для былых навучэнцаў хедэраў новыя групы не ствараліся: дзеці залічваліся ва ўжо існуючыя групы. Натуральна, празмерна вялікая колькасць вучняў адмоўна адбівалася на якасці навучання.

Нягледзячы на ўсю праводзімую працу, хедэры на тэрыторыі Віцебшчыны працягвалі функцыянаваць. Пра гэта сведчаць пастановы агітацыйна-прапагандысцкіх аддзелаў Аршанскага, Віцебскага і Полацкага акруговых выканаўчых камітэтаў сярэдзіны 1920-х гг., у якіх зазначалася пра неабходнасць узмацнення працы па закрыцці яўрэйскіх рэлігійных школ. Для такіх пастаноў сапраўды была нагода: у 1925 г. хедэры дзейнічалі ў Сянно, у 1926 г. – у Валынцах, Чашніках, у 1927 г. – Оршы, Сіроціне (тут налічвалася 15 дзяцей), Дуброўна, 3 хедэры ў Лядах, у 1928 г. – у Гарадку. Значыць, на працягу ўсіх 1920-х гг. у асяроддзі яўрэйскага насельніцтва Віцебшчыны існавала праблема выбару паміж традыцыйнай іудзейскай адукацыяй і савецкай школай. У значнай колькасці выпадкаў яўрэі імкнуліся да таго, каб іх дзеці наведвалі хедэры (нават адначасова з савецкімі школамі). Магчыма вылучыць некалькі прычын такой з'явы. Па-першае, далёка не ўсе яўрэйскія савецкія школы валодалі патрэбнай матэрыяльнай базай: не ў дастатковай меры забяспечваліся неабходным абсталяваннем, літаратурай на яўрэйскай мове. Многія школы не мелі ўласных будынкаў, таму памяшканні даводзілася арандаваць і прыстасоўваць пад вучэбныя класы. Такое становішча выклікала ў яўрэяў меркаванне, што сферы нацыянальнай адукацыі надаецца недастаткова ўвагі. Па-другое, навучанне ў савецкай школе падштурхоўвала дзяцей да ігнаравання іудзейскіх свят і святочных дзён. Пад час свят заняткі ў школе не спыняліся, а выхадным днём з'яўлялася нядзеля, а не субота. Па-трэцяе, меламеды ішлі па шляху прыстасавання да новых умоў. Напрыклад, у некаторых хедэрах уводзілася вывучэнне прыродазнаўчых дысцыплін, пасля забароны дзейнасці хедэраў меламеды пераходзілі да хатняга навучання дзяцей ці да навучання дзяцей у малых групах (да 3-х чалавек) [3, арк. 78 – 79]. Такая практыка задавальняла яўрэяў і яны аддавалі перавагу хедэрам, якія ў выніку стваралі моцную канкурэнцыю савецкай школьнай сістэме.

Такім чынам, антыхедэрныя кампаніі былі непасрэдна звязаны з працэсам стварэння савецкай сістэмы адукацыі. Прызвычайванне маладога пакалення да іудзейскіх традыцый прыходзіла ў сутыкненне з савецкім выхаваннем. Гэтая акалічнасць і абумовіла той факт, што на працягу ўсіх 1920-х гг. у гарадах і мястэчках Віцебшчыны ішло прымусовае скарачэнне хедэраў.


1. Переписка с Оршанским унаробразом о состоянии учреждений по просвещению в уезде, список работников еврейских детских домов и культурно-просветительных учреждений города // Государственный архив Витебской области (ГАВО). Ф. 246. Оп. 1. Д. 325.
2. Протоколы заседаний бюро и отчёты Главного бюро евсекции при ЦК РКП(б), переписка с укомами РКП(б) // ГАВО. Ф. 10050-п. Оп. 1. Д. 347.
3. Протоколы заседаний евбюро Оршанского окружкома КП(б)Б. Отчёт о работе евбюро и итоги проведения райпартконференции еврейской трудовой молодёжи, обследования еврейских местечковых школ // ГАВО. Ф. 10062-п. Оп. 1. Д. 372.
4. Протоколы заседаний (подлинники) и отчёты о работе еврейского бюро просвещения Витгубоно за 1922 г. // ГАВО. Ф. 246. Оп. 1. Д. 324.


**Герасімчык В.У.**

## ЖАНОЧАЯ СЕМІНАРЫЯ ІМЯ М. ДАРОЎСКАЙ У СЛОНІМЕ (1919–1936)

Прыватная настаўніцкая жаночая семінарыя імя Маткі Марцэліны Дароўскай у Слоніме пачала сваю дзейнасць у 1919/1920 годзе і спыніла існаванне пасля 1935/1936 навучальнага года ў сувязі з ліквідацыяй у Другой Рэчы Паспалітай вучэбных устаноў кляштарнага тыпу.

Семінарыя знаходзілася ў кляштары ордэна сясцёр Бязгрэшнага зачацця. Лёс семінарыі быў цесна звязаны з гэтым будынкам. Першапачаткова ў ім размяшчаліся бернардынкі, для якіх за сродкі вількамірскай падкаморыны Катарыны Камароўскай у 1645 годзе быў выкуплены вялікі драўляны дом, перароблены на кляштар. У хуткім часе побач быў пабудаваны касцёл Бязгрэшнага зачацця Найсвяцейшай Паны Марыі. Але ў 1670 годзе пажар знішчыў драўляныя касцёл і кляштар, замест якіх у 1696 годзе ў Слоніме былі пабудаваны каменныя, дзе знайшлі сабе месца 20 законніц. Кляштар бернардзінак знаходзіўся ў Слоніме да падзей паўстання 1863-1864 гг., пасля якога па загаду расійскага ўрада ён быў зачынены, як і многія іншыя, але пры ім працягвалі жыць бернардынкі. У пачатку XX ст. у горадзе жылі толькі некалькі сясцёр ордэна бернардынак, што паставіла пад пагрозу само існаванне гэтай ячэйкі каталіцызму. Таму кляштарны ксёндз Рычард Клам у лютым 1906 года звярнуўся да Маткі Марцэліны Дароўскай з просьбай накіраваць у Слонім некалькі законніц, што і

было зроблена ў студзені 1907 года, калі ў горад прыбылі дзве першыя непакалянкі – сястра Ваўжына Шашкевіч, якая пазней стала старэйшай сястрой згуртавання, і сястра Людвіка Дабраньска (у манастве – Тэрэзія), да якіх далучылася сястра Марыя Касцюшка (у манастве – Фадзея), пазней старэйшая сястра Слонімскага кляштара.

Скарыстаўшыся загадам імператара Мікалая II ад 1905 года, сёстры звярнуліся з просьбай да Віленскага губернатара аб дазволе на "будаўніцтва" [2, арк. 2] кляштару ў Слоніме, які і атрымалі. Адным з першых пачынанняў непакалянак стала арганізацыя школы, у якой некалькі дзяўчынак навучаліся агародніцтву, пранню, гатаванню і сыраварэнню, крою і шыццю. Нягледзячы на адсутнасць дазволу з боку афіцыйных улад, патаемна адбываліся лекцыі па рэлігіі, польскай мове і гісторыіі. Але ў 1914 годзе гэтая дзейнасць была спынена.

Пад час вайны кляштар прытуліў у сваіх сценах вялікую колькасць бежанцаў, якіх рускія войскі прымушалі пакідаць свае родныя мясціны і адпраўляцца ў глыб Расіі. У кляштары хаваліся каля 40 дзяцей, якія пазней, у 1918 годзе, былі перавезены ў Альбертын і Жыровіцы. У кляштары пад час вайны знаходзіўся шпіталь, у якім разам з персаналам працавалі сёстры-непакалянкі.

Падчас акупацыі Слоніма немцамі, якія хацелі паказаць сябе ў пэўнай ступені больш талерантнымі, чым рускія, ксёндз Клам, як слонімскі бурмістр, дабіўся ад іх дазволу на адкрыццё першай "польскай школы" [2, арк. 2]. Яна пачала працу з мая 1916 года на падставе праграмы сярэдняй школы імя Сташыца ў Варшаве. У першай палове дня яе наведвалі 65 хлопчыкаў, а ў другой – 82 дзяўчынкі. Дырэктарам школы быў ксёндз Клам, але ўжо ў лістападзе 1917 года ён перадаў жаночую школу пад апякунства сясцёр-непакалянак, пакінуўшы сабе толькі кіраўніцтва мужчынскай школай. Дзве гэтыя школы знаходзіліся ў кляштарным будынку.

У сакавіку 1918 года памёр ксёндз Клам. Яго замяніў ксёндз Станіслаў Смялоўскі, які ўвёў у школе праграму гімназіі. Працу ў дадзеным накірунку спыніла вайна з бальшавікамі. Але ў пасляваенны час, дзякуючы ініцыятывам сясцёр-непакалянак, у горадзе меліся кадры і магчымасці для адкрыцця пры кляштары Бязгрэшнага зачацця жаночай семінарыі.

Жаночая семінарыя ў Слоніме пачала сваю дзейнасць у кастрычніку 1919 года, на месяц пазней запланаванага, у сувязі з рамонтам кляштару і дэзынфекцыяй былых памяшканняў шпіталя. Навучанне пачалося на трох курсах семінарыі, а ў 1922/1923 навучальным годзе з'явіліся яшчэ два. Такім чынам, тэрмін навучання ў семінарыі склаў пяць гадоў. Пры семінарыі дзейнічала агульная пяцікласная школа, якая пазней стала дзяржаўнай. Навучанне адбывалася па праграмах Міністэрства Рэлігійных Веравызнанняў.

Набор першага года існавання семінарыі склаў 9 вучаніц: 1-ы курс – 6, 2-і – 2, 3-і – 1. У сувязі з савецка-польскай вайной, навучанне прыпынілася. Працу семінарыя аднавіла пасля вяртання сясцёр-непакалянак з Памор'я 3 студзеня 1921 года і абрання першай дырэктаркі – Хелены Саподзька (у манастве – Моніка). Да чэрвеня 1921 года вучаніцы заставаліся на тых самых курсах, на якіх іх сустрэла вайна. У 1922/1923 годзе семінарыю з дадатным вынікам скончылі тры першыя абітурыенткі. Семінарыя афіцыйна атрымала назву "Прыватная настаўніцкая жаночая семінарыя імя Маткі Марцэліны Дароўскай" і магчымасць дзейнічаць на правах дзяржаўнай семінарыі на наступны год.

Ужо ў 1923/1924 навучальным годзе колькасць вучаніц на пяці курсах дасягнула лічбы 103: 1-ы – 28, 2-і – 21, 3-і – 31, 4-ы – 16, 5-ы – 7. Гэтаму садзейнічала адкрыццё пры семінарыі інтэрната пад кіраўніцтвам Рэўкоўскай Ядзігі (у манастве – Натанаэла), дзе жылі 40 вучаніц. У далейшым колькасць вучаніц павялічвалася і ў 1925/1926 навучальным годзе дасягнула колькасці ў 225 семінарыстак. Больш 20-ці дзяўчын штогод скончвалі семінарыю, многія з іх з адзнакай "дадатна" па ўсіх прадметах. У сувязі з павелічэннем колькасці семінарыстак на курсах было вырашана падзяліць іх на групы.

У першы год дзейнасці семінарыі вучаніцы мелі магчымасць пазнаёміцца з прадметамі, якія выкладаліся адзінаццаццю сёстрамі-непакалянкамі, па рэлігіі, нямецкай і французскай мовах, маляванню і спевам, працоўнаму навучанню, прыродзе і геаграфіі. У 1923/1924 навучальным годзе новая дырэктарка семінарыі Ёзэфа Чарноўская стала выкладаць фізіку, хімію і касмаграфію, Марыя Касцюшка – рэлігію і методыку педагагічнай падрыхтоўкі, Рэўкоўская Ядзвіга – біялогію і спеў, Дабжаньская Аляксандра (у манастве – Ада) – геаграфію, Фалтыноўская (у манастве – Эдварда) – працоўнае навучанне, Домброўская Ёзэфа пасля заканчэння матэматычна-фізічнага факультэта ў Варшаўскім універсітэце выкладала матэматыку, Яніна Ельская – гігіену. Своеасаблівая ўвага надавалася польскай мове і польскай гісторыі, якія выкладаліся на ўсіх курсах некалькімі сёстрамі-настаўніцамі.

Паступова стаў змяняцца настаўніцкі склад семінарыі: на змену сёстрам з сярэдняй адукацыяй прыходзілі сёстры з вышэйшай адукацыяй. Гэта адбывалася не толькі за кошт замены асабовага складу настаўніц семінарыі, але і па прычыне павышэння ўзроўню адукацыі сёстрамі. Так, Саподзька Хелена пасля сярэдняй школы закончыла вышэйшыя курсы імя Бараніцкага ў Кракаве, а ў 1926 годзе атрымала дыплом паланістыкі.

Семінарысткі мелі актыўную грамадзянскую пазіцыю, а кіраўніцтва семінарыі садзейнічала іх працы на глебе даследаванняў гісторыі роднага краю. Так, па ініцыятыве Слонімскага аддзела ПТК

пры семінарыі пачаў працу краязнаўчы гурток з 12 асоб. У 1932 годзе яго сяброўкі арганізавалі 4 экскурсіі: у Варшаву на злёт (30 красавіка, 18 асоб), у Вільню (30 верасня, 22 асобы), у Жыровічы (15 кастрычніка, 50 асоб), у Грыбава (1 лістапада, 40 асоб). Сяброўкі гуртка раздавалі жыхарам горада матэрыялы краязнаўчага характару, удзельнічалі ў ахове помнікаў культуры і прыроды, збіралі і выконвалі беларускія народныя песні. Зацікаўленасцю гуртка стала вывучэнне народнага адзення, на падставе варыяцыяў якога яны зрабілі калекцыю лялек [1, арк. 19]. Прадстаўніцы гуртка аказвалі вялікую дапамогу Слонімскаму музею. У пісьме ад 13 сакавіка 1933 года да Ады Дабжынскай, апякункі семінарыі, кіраўніцтва Слонімскага аддзелу ПКТ "сардэчна дзякуе за бескарыслівую працу" членак кола — Ірыну Славенскую, Пялагію Бяднашчыкаву і Зянобію Анджэяўскую [1, арк. 23].

Апошнім навучальным годам для слонімскай жаночай семінарыі стаў 1935/1936 навучальны год. Нягледзячы на спыненне сваёй дзейнасці дасягненні сясцёр-непакалянак на глебе адукацыі сталі важкім укладам у пашырэнні адукацыйнай прасторы на тэрыторыі Заходняй Беларусі.


1. Переписка, протоколы собраний, отчёты о работе Слонимского краеведческого общества и его организаций. Обращение в связи с открытием музея 20.09.29 г. и приездом в г. Слоним президента Польши // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф. 551. Воп.1 Спр.42. Арк.1 – 41.
2. Справка по истории возникновения семинарии // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф. 566. Воп.1 Спр.1. Арк.1 – 15.



**Бахір Ю.М., Цімафееў Р.У.**


## ДЗІСНЕНСКАЯ ГІМНАЗІЯ (1921–1939 гг.) І ЯЕ ЧАСОПІС "НАШ ГОЛАС"

Сёння існуе даволі шмат малавядомых аспектаў гісторыі. Адным з іх з'яўляецца гісторыя існавання Дзісненскай гімназіі у 1921 – 1939 гг. Дзісна – зараз гэта горад у Міёрскім раёне Віцебскай вобласці. Да 1900 г. у Дзісне не было сярэдняй школы. Першай установай такога тыпу стала прагімназія Барбары Дзімітравай і Веры Лішынай, якая існавала два гады. У 1908 – 1909 гг дзейнічала новая гімназія Палагеі Навіцкай, таксама меўшая чатыры класы і перастаўшая існаваць з-за недахопу сродкаў. У 1906 г. з'явілася патаемная польская школа ў доме пані Снарскай. У 1917 г. па ініцыятыве дзісенца Казіміра Русецкага ўтвараецца камітэт прыватнай гімназіі з рускай і абавязкова з польскай мовамі. У 1918 годзе падчас нямецкай акупацыі пачынае працаваць польская прагімназія на чале з дырэкта-

рам Бургартам. І, нарэшце, у 1921/22 навучальным годзе пачала дзейнічаць гімназія. Яна была створана па прапанове доктара Т.Станеўскага і атрымала нумар 925 [2, с. 203]. Гімназія адыграла важную ролю ў распаўсюджванні асветы сярод гарадскога насельніцтва і бліжэйшых тэрыторый, далучаных да Польшчы.

Як успамінае выпускніца Дзісненскай гімназіі В.Ф. Каўчыньска (Вярховіч) у артыкуле Чэнстахоўскай газеты "Нядзеля" (Польшча), перакладзеным на беларускую мову і змешчаным ў кнізе "Памяць" Міёрскага раёна, пачатак функцыянавання гімназіі быў цяжкім. Вялікая колькасць жадаючых вучыцца патрабавала ад кіраўніцтва гімназіі вырашэння шматлікіх гаспадарчых, арганізацыйных і кадравых пытанняў [1, с. 3]. Дзеля размяшчэння вучэбнай установы былі перабудаваны і прыстасаваны для заняткаў памяшканні былой рускай турмы. Там з'явіліся: гімнастычная зала, майстэрня ручной працы са станкамі, кабінет біялогіі і батанічны сад. У гімназіі склаўся добры педагагічны калектыў, не гледзячы на тое, што прыцягнуць у глыбінку людзей з універсітэцкай адукацыяй было нялёгка [2, с. 200]. Гуманітарныя прадметы выкладаліся на высокім узроўні. Замежныя мовы вывучаліся па выбару, толькі лацінская была абавязковай. Выкладаў яе прафесар І. Валашчук [1, с. 3].

Гімназія ў Дзісне давала разнастайныя трывалыя веды. Апекуном з'яўляўся ксёндз Рыгор Пірамовіч. Таму нічога дзіўнага, што 7 выпускнікоў выбралі духоўны шлях (у іх ліку 5 ксяндзоў, 1 епіскап і начальніца сясцер-назарацянак ў Ларэта (Італія). Сярод іншых – ўрачы, фармацэўты, пісьменнікі, паэты, педагогі і вучоныя. Найбольш вядомымі сталі Ян Гушча – пісьменнік і перакладчык, Дзмітрый Касаты – паэт, Яўген Забэла – ваенны ўрач, аўтар кнігі "Дзісна. Бастыён над Дзвіной", М.М. Смірын – прафесар, гісторык [1, с. 3].

Асаблівасцю працы Дзісненскай гімназіі было выданне ўласнага часопіса. Звесткі пра часопіс змешчаны ў адным з артыкулаў кнігі "Памяць", аўтар – Міхаіл Вазгірд (польскамоўны тэкст перакладзены В. Ермалёнкам). Вучнёўскае самакіраванне гімназіі "Супрацоўніцтва" пачало выдаваць часопіс "Наш голас" у 1930/ 31 навучальным годзе. Спачатку ён выходзіў раз на месяц, а з 1933 г. – двойчы. У гісторыі горада гэта было першае і адзінае друкаванае польскамоўнае выданне. Яно з'явілася па ініцыятыве дырэктара гімназіі доктара Тадэвуша Станеўскага пры падтрымцы ксяндза Сільвестра Малахоўскага. Апеку над часопісам было даручана ажыццяўляць прафесарам гімназіі Аляксандру Мацяшку, пазней – Аляксандру-Баляславу Цыпсу, Вандзе Хмялеўскай і Станіславу Станкевічу [2, с. 200].

Галоўнымі рэдактарамі часопіса заўседы з'яўляліся вучні выпускных класаў. Першы з іх – Пётр Пупін, затым Ян Гушча, Мілецій Андзіленка, Леапольд Драздовіч, Юзаф Буёнак і апошнім ў 1939 годзе стаў Генрых Пухальскі [2, с. 200]. Першы нумар "Нашага голаса" ў

1930 годзе быў надрукаваны на шклографе. Як успамінае Петр Пупін, назва адлюстроўвала "імкненне зрабіць часопіс голасам нашых меркаванняў, які б быў чутны не толькі ў Дзісне, але і ва ўсёй Польшчы. Спачатку было выдадзена 70 экзэмпляраў, затым тыраж павялічыўся да 300. У 1931 годзе часопіс друкаваўся ў Вільні (друкарня Казіміра Ліньковіча). З наступнага года выкарыстоўвалі друкарні Глыбокага (друкарні М. Казовіча і З. Шэйнбойма).

Характэрна, што на працягу 10 гадоў кошт часопіса не змяняўся і складаў 50 грошаў за нумар, 5 злотых на год з перасылкай, для вучняў – 30 грошаў за асобнік, 2,5 злотых на год з перасылкай [2, с. 202]. Таму выдаўцы ўвесь час вымушаны былі пераадольваць фінансавыя цяжкасці. "Наш голас" спачатку з'яўляўся часопісам навуковай літаратуры, а з 1934 г. – навукова-літаратурным і грамадскім. Кожны нумар часопіса адкрываўся ўступным артыкулам рэдактара, які ўтрымліваў асноўныя палажэнні аб яго мэце – займацца справамі навукі, літаратуры і грамадскага жыцця. Таму выданне стаяла на даволі высокім мастацкім і літаратурным узроўні, трымаючы чацвёртае месца па тыражу паміж школьнымі выданнямі ўсёй Польшчы [2, с. 203].

У часопісе друкаваліся артыкулы па наступных тэмах: 1) адлюстраванне ладу жыцця, звычаяў і традыцый мясцовых жыхароў як хроніку таго, што ўжо знікае (асабліва пачынаючы з 1935 г., калі пачынае пераважаць рэгіянальная тэматыка: мясцовая вёска з яе традыцыямі і будучыняй, мястэчкі, археалагічныя раскопкі); 2) пытанні гісторыі каралеўскага горада Дзісна; 3) хроніка – мясцовая і сусветная; 4) пытанні культуры; 5) мясцовыя грамадскія і гаспадарчыя справы (напрыклад, праводзілася дыскусія аб неабходнасці будаўніцтва чыгункі з Шаркаўшчыны, уносіліся прапановы добраўпарадкаваць гарадскі парк, палепшыць стан вуліц і дарог); 6) жыццё гімназіі, маладзёжных арганізацый (напрыклад, паведамлялася аб таварыстве акадэмікаў-дзіснян, старшынёй якога з'яўляўся Данат Масальскі. Куратарам арганізацыі быў Тадэвуш Чыжоўскі з універсітэта Стэфана Баторыя ў Вільні); 7) літаратурная дзейнасць навучэнцаў.

Дзякуючы даследчай дзейнасці настаўніка гісторыі Міёрскай СШ Вітольда Ермалёнка мы сёння маем магчымасць пазнаёміцца з некаторымі нумарамі выдання. Да прыкладу, часопісы № 1, 2 за 1938 г., № 4 за 1939 г., у якіх змешчаны цікавыя факты. Яўген Мончык правёў сапраўднае даследаванне сярод навучэнцаў гімназіі пра іх сацыяльнае і тэрытарыяльнае паходжанне. Так, большасць вучняў была з сем'яў, якія валодалі ўгоддзямі ў 1-10 гектараў – 29%, з валодаючых 10-20 гектарамі – 24%. А вось навучэнцаў з заможных сем'яў, якія валодалі звыш 100 га зямлі, было толькі 9%. Гэта абвяргае тое меркаванне, што ў Заходняй Беларусі адукацыю атрымлівалі толькі дзеці паноў і асаднікаў. Больш паловы вучняў паходзіла з глухіх вёсак, 30% – гарадоў тыпу Дзісны, 18% – з мястэчкаў, такіх як Язна, Пагост. З са-

мой Дзісны было больш як 25% вучняў, з Язна і Мікалаёва – звыш 17%, астатнія – з Шаркаўшчыны, Глыбокага і іншых гарадоў [3, с. 4]. Цяжка вызначыць, наколькі дадзеныя, змешчаныя ў часопісе, адпавядаюць сапраўднасці, аднак можна скласці агульнае ўяўленне аб паходжанні навучэнцаў гімназіі.

Публікацыі з рубрыкі “Арганізацыя нашага жыцця” дазваляюць прасачыць за арганізацыяй вучнёўскага самакіравання: дзейнічалі літаратурная (рэдакцыя часопіса), драматычная, спартыўная, музычная, краязнаўчыя секцыі або міністэрствы. “Святліца” займалася асветніцкай дзейнасцю, “Братняя дапамога” падтрымлівала малазабяспечаных вучняў пры набыцці падручнікаў [3, с. 4].

17 верасня 1939 года паклала канец існаванню гімназіі. У гэты дзень прафесар Зыгмунт Гергавіч, падручнік запасу і камендант горада, з 15 салдатамі, 14 вучнямі і 3 паліцэйскімі абараняў Дзісну ад батальёна савецкай пяхоты. У хуткім часе гімназія імя ксяндза Рыгора Пірамовіча стала школай-дзесяцігодкай. У час Вялікай Айчыннай вайны будынкі гімназіі захаваліся, потым тут размясцілася бальніца [1, с. 3].

Такім чынам, ў Дзісне на працягу 1921 – 1939 гадоў паспяхова дзейнічала гімназія, якая была галоўным асяродкам адукацыі ў рэгіёне, яна мела вучнёўскае самакіраванне і выдавала часопіс “Наш голас” на польскай мове. Навучальны працэс быў арганізаваны на высокім ўзроўні, што дало магчымасць выпусціць таленавітых і здольных маладых людзей – вучоных, паэтаў і грамадскіх дзеячаў.

1. Драба, В. Сярэдняя адукацыя ў Дзісне / В. Драба // Міёрскія навіны. – 2010. – 2 сакавіка. – С. 3

2. Ермалёнак, В. Знаходка, якую даўно чакалі / В. Ермалёнак // Краязнаўчая газета. – 2004. – № 6. – С. 4.

3. Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Міёрскага раёна; рэдкал.: В.І. Марціновіч (гал. рэд.) [і інш. ]. – Мн.: Бел. навука, 1998. – 630 с.

**Сендзер С.А.**

## БЕЛАРУСКАМОЎНЫЯ ПАДРУЧНІКІ Ў ПАЛІТЫЦЫ ПОЛЬСКІХ УЛАДАЎ (1919–1939)

Для разумення сітуацыі ў школьніцтве Савецкай Беларусі ў 1919-1939 гг. варта звярнуць увагу на Заходнюю Беларусь. Падручнікі з’яўляліся адной з праяваў нацыянальнай палітыкі польскіх уладаў. У дадзеным артыкуле разглядаецца ўплыў дзяржавы на працэс стварэння і выкарыстання дапаможнікаў для вывучэння беларускай мовы, дапушчаных ў пачатковай школе.

Як і ў большасці тагачасных краін, у Польшчы праводзілася цэнзура ўсіх падручнікаў. Гісторыкі зрэдку звяртаюць увагу на дапаможнікі як паўнавартасную крыніцу, якія звычайна разглядаюцца даследчыкамі методыкі выкладання ці ў кантэксце матэрыяльнага забеспячэння навучання. Апошнім часам пачынаюць аналізаваць іх змест праз прызму школьнай палітыкі і ідэалагічных канцэпцый. З увядзеннем агульнага школьнага абавязку дапаможнікі пераўтварыліся ва ўплывовы інструмент сацыяльнай інжынерыі і шырока выкарыстоўваліся ў недэмакратычных грамадствах для індакрынацыі вучняў.

Пытанне цэнзуры беларускіх падручнікаў у міжваеннай Польшчы разглядалі ў сваіх справаздannях супрацоўніцы МВіНА Г. Пахоска і Г. Гратоўска. Іх працы мелі прапагандысцкі характар і пэўныя высновы выклікаюць сумнеў. Праблемай кантроля за падручнікамі цікавіліся сучасныя даследчыкі, але акрэсленная група крыніц практычна не вывучалася. Беларускім выданням прысвяціў манаграфію Ю. Туронак, памылкова аб'яднаўшы ў адну кнігу 2 асобных дапаможніка С. Любіч-Маеўскага. Пра падручнікі для беларусаў узгадваецца ў М. Семаковіча, у працы "Народная адукацыя і педагагічная думка ў Беларусі" [1; 12; 14-17].

У школьнай палітыцы можна вылучыць перыяды панавання ідэалогій нацыянальнага выхавання (1919–1926), дзяржаўнага выхавання (1926–1935) і сінтэза гэтых плыняў у форме нацыянальна-грамадзянскага выхавання. Толькі ў 1926–1935 гг. фармальна ўлічвалася права асобных меншасцей на захаванне і развіццё культурнай своеасаблівасці. У 1928–1930 гг. адбыўся зварот да канцэпцыі нацыянальнай асіміляцыі беларусаў. У 1930-х гг. перамагла канцэпцыя рэгіяналізма, якую рэалізоўвалі праз падручнікі і праграмы і праз дыферэнцыяцыю адукацыйнай палітыкі ў асобных рэгіёнах.

Кантраліраваць змест навучання на ўсходніх землях спрабавалі пераходныя польскія ўлады. Спачатку гэта была рэпрэсіўная цэнзура: непажаданыя кнігі не дазваляліся ці канфіскаваліся. Школы штогод прадстаўлялі спісы дапаможнікаў [3; 13]. Пасля арганізацыі ў 1921 г. Міністэрствам веравызнанняў і народнай асветы (МВіНА) Камісіі для ацэнкі школьных падручнікаў і выданняў, прызначаных для школьнай моладзі (далей – Камісія), паўсталі асобныя падкамісіі для меншасцей. Гэта значыла стварэнне прэвентыўнай цэнзуры. У чэрвені 1923 г. сфарміравалася падкамісія для школ з беларускай і літоўскай мовамі навучання ў Вільні. Яе рашэнні адразу разглядаліся міністрам. Паколькі ў падкамісію ўваходзілі пераважна польскія чыноўнікі і навукоўцы, то падручнікі для меншасцей прадстаўляліся і ў польскім перакладзе, які служыў асновай для ацэнкі. Кваліфікацыйная праца часта расцягвалася на некалькі год. Ад часу перадачы рукапісу ў камісіі (падкамісіі) да прыняцця канчатковага рашэння праходзіла

некалькі год. Матэрыялы маглі яшчэ вандраваць паміж Варшавай, Вільняй і Львовам, дзе знаходзілася Дзяржаўнае выдавецтва школьных кніг. У 1937 г. МВіНА пагадзілася на спрошчаную працэдуру ацэнкі падручнікаў для меншасцей [44; 6].

У склад падкамісіі ўвайшлі чыноўнікі віленскай куратарыі і педагогі-практыкі: Ю. Малавескі, С. Мыдляж, Л. Пжэмянецкі і Р. Вузьнякоўскі. Напрыканцы 1924 г. віленскі куратар З. Гансяроўскі падзяліў яе на падкамісію для пачатковых школ і настаўніцкіх семінарый (Т. Туркоўскі - кіраўнік) і для сярэдніх школ (С. Швідэрскі - кіраўнік). Рэферэнтамі па беларускім справам былі Ю. Малавескі і С. Мыдляж у першай, у другой - Ю. Малавескі і Ю. Гюнтэр. У 1927 г. паўсталі асобныя беларуская і літоўская камісіі. У 1931 г. падкамісіі былі непасрэдна падпарадкаваныя куратарам школьных акруг. У іх уваходзілі некалькі чыноўнікаў і педагогаў акругі. Аўтаматычна прызначўся візітатар, адказваўшы ў куратарыі за нацыянальны накірунак і фактычна кіраваў працай камісіі. У беларускую камісію ўвайшлі К. Шэлангоўскі, Т. Младкоўскі, А. Нэканда-Трэпка, А. Міліконт-Нарвойша і А. Янчуковіч. У 1937 г. сябрамі беларускай камісіі сталі куратар М. Гадэцкі, А. Нэканда-Трэпка, А.Мілліконт-Нарвойша, Б. Кавалевіч, В. Грыглеўскі і Р. Астроўскі. Апошні ўжо пераехаў у Лодзь [1; 4; 9].

Беларусы знаходзіліся ў найгоршых умовах. Нават тыя палітыкі, хто разумеў іх культурна-этнічную самабытнасць, не ўспрымалі сур'ёзна памеры іх палітычныя прэтэнзіі. Адсутнасць рэальнай падтрымкі нацыянальнай дзяржавы ці прынамсі моцнага асяродка, як ва ўкраінцаў, плыннасць самасвядомасці і адпаведна межаў супольнасці пазбаўлялі грунту асветніцкія намаганні беларускіх дзеячоў. Да таго ж у іх быў малы досвед арганізацыя школьнай справы. У 1924 г. на ІІ з'ездзе школьных інспектараў віленскай акругі З. Гансяроўскі папярэджваў, каб ў навучанні беларускай мовы выкарыстоўвалася б толькі лацінка.

Беларускія падручнікі былі не такія шматлікія як украінскія, горшай якасці, але ідэалагічна менш небяспечныя, чым літоўскія выданні. Таму ў 1925 г. МВіНА часова зацвердзіла кароткі спіс беларускамоўных дапаможнікаў, у т.л. для вывучэння беларускай мовы для 2 і 3 класаў. Паміж лютым 1926 і сакавіком 1927 г. віленская куратарыя склікала адмысловую канферэнцыю, прысвечаную беларускім падручнікам, але большасць беларускіх дзеячоў паставілася да ініцыятывы скептычна [2; 9].

У поўнай ступені імкненне ўладаў асіміляваць беларусаў паказаў адзіны дазволены ў Польшчы беларускі буквар. Па заказу школьнай адміністрацыі С. Любіч-Маеўскі падрыхтаваў буквар і чытанку для 2 класа "Першы промень", выдадзеныя ў 1929 г. у Львове. З

перапіскі С. Любіч-Маеўскага вынікае, што падрыхтаваць падручнікі, “адпаведныя” для МВіНА, ён не даў рады, і рукапісы пазней “дапрацоўваліся” у выдавецтве. Хоць улады прызналі няўданасць праекту, кнігі пазасталіся ва ўжытку да вайны як адзіныя дапаможнікі для 1-2 класаў. У 1931 г. Ю. Малавескі паведамляў, што ў школах віленскай акругі кірыліца уводзілася толькі па жаданні бацькоў у мясцовасцях з перавагай праваслаўных [6; 18].

Праца над беларускімі падручнікамі расцягнулася да вайны з-за фінансавых цяжкасцей, адлегласцей паміж Львовам і Вільняй і бюракратыі. Толькі ў 1937 г. выйшаў падручнік “Нашая праца” (рэдакцыя Я. Расткоўскай-Чыстоўскай) для двугадовага 3 класа, напісаны з выкарыстаннем 2 графічных сістэм беларускай мовы, але з перавагай лацінкі. Не паспелі надрукаваць падрыхтаваны дапаможнік для трохгадовага 4 класа (рэдакцыя Я. Станкевіча і Р. Шырмы). Не скончылася распрацоўка новага буквара (аўтар Я. Станкевіч) і чытанкі для 2 класа [5; 7-10]. Назіраўся больш сур’ёзны падыход уладаў і выдавецтва да якасці кніг у параўнанні з выданнямі С. Любіч-Маеўскага. Усе падрыхтаваныя куратарыяй беларускія дапаможнікі разлічваліся на доўгую перспектыву з прычыны малалікасці вучняў і адпаведна нізкага запатрабавання на іх, якое з часам павінна было знікнуць. Пэўна частка польскіх дзеячоў марыла і аб здушэнні і асіміляцыі ўкраінцаў, спачатку праваслаўных, потым грэка-католікаў. Аб масах “тутэйшага” насельніцтва няма чаго і разважаць.

Змест новых падручнікаў стандартызаваўся ў адпаведнасці з польскай выхаваўчай ідэалогіяй. Як і тагачасныя літоўскія чытанкі, яны дапасоўваліся да польскіх праграм і ўтрымлівалі пераклады класічных чытанак аб Ю. Пілсудскім, прэзідэнце, свяце незалежнасці, польскім войску і г.д. Калі польскамоўныя выданні для шматгадовых класаў падзяляліся на часткі, падручнікі для меншасцей друкаваліся скарочана адной кнігай. Кнігі для беларусаў вылучаліся меншым нацыянальным каларытам і патрыятызмам, чым украінскія ці літоўскія. Галоўныя адрасаты ўсіх чытанак для беларусаў, як літоўцаў і ўкраінцаў, пражывалі на вёсцы, займаліся сельскай гаспадаркай, шанавалі традыцыі і верылі ў Бога. Ім прадпісвалася лічыць сябе грамадзянамі Польшчы, шанаваць яе герояў, знакамітых дзеячоў і адзначаць дзяржаўныя святы. Галоўным ворагам, як і для палякаў, прызнаваліся “маскалі”. У адрозненні ад літоўскага падручніка для 3 класа, у “Нашай працы” жанчына радавалася, што дзеці вольныя, а не вучыліся на роднай мове. Ціква, што чытачы кнігі маглі належыць да праваслаўя ці каталіцтва [7; 9; 11].

Санацыйная палітыка рэгіяналізму дазваляла абысці, ухіліцца ад нацыянальнага (этнічнага) пытання. Адміністрацыйна-тэрытарыяльныя падзелы узнімаліся па-над этнічныя і пад маркай “польскасці” выспя-

валася грамадзянская еднасць. Выхаваўчая ідэалогія спрыяла падзелу яшчэ няўстойлівай і плыннай беларускай супольнасці. Для масы з нявызначанай свядомасцю пераход ад лакальнай, "тутэйшай", тоеснасці да тэрытарыяльна-дзяржаўнай "польскай" праз адміністрацыйна-тэрытарыяльныя ці рэгіянальныя катэгорыі (паляшук, валынянін, віленчук і г.д.) быў больш зразумелым і адбываўся лягчэй, чым да віртуальных паняццяў беларускасці і ўкраінскасці.

У міжваеннай Польшчы назіралася тыповая для часу і рэгіёну тэндэнцыя да татальнага кантроля за зместам школьных выданняў як спосабу кіравання адукацыяй. Не менш важным, а можа і больш пільным заданнем стала цэнзура падручнікаў для меншасцей, якія з'яўляліся галаўным болем польскіх уладаў. Спачатку гаворка магла ісці толькі аб рэпрэсіўных сродках, але з 1923 г. паўстаў механізм прэвентыўнага кантролю. Беларускіх кніг было мала, не адпаведнай якасці і зместу. Таму ўлады вырашылі ўзяць ініцыятыву ў свае рукі і падрыхтавалі адмысловыя дапаможнікі на ўласны густ. Падручнікі служылі доўгатэрміновай паланізацыі.

1. Grotowska, H. Kwalifikacja książek i pomocy szkolnych (I) / H. Grotowska // Oświata i wychowanie. – 1932. - Z. 8. – S. 709–722; Eadem. Kwalifikacja książek i pomocy szkolnych (II) / Eadem // Ibidem. - Z. 9. - S. 797–822.
2. Lietuvos Centrinis Valstybinis Archyvas (LCVA). F. 51. Ap.1. B. 299. Lap.29.
3. LCVA. F. 172. Ap. I. B. 19. Lap. 107.
4. LCVA. F. 172. Ap. 1. B. 1366. Lap. 346, 361.
5. LCVA. F. 172. Ap. 1. B. 4756. Lap. 2 ver, 32 ver.
6. LCVA. F. 172. Ap. 1. B. 5038. Lap. 58, 81ver.
7. LCVA. F. 172. Ap. I. B. 5594. Lap. 46ver, 180-181.
8. LCVA. F. 172. Ap. I. B. 6082. Lap. 2.
9. LCVA. F. 172. Ap. I. B. 6168. Lap. 12-15, 29-29 ver, 93, 119, 144 ver, 145ver, 167, 170 ver-172ver
10. LCVA. F. 172. Ap. I. B. 7578. Lap. 11ver.
11. Našaja praca: padručnaja knižka dla trejciaje klasy pačatkovych školaŭ / Praca supolnaja vučycielaŭ vilenskich, vykananaja pad kiraŭnictvam dr. Janiny Čystoŭskaj. - Lwów: PWKS, 1937. – S. 40-42.
12. Pohoska H., Poland (Polska), [w:] Report on nationalism in history text-books, prep. & comp. by The Working Committee of a Special Commission on Education Stockholm, A. – B. Magn. Bergvalls Förl, Stockholm 1928, p. 201 – 217.
13. Rozporządzenie tymczasowe Komisarza Generalnego Ziem Wschodnich, dotyczące szkolnictwa i oświaty, z 11 października 1919 r. // „DU MWRiOP". – Nr 12–13. – 1919. – S. 398.
14. Siemakowicz, M. Organizacja szkolnictwa dla ludności białoruskiej w II Rzeczypospolitej / M. Siemakowicz // BZH. – 1999. – Nr 12. – S. 80 – 132.
15. Turonek, J. Książka białoruska w II Rzeczypospolitej (1921 – 1939) / J. Turonek. – Warszawa, 2000.
16. Вабішчэвіч, А. Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. Вабішчэвіч. – Брэст, 2004.

17. Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917 – 1945) / Г.Р. Сянькевіч, А.В. Трухан, З. М. Ціток і інш. – Мінск, 1993.
18. Сендзер, С.А. "Лемантар" Станіслава Любіч-Маеўскага / С.А. Сендзер // БГЧ. – 2006. – № 10. – С. 30 – 35.

**Бездзель В.Я.**

## ЗМЕСТ І ФОРМЫ НАВУЧАННЯ ДЗЯЦЕЙ У ПАРТЫЗАНСКІХ АТРАДАХ (1941–1944 ГГ.)

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў руху супраціву на тэрыторыі Беларусі ўдзельнічалі прадстаўнікі ўсіх узроставых і сацыяльных груп грамадства. У ліку 370 тыс. партызан былі і 34342 школьнікі, а таксама больш за 5 тыс. дзяцей малодшага школьнага ўзросту знаходзіліся ў партызанскіх сямейных лагерах [1, с. 62]. Аднак акрамя гэтых, афіцыйна ўстаноўленых дадзеных, колькі яшчэ дзяцей займаліся зборам зброі, дапамагалі бацькам-падпольшчыкам, і былі такім чынам удзельнікамі пасіўнага супраціву, устанавіць зараз не з'яўляецца магчымым. Масавы ўдзел падрастаючага пакалення ў антыфашысцкай барацьбе тлумачыцца, у першую чаргу, жорсткасцю акупацыйнага рэжыму, палітыкай генацыду, карнымі экспедыцыямі, што правадзілі нацысты на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Разам з тым, нельга адмаўляць і ролю даваеннай савецкай школьнай сістэмы, якая была накіравана на выхаванне ў дзяцей патрыятычных пачуццяў, гатоўнасці абараняць Радзіму. Увядзенне ў 1930-я гг. практыкі ўдзелу ў абарончых гуртках, здача норм на "ГТО" і "БГТО" садзейнічала ўцягванню дзяцей у піянерскі рух, рабіла пазашкольную дзейнасць больш цікавай і разнастайнай. Ваенныя гульні, магчымасць авалодаць уменнем выкарыстоўваць зброю, сувязі з Чырвонай Арміяй рамантызавалі і гераізавалі прафесію вайскоўца, а будучая барацьба ўяўлялася хуткай і пераможнай. Спроба даць некаторы вопыт праз ваенныя гульні і абарончыя гурткі спрыяла таму, што дзеці захапляліся прафесіяй вайскоўца і ў выпадку пачатку вайны верылі, што змогуць аказаць дапамогу Чырвонай Арміі.

Ужо ў ходзе акупацыі германскай арміяй тэрыторыі Беларусі школьнікі прынялі актыўны ўдзел у зборы зброі і яе перазахаванні (у далейшым так званыя "тайнікі" перадаваліся ў патрызанскія атрады). Падлеткі дзейнічалі невялікімі групамі і па адным. Зімой 1941 – вясной 1942 гг. ва ўмовах пашырэння партызанскага руху многія з іх самастойна шукалі партызан, прыходзілі ў атрады разам з бацькамі. Разам з тым, на гэтым этапе ніякай арганізаванай працы, як выхаваўчай, так і вучэбнай з дзецьмі не праводзілася. У шматлікіх справаздачах партызанскіх камандзіраў адзначалася, што "школ нигде нет, с детьми

работа не проводится. Когда проводятся беседы с крестьянами, то собираются дети и слушают, затаив дыхание" [3, арк. 109 зв.]. Абмежаваныя магчымасці па вывазе дзяцей у савецкі тыл, іх узрастаючая колькасць сярод партызан вымушала камандаванне займацца праблемай арганізацыі жыцця дзяцей у партызанскіх і сямейных атрадах. У дадзеным артыкуле мы звернемся да разгляду асноўных форм навучання і выхавання дзяцей у партызанскіх фарміраваннях.

Справу выхавання дзяцей і падлеткаў на акупаванай тэрыторыі Беларусі ўзялі на сябе падпольныя камуністычныя і камсамольскія органы. У лістападзе 1942 г. ЦК ЛКСМБ накіраваў да падпольных органаў на тэрыторыі акупаванай Беларусі спецыяльны ліст "Аб задачах, формах і метадах работы камсамольскіх арганізацый Беларусі сярод дзяцей у тыле ворага", у якім на гэтыя органы ўскладваўся абавязак пашырыць работу менавіта сярод дзяцей. Першы сакратар ЦК ЛКСМБ М.В. Зімянін адзначаў, што "ребята приносят и принесут неоценимую помощь партизанскому движению, разведке", што дзяцей неабходна выхоўваць у традыцыях савецкай піянерыі, каб яны станавіліся бясстрашнымі змагарамі за Радзіму. На камсамол ускладвалася функцыя па абароне ад палітыкі анямечвання, якая праводзілася акупантамі праз школы і дашкольныя дзіцячыя установы [3, арк. 181].

Не менш важнай задачай партызан у адносінах да падрастаючага пакалення была выхаваўчая. Рэалізоўвалася яна праз стварэнне лясных школ, правядзенне пазашкольнай працы з дзецьмі, праз працоўнае выхаванне і прыцягненне дзяцей да выканання розных гаспадарчых абавязкаў у партызанскіх атрадах, праз стварэнне піянерскіх атрадаў. Дакументам, які рэгламентаваў выхаваўчую работу сярод дзяцей і падлеткаў, быў ужо ўпамянуты намі спецыяльны ліст М.В. Зімяніна "Аб задачах, формах і метадах работы камсамольскіх арганізацый Беларусі сярод дзяцей у тыле ворага" (лістапад 1942 г.).

Першая сетка арганізаваных партызанскіх школ з'явілася ў вёсках Ветрынскага раёна Віцебскай вобласці, якія пачалі працаваць з 1 верасня 1942 г. Асабліва гэты працэс актывізаваўся пасля таго, як ініцыятыву на сябе ўзялі ЦК ЛКСМБ і яго сакратары К.Т. Мазураў і М.В. Зімянін. Адной з прычын такой увагі да гэтага працэсу стала ідэалагічная барацьба за падрастаючае пакаленне. Фашысцкая палітыка анямечвання, якая праводзілася праз дзіцячыя ўстановы на акупаванай тэрыторыі Беларусі, патрабавала мер супрацьдзеяння, сярод якіх былі адкрыццё савецкіх школ, навучанне па савецкіх праграмах, тлумачальная работа з бацькамі. Кантроль над школай даваў магчымасць весці выхаванне дзяцей у духу піянерскай традыцыі, нянавісці да ворагаў. Непазбежная перамога СССР у вайне з Германіяй, у якую верылі і на якую спадзяваліся на акупаваных землях, часовасць акупацыйнага рэжыму патрабавала ад педагогаў заду-

мацца і аб непарыўнасці працэсу навучання дзяцей, па магчымасці захаваць яго.

Акрамя партызанскіх школ (знаходзіліся ў населеных пунктах, якія кантраляваліся партызанамі ці знаходзіліся на тэрыторыі партызанскай зоны), функцыянавалі "лясныя" школы. Апошныя адрозніваліся ад партызанскіх тым, што дзейнічалі ў сямейных (грамадзянскіх) лагерах, у лясных масівах і ахоўваліся партызанскімі атрадамі. Яны ствараліся для дзяцей мясцовага насельніцтва, якое пайшло пад абарону партызан у лясы. Умовы для навучання і цяжкасці, з якімі сутыкнуліся, былі прыкладна аднолькавыя. "Лясныя" школы сталі арганізоўвацца пазней, з восені 1943 г. Адказваў за іх работу камсамол. Першая лясная школа была арганізавана на Брэстчыне пры атрадзе імя Калініна, дзе ў трох класах навучалася 50 дзяцей. Па астатніх абласцях, як паказваюць архіўныя дакументы, гэтай працы не надавалася неабходнай увагі. Стварэнне школ было не паўсюдным, а камсамольскія органы не кантралявалі гэты працэс. Так, Баранавіцкі АК ЛКСМБ у пастанове ад 26 красавіка 1944 г. адзначаў, што "отдельные райкомы ЛКСМБ не придали достаточного внимания работе среди молодежи и детей семейных отрядов. Работа среди детей совершенно неорганизованна" [4, арк. 17]. Для таго, каб палепшыць сітуацыю, абком прыняў шэраг мер, у тым ліку прапаноўваў "одобрить инициативу Воложинского РК ЛКСМБ об организации в семейном лагере бригады «За Советскую Белоруссию» общеобразовательной школы для детей. Предложить всем РК ЛКСМБ, на территории которых имеются семейные лагеря, организовать обучение детей школьного возраста" [4, арк. 17]. Гэта надало некаторы штуршок працэсу арганізацыі школ. Аднак назваць зараз дакладную іх колькасць не з'яўляецца магчымым.

Для саміх вучняў наведванне школы ўяўляла не толькі працэс набыцця ведаў. Гэта была спроба ўзнавіць даваеннае жыццё, няхай толькі у некаторай ступені. Праз школу даведваліся аб зменах на фронце, у школе сустракаліся з партызанамі, займаліся вывучэннем зброі, перапісвалі лістоўкі, рабілі грамадска-карысную працу. Такім чынам, школа выконвала ідэалагічную функцыю (піянерскай арганізацыя, барацьба за падрастаючае пакаленне), а таксама арганізоўвала і накіроўвала жыццё дзяцей у сямейных лагерах. Для вучняў "лясных" школ першае месца займаў не сам працэс навучання і набыццё ведаў. Прыярытэтнай заставалася пазашкольная дзейнасць, што была прадстаўлена ў форме піянерскай работы, гурткоў самадзейнасці, ваенных гурткоў, гаспадарчых даручэнняў. Яна займала і большую частку часу, асабліва калі вучэбныя заняткі праводзіць не было магчымасці. Работа ж па лагеры знаходзілася заўсёды.

У даваеннай савецкай педагогіцы адным з пастулатаў навучання

было непарыўнасць тэорыі і практыкі. У гады акупацыі ў партызанскіх і лясных школах працоўнае навучанне дзяцей вымушалася самім жыццём. Занятасць мужчын у баявых аперацыях, недахоп працоўных рук рабілі непазбежным уцягванне дзяцей і падлеткаў у дарослыя працоўныя адносіны. У справаздачы Брэсцкага АК ЛКСМБ падкрэслівалася, што адной з асноўных задач лясных школ з'яўлялася "привитие школьникам трудовых навыков, трудовой закалки и трудовой чести" [5, с. 155].

Дзеці былі задзейнічаны ў першую чаргу ў гаспадарчых ротах. Аднак гэтае месца заставалася самым нелюбімым у падлеткаў. Прызначэнне туды (пасля прыняцця ў атрад) успрымалася як знявага для дзяцей старэйшага ўзросту, паколькі яны жадалі трапіць адразу ў баявы склад атрада і выконваць баявыя даручэнні, а не калоць дровы ці чысціць на кухні бульбу. Разам з тым, праца ў гаспадарчых ротах была не менш важнай для партызан за ваенныя дзеянні. Як адзначаецца ў архіўных дакументах, дзіця на кухні, незалежна ад таго якую работу ён выконваў, замяняў аднаго дарослага, які ў гэты час быў заняты ў барацьбе з ворагам [2, арк. 147]. Сітуацыя з выкарыстаннем працы дзяцей на карысць партызан нагадвае становішча ў савецкім тылу, дзе для мабілізацымі ўсіх рэсурсаў краіны на завода і фабрыках працавалі 12 – 16-цігадовыя падлеткі і выконвалі нормы дарослых.

Такім чынам, з кароткага агляду праблемы навучання і выхавання дзяцей у перыяд акупацыі, можна адзначыць пераемнасць у традыцыях з даваеннай савецкай сістэмай выхавання. Асноўны акцэнт у выхаваўчым працэсе быў зроблены на патрыятычны аспект, што, з аднаго боку, дазваляла ўцягваць дзяцей у антыфашысцкую барацьбу, з другога, не давала акупантам магчымасці прыцягнуць падрастаючае пакаленне ў свае шэрагі. Узмацненне партызанскіх фарміраванняў дазволіла звярнуцца да рашэння праблем у іншых сферах дзейнасці, у тым ліку і да наладжвання выхаваўча-патрыятычнай працы сярод дзяцей, якія знаходзіліся ў партызанскіх шэрагах і сямейных лагерах.

1. Котаў, А.І. Дзеці Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны / А.І. Котаў // 55 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: погляд праз гады, новыя канцэпцыі і падыходы: мат-лы, навук.-тэарэт. канфер., 4 – 5 мая 2000 г.: у 2 ч. Ч. 1. – Мінск, БДПУ імя М. Танка, 2000. – 166с.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 63-п. Воп. 5. Спр. 2.
3. НАРБ. Ф. 63-п. Воп. 16. Спр. 11.
4. НАРБ. Ф. 1375. Воп. 1. Спр. 152.
5. Умрейко, С.А. Патриотизм учителей и школьников Белоруссии в борьбе против немецко-фашистских оккупантов / С.А. Умрейко, П.Н. Кобринец, А.И. Залесский. – Мн.: Изд-во БГУ, 1980. – 176 с.

**Марцынкевіч І.А.**

# АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦАЎЛАДКАВАННЯ І ПРАЦОЎНАГА НАВУЧАННЯ ІНВАЛІДАЎ І ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ВАЙНЫ (1942–1945 гг.)

Праблема перахода ад вайны да мірнага жыцця і ў эканамічным, і ў сацыяльным плане, так ці інакш стаяла перад ўсім савецкім пасляваеным грамадствам. Аднак у найбольшай ступені яна закранала франтавікоў, якія былі, фактычна, адарваны ад мірнага жыцця і на працягу чатырох год жылі зусім у іншым вымярэнні.

Прызвычаіцца да новай рэчаіснасці жыцця было нялёгка. Працэс адаптацыі ўскладняўся тым, што многія з іх (1923−1927 гадоў наражджэння) былі прызваны на фронт адразу пасля заканчэння школы, не паспеўшы атрымаць прафесію ці пэўны статус ў мірным жыцці [1, с. 49-50]. Яшчэ ў больш складаным становішчы аказаліся інваліды вайны, якія калі і мелі прафесію да прызыва ў Чырвоную Армію, зараз былі пазбаўлены магчымасці паўнацэннай дзеяздольнасці і не маглі выконваць работу па атрыманай раней спецяльнасці.

Пытанне аб працаўладкаванні было адным з прыярытэтных. Па гэтай прычыне Саюзным кіраўніцтвам, а таксама Рэспубліканскімі органамі ўлады, яшчэ ў гады вайны быў прыняты цэлы шэраг пастаноў і дакументаў, якія рэгламентавалі працаўладкаванне інвалідаў і ўдзельнікаў вайны, а таксама арганізацыю навучання іх новым прафесіям і спецыяльнасцям.

Так, згодна з Пастановай СНК СССР ад 6 мая 1942 года на народных камісараў сацыяльнага забеспячэння саюзных рэспублік была ўскладзена асабістая адказнасць за працоўнае ўладкаванне і арганізацыю вытворчага навучання інвалідаў вайны, а на кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый − абавязак у самыя кароткія тэрміны прадаставіць інвалідам, накіраванымі органамі сацыяльнага забеспячэння, адпаведную работу.

Інвалідам вайны прадстаўлялася першачарговае права залічэння ва ўсе дзяржаўныя прадпрыемствы і арганізацыі.

Кіраўнікам прадпрыемстваў і арганізацый дазвалялася прадастаўляць інвалідам чарговыя адпачынкі, якія ў гады вайны ўсім працоўным і служачым былі заменены грашовай кампенсацыяй; забаранялася прыцягваць працуючых інвалідаў да зверхтэрміновых работ ў абавязковым парадку. Дапамога па часовай непрацаздольнасці стала выплочвацца інвалідам вайны незалежна ад стажа непрырыўнай працы.

У мэтах кантроля за працаўладкаваннем інвалідаў пры выканкамах абласных і выканаўчых абласных, краёвых і гарадскіх камітэтах Саветаў дэпутатаў працоўных былі створаны пастаянныя камісіі па працаўладкаванню інвалідаў.

У 1942 годзе органамі сацыяльнага забеспячэння краіны былі арганізаваны першыя дамы для інвалідаў Айчыннай вайны, якія паз-

ней былі рэарганізаваны ў інтэрнаты. У іх інваліды знаходзіліся на поўным дзяржаўнным утрыманні, забяспечваліся неабходным дагля-дам, медыцынскім і культурным абслугоўваннем, навучаліся розным даступным для іх магчымасцей прафесіям [2, с. 34].

Далейшая работа Саюзнага і Рэспубліканскага Урада па працаўладкаванню інвалідаў і ўдзельнікаў вайны знайшла сваё адлюстраванне ў Пастанове СНК СССР і ЦК ВКП(б) “Аб бліжэйшых задачах Савнаркама БССР і ЦК КП(б) Беларусі” ад 1 студзеня 1944 г., дзе было адзначана, што ЦК КП(б)Б і СНК БССР павінны прыняць ўсе меры па своечасоваму аказанню дапамогі ў бытавым і працоўным уладкаванні інвалідам Айчыннай вайны [3, с. 488].

Пастановай СНК БССР і ЦК КП(б)Б “Аб працаўладкаванні інвалідаў было вырашана ўскласці на Народны Камісарыят Сацыяльнага забеспячэння БССР асабістую адказнасць за працаўладкаванне і арганізацыю навучання новым прафесіям інвалідаў Айчыннай вайны.

Мясцовыя органы сацыяльнага забеспячэння былі абавязаны вызначаць групу інваліднасці і накіраваць на працу не пазней, як праз 3 дні пасля выпіскі інвалідаў Айчыннай вайны са шпіталя. Гэтыя мерапрыемствы павінны былі паскорыць працэс афамлення ўдзельнікаў і інвалідаў вайны на новыя месцы працы, а таксама навучанню іх новым прафесіям  і спецыяльнасцям.

Выканаўчыя камітэты абласных саветаў дэпутатаў працоўных і кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў павінны былі забяспечваць інвалідаў Айчыннай вайны, накіраваных органамі сацыяльнага забеспячэння прадстаўленнем ў найкарацейшыя тэрміны, без затрымак, адпаведнай працай з улікам індывідуальных асаблівасцяў інвалідаў.

На Наркамат Сацяльнага забеспячэння БССР, згодна з дадзенай пастановай  ускладвалася арганізацыя навучанне новым спецыяльнасцям інвалідаў Айчыннай вайны, якія па стану свайго здароў’я не маглі быць задзейнічаны на іх ранейшай працы, у сваю чаргу, Народны Камісарыят Сацыяльнага Забеспячэння павінен быў, таксама, вырашаць пытанні, звязаныя з навучаннем новым прафесіям інвалідаў Айчыннай вайны I і II груп.

З гэтай прычыны  выканкамы абласных, гарацкіх і раённых Саветаў дэпутатаў працоўных былі абавязаны прапанаваць прадаставіць органам сацыяльнага забеспячэння неабходныя памяшканні для майстэрнь з інтэрнатамі пры іх для інвалідаў Айчыннай вайны, а таксама адпаведныя памяшканні для дамоў інвалідаў, а Народны камісарыят БССР быў абавязаны ўтварыць пры адукацыйных школах для дарослых спецыяльныя групы для навучання інвалідаў Айчыннай вайны па праграмам няпоўных сярэдніх і сярэдніх школ.

Акрамя таго, ўсе наркаматы і ведамствы, якія мелі курсы па падрыхтоўцы працоўных кадраў былі абавязаны прымаць для навучання інвалідаў Айчыннай вайны III групы па заключэнню УТЭК.

Было устаноўлена, што інваліды Айчыннай вайны, якія працу-

юць на прадпрыемствах і ва ўстановах, да зверхтэрміновых работ у абавязковым парадку не павінны прыцягвацца [4, арк. 4].

Разам з тым, органы дзяржаўнага кіравання ажыццяўлялі і строгі кантроль за тымі удзельнікамі і інвалідамі вайны, якія, па заключэнню ўрачэбнай экспертнай камісіі былі прызнаны працаздольнымі, але ўхіляліся ад працаўладкавання ці працоўнага навучання. З гэтай мэтай пракурорам БССР было прадастаўлена права прыцягваць да адказнасці асоб, якія неабгрунтавана ўхіляюцца ад прыёма на працу інвалідаў Айчыннай вайны, а таксама тых, хто мае накіраванне на працу ад арганізацыі сацыяльнага забеспячэння.

Для практычнай дапамогі і ажыццяўлення кантроля ў справе працауладкавання інвалідаў Айчыннай вайны было прынята рашэнне стварыць пастаянныя абласныя, гарадскія і раённыя камісіі па працаўладкаванню інвалідаў у складзе намесніка старшыні сакратара адпаведнага камітэта КП(б)Б, сакратара камітэта ВЛКСМ (б), старшыні адпаведнай прафсаюзнай арганізацыі і загадчыка аддзелам сацыяльнага забеспячэння (сакратар камісіі).

Пры Наркамаце Сацыяльнага Забеспячэння абласных і гарацкіх аддзелах сацыяльнага забеспячэння сектары па працаўладкаванню інвалідаў Айчыннай вайны, а ў асобных раёнах, з дазвола Савета Народных камісараў, у выпадку неабходнасці, ўводзіліся пасады інспектара па працаўладкаванню дадзенай катэгорыі насельніцтва[4, арк. 5].

Выканкам абласных Саветаў дэпутатаў працоўных быў абавязаны прадастаўляць Саўнаркаму БССР кожны месяц справаздачу аб выніках работы, выкананай па працаўладкаванню інвалідаў і ўдзельнікаў вайны [4, арк. 6].

Такім чынам, можна адзначыць, што Саюзным кіраўніцтвам, а таксама рэспубліканскімі і партыйнымі ораганамі ўлады яшчэ ў гады пачала распрацоўвацца праблема працаўладкавання і працоўнага навучання інвалідаў і ўдзельнікаў вайны, што знайшло сваё выражэнне ў шэрагу законаў і пастаноў саюзнага і рэспубліканскага значэнне. Немалаважным крокам ў гэтай вобласці стала тое, што на Народны Камісарыят Сацыяльнага забеспячэння БССР была ўскладзена асабістая адказнасць за працаўладкаванне і арганізацыю навучання новым прафесіям інвалідаў Айчыннай вайны.

1. Зубкова, Е.Ю. Послевоенное советское общество: политика и повседневность 1945−1953 / Е.Ю. Зубкова. − М.: РОССПЭН, 2000.

2. Трудоустройство инвалидов в СССР. – М.: Изд-во Юридическая литература, 1963.

3. Коммунистическая партия Советского союза в резолюциях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898-1986). Т. 7 (1938 – 1945). – М.: Изд-во политической литературы, 1985.

4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 7, воп. 3, спр. 1720.

**Новак Г.Г.**

# ПЕДАГОГИ ВИТЕБСКА – ГЕРОИ СОВЕТСКОГО СОЮЗА

9 мая 2010 года исполняется 65 лет Победы советского народа в Великой Отечественной войне. Достойный вклад в борьбу с фашизмом внесла родная Беларусь. На борьбу с оккупантами поднялся весь народ. Беспримерное мужество и героизм проявили и педагоги Беларуси. Около 10 тысяч их вступили в Красную Армию, свыше 7 тысяч сражались в рядах партизан и подпольщиков [4, с. 6]. Всего за активное участие в войне орденами и медалями СССР награждено 8628 педагогов Беларуси [4, с. 6]. Есть среди них и Герои Советского Союза. За проявленное мужество и отвагу этого высокого звания удостоены и наши земляки, уроженцы Витебской области: К.А. Абазовский, М.А. Высогорец, В.А. Демидов, И.М. Ерашов, М.С. Камельчик, В.А. Квитинский, Т.С. Мариненко, Ф.Г. Марков, А.И. Масловская, А.Д. Матюшов, П.М. Машеров, Н.В. Троян, В.А. Тышевич, В.А. Хомченовский.

В своей работе мы решили показать педагогов, жизнь которых была связана с Витебском, это Василий Александрович Демидов и Владимир Александрович Тышевич. О них написаны небольшие статьи в областных газетах, где кратко рассказано об их подвигах во время войны. Целью нашего исследования было полное изображение жизни наших земляков. Мы изучили архивные материалы, записали воспоминания людей, близко их знавших. Выражаем огромную благодарность этим людям, а также работникам областного краеведческого музея, музея истории Витебской государственной академии ветеринарной медицины за помощь в сборе материалов нашего исследования, которое будет представлено в музее «История образования в Витебском регионе». В этой статье мы кратко изложим жизненный путь педагогов-героев войны.

Василий Александрович Демидов родился 12 апреля 1921 г. в семье служащих. На Яновской-Набережной (ныне ул. Мовзона г. Витебска) пройдут его детские годы, здесь он будет жить и после войны. С 1929 по 1939 гг. он ученик СШ № 27, потом курсант Витебского аэроклуба, затем будет Борисовская школа летчиков, там его и застанет война. Курсанты просятся на фронт, но учеба продолжается уже в далеком тылу, в Омске.

В марте 1943 г. Василий Демидов получает назначение на Западный фронт в 10-й отдельный разведывательный авиаполк 1-ой воздушной армии. Он жаждет воздушных боев, однако командование доверило ему не истребитель, а самолет-разведчик.

Работа была непривычной, но крайне важной, так как точные разведданные предопределяли тактику наших войск. На первый взгляд воз-

душная разведка кажется несложной: лети в тыл противника, наблюдай за ним и фотографируй военные объекты. Но над вражеской территорией приходится висеть часами, в любой момент самолет-разведчик могут заметить и пустить в ход зенитную артиллерию, поэтому ведение воздушной разведки поручалось наиболее опытным летчикам.

Большие испытания выпали на долю Демидова в Восточной Пруссии. Разведчику поручили фотографировать крепость Кенигсберг. Это было смертельно опасно. 11 экипажей погибло, выполняя это задание. В крепость была стянута зенитная артиллерия со всей Восточной Пруссии.

На задание Демидова сопровождали 12 французов из полка «Нормандия-Неман». Вражеские зенитки открыли огонь, наши истребители начали штурм огневых точек фашистов, а самолет-разведчик тем временем проникает в узкий коридор между разрывами снарядов.

Целый час над цитаделью врага и ее окрестностями велась съемка. Были сфотографированы оборонительные рубежи неприятеля, расположение его войск и сосредоточение техники. Осколки снарядов секли самолет-разведчик. Правый мотор замер. Демидов ранен в голову, из-под шлема течет кровь. Изо всех сил летчик выравнивает поврежденный самолет и продолжает работать. В кабину уже проникают ядовитые пары бензина – пробит центральный бак, белая пелена застилает глаза раненого Демидова. Наконец засняты последние метры оборонительной полосы противника, взят курс на свой аэродром. Стал сдавать второй мотор. Миновав неприятельскую линию, удалось посадить самолет. Оказалось: это не аэродром, а минное поле. Винтом самолета выкопано 2 мины, но последние вращения раненого самолета были настолько слабыми, что взрыватели мин не сработали. К самолету спешили саперы.

Сколько таких заданий было у Демидова за годы войны! Об этом свидетельствует следующая статистика из наградного листа: «Командир звена 10-го Московского Краснознаменного отдельного разведывательного авиаполка старший лейтенант Василий Александрович Демидов сделал 226 вылетов, 175 из них – для воздушной разведки и фотографирования оборонительных рубежей группировок и резервов противника. Экипаж Демидова сфотографировал 24150 квадратных километров территории врага, 165 действующих аэродромов, обнаружил 1678 самолетов, 927 железнодорожных составов и эшелонов, 32908 автомашин, артиллерии и танков…[1]. К этому нужно еще добавить 8 самолетов врага, уничтоженных экипажем разведчика.

Это подвиг. 19 апреля 1945 г. Демидову присвоено звание Героя Советского Союза. К этому времени летчик был награжден четырьмя орденами Боевого Красного Знамени, орденом Богдана Хмельницкого, двумя орденами Отечественной войны II степени, орденом Красной Звезды и семью медалями. Неслучайно командир полка, ас воздушной разведки А.Н. Родин, написал в характеристике Демидова:

«Отлично владеет всеми видами, способами и методами ведения воздушной разведки. Летает в облаках и сложных метеоусловиях, несмотря на многочисленные обстрелы зенитной артиллерии и авиации противника, отлично выполняет поставленные задания, проявляя при этом исключительную отвагу, настойчивость, хитрость, наблюдательность, выдержку и инициативу» [1].

После войны В.А. Демидов продолжает служить в военной авиации, осваивает новые реактивные самолеты. В 1955 г. в звании подполковника заканчивает командный факультет Военно-Воздушной академии, назначен первым заместителем командира полка, потом командир в/ч 23466.

По состоянию здоровья в октябре 1961 г уволен в запас. Отказавшись от штабной работы в Москве, возвращается в родной Витебск. С 1962 г. один год работает зав. мастерскими в СШ № 25, потом 3 года заместителем директора по патриотическому воспитанию, учителем труда в СШ № 21.

В годовом отчете об учебно-воспитательной работе 21-ой средней школы г. Витебска за 1965-66 учебный год отмечена большая работа В.А. Демидова по военно-патриотическому воспитанию учащихся: «Установлено шефство с воинской частью… Работал штаб красных следопытов… Создана группа содействия областному музею. Она занимается розысками неизвестных героев, могил…» [3, л. 28-29]. В разделе «Трудовое и производственное обучение» написано: «Трудовое обучение учащихся 5-8 классов осуществлялось в школьных учебных мастерских, которые оборудованы всем необходимым для обучения учащихся. Все темы программы по труду выполнены полностью. Учителя старались привить учащимся любовь к труду, уважение к героям труда» [3, л. 21].

С 1967 г. по 1982 г. В.А. Демидов – диспетчер службы движения Витебского аэропорта, руководит полетами малой авиации. Многие годы Василий Александрович принимал активное участие в общественной жизни города, за мирный труд он был награжден Почетной Грамотой Верховного Совета БССР. Умер 11 июня 1989 г., похоронен на кладбище в Мазурино.

Вместе с В.А.Демидовым закончил Витебский аэроклуб и Борисовскую школу пилотов Владимир Александрович Тышевич. Родился он 27 мая 1923 г. в семье слесаря завода им. Кирова. Жил на Канатной улице (ныне ул. Димитрова), учился в СШ № 9.

Можно сказать, что педагогическая деятельность Тышевича началась в школьные годы, когда он был вожатым у пионеров. Часто ходил с ними в походы по окрестностям Витебска, проводил разнообразные мероприятия. О своей комсомольской юности Владимир Александрович рассказал в 1968 г. на страницах газеты «Чырвоная змена» [5]. Из автобиографии и наградного листа, которые хранятся в Витебском областном краеведческом музее, мы узнали о боевом пути от-

важного летчика-штурмовика.

Первое боевое крещение Владимир Александрович принял под Орлом. Здесь он совершил 20 боевых вылетов. Однажды, выполняя задание – сорвать контратаку врага в районе Подбуглаки, в группе из 9 самолетов он вступил в неравный бой с 20 истребителями. В результате было сбито 4 самолета противника. За этот подвиг он был награжден первым орденом Красного Знамени.

Второй орден Красного Знамени он получил за выполнение заданий на Севско-Глуховском направлении. Вот как описывает Владимир Тышевич воздушный бой 27 сентября 1943 г.: «При подходе к исходному пункту разведки моя пара была атакована четырьмя самолетами ФВ-190 и одним Ме-109 (пять истребителей против двух штурмовиков). Приняв этот неравный воздушный бой, мы своим маневром завлекли противника на малые высоты. Активно действуя огнем неподвижных и турельных установок, а также используя сложный маневр самолетов на малой высоте по схеме «ножницы», мы полностью выполнили задачу по воздушной разведке, несмотря на сильные повреждения своих самолетов. В этом воздушном бою я сбил один самолет ФВ-190» [2, с.8].

В.А.Тышевич – участник Курской битвы, освобождения Украины, Беларуси, Польши. За два военных года на его счету 144 боевых вылета, он уничтожил 5 самолетов, 27 железнодорожных вагона и 3 паровоза, более 50 автомашин и другой техники, много живой силы противника, на оккупированную территорию сбросил 120000 листовок. За мужество и героизм, проявленные в годы Великой Отечественной войны ему присвоено звание Героя Советского Союза, он награжден четырьмя орденами Красного Знамени, орденом Отечественной войны I степени, двумя орденами Красной Звезды и 14 медалями.

В 1951 г. В.А.Тышевич закончил Военно-Воздушную академию в звании полковник. Служил в Белоруссии, Заполярье на должностях от помощника командира полка до заместителя командира дивизии. В 1960 г. – заместитель начальника штаба армии ПВО по боевому управлению, с апреля 1961 г. по 1964 год после сокращения Вооруженных Сил – заместитель начальника Днепропетровского аэроклуба по полетам, начальник аэропорта «Подгороднее» г. Днепропетровска.

В 1965 г. вернулся в Витебск, 15 лет работал старшим преподавателем, руководителем курса «Гражданская оборона» Витебского ветеринарного института (сейчас Витебская государственная академия ветеринарной медицины), награжден Почетной грамотой Министерства сельского хозяйства СССР. Регулярно выступал с лекциями и докладами на военно-патриотические темы в институте, на предприятиях, в школах и училищах города. Являлся председателем Комитета Фонда Мира Витебской области, заместителем председателя Совета ветеранов войны Витебской области.

В 1974 г. на В.А. Тышевича и В.А. Демидова была возложена почетная миссия: на открытие памятника-монумента и площади Победы в Витебске они привезли факел от Вечного огня, зажженного в Минске. В белорусской столице факел был вручен Василию Александровичу, а Владимир Александрович торжественно, под барабанную дробь, пронес его через всю площадь и вручил для зажжения С.М. Шабашову, первому секретарю Витебского обкома КПБ.

Умер В.А. Тышевич 18 сентября 1980 года. Похоронен на кладбище в Мазурино. В академии ветеринарной медицины своего преподавателя не забыли: его вспоминают коллеги, один из стендов музея истории академии посвящен В.А. Тышевичу.

К сожалению, память о В.А. Демидове не увековечена в школе, где он работал, его образ живет только в памяти людей, близко его знавших. Предлагаем в год 65-летия Победы в честь героев-земляков назвать новые улицы Витебска, на доме, где жил В.А. Демидов (ул. Мовзона, 19), установить мемориальную доску.


1. Витебский областной краеведческий музей (ВОКМ), н/в 3318/11.
2. ВОКМ, н/а 155.
3. Государственный архив Витебской области, ф.1737, оп.2, д.533.
4. Самы галоўны ўрок: Настаўнікі Беларусі – Героі Савецкага Саюза / (Склад. А.Л.Уліценак). – Мн.: Нар. асвета, 1985. – 254 с.
5. Тышевіч В.А. Перад бурай / В.А.Тышзвіч // Чырвоная змена. – 1968. – 7 ліпеня.



**Дулаў А.М., Юрчак Дз.В.**


## АСОБЫ Ў ЧАСЕ: ЗАГАДЧЫКІ КАФЕДРЫ ГІСТОРЫІ СССР ВДПІ імя С.М. КІРАВА Ў 1944–1955 гг.

*Pro memoria*

Ва ўсё часы вышэйшыя навучальныя ўстановы прадстаўлялі сабою не толькі месца, дзе моладзь спасцігала навуку і здабывала веды, але і своеасаблівы свет, у якім “жылі і працавалі” дзесяткі і сотні выкладчыкаў, навукоўцаў, лёсы якіх непарыўна звязаны з гісторыяй вну. У межах дадзенага артыкула мы паспрабуем прасачыць асобныя эпізоды жыцця і дзейнасці загадчыкаў кафедры гісторыі СССР ВДПІ імя С.М. Кірава ў перыяд існавання гістарычнага факультэта з 1944 г. па 1955 г., калі ён быў пераведзены ў Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут. У біяграфіях гэтых людзей, як у люстэрках, адбілася эпоха.

Да гэтага часу, пра былых выкладчыкаў кафедры гісторыі СССР былі апублікаваны толькі сціслыя біяграфічныя даведкі ў кнізе “Віцебскі

дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава: Падзеі. Людзі. Лёсы" (Віцебск, 1998 г.). Але, на жаль, у асобных выпадках у біяграфічных звестках былі дапушчаны памылкі, выправіць якія мы паспрабуем у гэтым артыкуле. Каштоўнымі крыніцамі, якія дазваляюць прасачыць лёсы былых выкладчыкаў ВДПІ імя С.М. Кірава, з'яўляюца іх асабістыя справы (знаходзяцца ў архіве УА "ВДУ імя П.М. Машэрава").

Пасля вызвалення г. Віцебска ў 1944 г. аднавіў дзейнасць педагагічны інстытут, у якім, як і да вайны, працаваў гістарычны факультэт і профільныя кафедры. Першым у пасляваенны час загадчыкам кафедры гісторыі СССР стаў *Мікалай Васільевіч Кочатаў*, што займаў гэтую пасаду і да вайны (з 1938 па 1941 гг.). Мікалай Васільевіч нарадзіўся ў 1906 г. непадалёк ад Ніжняга Ноўгарада ў сялянскай сям'і. У перыяд з 1920 па 1925 гг. выхоўваўся ў дзіцячым доме, затым працаваў у гаспадарцы мясцовага сельгастэхнікума. У 1928 годзе М.В. Кочатаў паступіў у Горкаўскі педагагічны інстытут, які скончыў у 1931 г., атрымаўшы спецыяльнасць выкладчыка гісторыі. Да 1935 г. Мікалай Васільевіч працаваў па спецыяльнасці на некалькіх рабфаках у Горкаўскай вобласці, пасля чаго паступіў у аспірантуру Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя У.І. Леніна, дзе пад кіраўніцтвам прафесара К.В. Базілевіча працаваў над дысертацыйным даследаваннем на тэму "Аграрный вопрос в работах Вольного экономического общества".

У 1938 г. Народным камісарыятам асветы РСФСР М.В. Кочатаў быў камандзіраваны на працу ў Віцебскі педагагічны інстытут. У гэтым жа годзе па хадайніцтве кіраўніцтва ВДПІ ён быў прызначаны загадчыкам кафедры народаў СССР інстытута, а крыху пазней, 31 снежня 1938 г., абараніў кандыдацкую дысертацыю са зменeнай фармуліроўкай тэмы ("Аграрно-крестьянская политика помещиков России второй половины XVIII века в отражении трудов Вольного экономического общества"). Апошняе хутчэй за ўсё было выклікана неабходнасцю падкрэсліць "класавы характар" даследавання ў рэчышчы пануючых у той час тэндэнцый.

Летам 1941 г. М.В. Кочатаў цяжка захварэў і таму не здолеў эвакуіравацца. У час нямецкай акупацыі Мікалай Васільевіч апынуўся ў в. Альгова і дзякуючы догляду сваякоў змог паправіць здароўе. Зімой 1942-1943 гг. ён устанавіў сувязь з партызанскай брыгадай М.Ф. Біруліна і летам 1943 г. перайшоў да партызан.

З вызваленнем Віцебска і аднаўленнем дзейнасці ВДПІ М.В. Кочатаў вярнуўся да былой працы. Але на яго абрынулася хваля крытыкі, чаго зусім не было ў даваенны час. Прычым некаторыя абвінавачанні былі даволі сур'ёзныя. У прыватнасці, у адной з характарыстык на М.В. Кочатава зазначалася, што ён "неплохо знает исторические факты, имеет сравнительно широкое общее развитие, но слабо владеет маркси-

стско-ленинской методалогией”, “не имеет стремления овладеть основными трудами Ленина и Сталина”, “до настоящего времени не ознакомился даже с первым томом сочинений товарища СТАЛИНА”. Па сведчанні характарыстыкі, М.В. Кочатаў “идеализирует польско-литовкий период истории БССР”, “много внимания уделяет истории личностей и не показывает классовую сущность борьбы”, “защищает теорию славянской колонизации восточно-европейской равнины” [1, арк. 20]. Прынамсі некаторыя з прыведзеных заўваг выглядаюць праўдападобна. Відавочна, на фарміраванне гістарычных поглядаў М.В. Кочатава аказаў уплыў яго настаўнік, медыявіст К.В. Базілевіч.

Больш таго, неаднаразова падкрэслівалася, што ў час вайны Мікалай Васільевіч знаходзіўся на акупаванай тэрыторыі. Але пасля таго, як ён пакінуў пасаду загадчыка пра гэта забыліся і ў характарыстыках пачалі пісаць, што тав. Кочатаў правільна ўспрыняў крытыку і пачаў працаваць над сабой. Апошняе падштурхоўвае да гіпотэзы пра тое, што гэтыя абвінавачванні з’явіліся, каб адхіліць М.В. Кочатава ад кіравання кафедрай.

У далейшым Мікалай Васільевіч працаваў на пасадзе дацэнта кафедры гісторыі СССР ажно да пераводу гістарычнага факультэта ў 1955 г. у Магілёў і не меў ніякіх нараканняў.

У верасні 1946 г. новым загадчыкам кафедры гісторыі СССР стаў удзельнік Вялікай Айчыннай вайны *Яўсей Майсеевіч Рынбург*. Ён нарадзіўся ў 1904 г. у сялянскай сям’і на Бабруйшчыне. З 1928 г. член ВКП(б). У 1920-я гады Я.М. Рынбург працаваў на будаўніцтве і ў сельскай гаспадарцы. У 1931-1934 гг. навучаўся ў мінскім Камвузе імя У.І. Леніна, а ў 1937 г. скончыў Мінскі педагагічны інстытут імя М.Горкага. З 1938 па 1941 гг. Яўсей Майсеевіч быў аспірантам і выкладчыкам рабфака БДУ, падрыхтаваў дысертацыю, але з-за вайны здолеў абараніць яе толькі ў 1946 г. у Кіеўскім дзяржаўным універсітэце імя Т.Р. Шаўчэнкі.

З 1941 па 1946 гг. Я.М. Рынбург праходзіў службу ў Чырвонай Арміі, дзе з 1943 г. займаў пасаду інструктара палітычнага аддзела дывізіі. Узнагароджаны ордэнам “Чырвонай зоркі” і медалём “За перамогу над Германіяй”.

Пасля дэмабілізацыі ў 1946 г. Яўсей Майсеевіч пачаў працаваць выконваючым абавязкі загадчыка кафедры гісторыі СССР у ВДПІ і займаў названую пасаду да 1948 г. Але, відаць, у адносінах з кіраўніцтвам інстытута ў Я.М. Рынбурга ўзніклі праблемы. На гэта маглі паўплываць як асабістыя міжасабовыя адносіны, так і нацыянальнасць загадчыка, якія ва ўмовах барацьбы з касмапалітызмам і гучных судовых працэсаў адмоўна адбіліся на яго кар’еры. Таму характарыстыкі перыяду яго працы ў ВДПІ моцна адрозніваюцца ад пазнейшых. У прыватнасці, у характарыстыцы, датаванай маем 1948 г., гаворыцца, што “тов. Ринбург не стоит на должной высоте ни как

преподаватель вуза, ни, тем более, как руководитель кафедры”, яго лекцыі “схематичны и поверхностны по содежанию и в буквальном смысле неграмотны по форме”, і гэта усё пры “отсутсвии должной общей культуры, неграмотной устной и письменной речи” [2, арк. 4]. Узнікае пытанне, як такі чалавек мог на працягу доўгіх гадоў выкладаць у навучальных установах, быць інструктарам палітаддзела дывізіі і абараніць дысертацыю? Таму хутчэй за ўсё гэтая характарыстыка не адпавядае сапраўднасці і стала вынікам нечага жадання звольніць Я.М. Рынбурга з працы ў ВДПІ. Гэта атрымалася ў 1948 г., калі Яўсей Майсеевіч напісаў заяву пра звальненне па ўласным жаданні.

Хто ўзначальваў кафедру пасля Рынбурга высветліць пакуль не ўдалося. Таму гэта справа будучыні. У верасні 1950 г. выконваючым абавязкі загадчыка кафедры гісторыі СССР ВДПІ стаў *Іван Цімафеевіч Казлоў*. Ён нарадзіўся ў 1905 г. у сялянскай сям’і на Пскоўшчыне. У маладосці І.Ц. Казлоў працаваў у сельскай гаспадарцы, з 1925 па 1927 гг. займася камсамольскай работай. У 1926 г. быў прыняты ў ВКП(б) і накіраваны на вучобу ў Пскоўскую губернскую партшколу. Пасля яе заканчэння працаваў на адказных пасадах у камсамоле і партыі. З 1929 па 1931 гг. вучыўся на завочным аддзяленні Камвуза імя С.М. Кірава ў Ленінградзе. У 1930-х гг. здаў экстэрнам экзамены за універсітэцкі курс, навучаўся у аспірантуры пры камвузе і пры гістфаку Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта, паралельна займаўся выкладчыцкай дзейнасцю. Пасля заканчэння аспірантуры ў 1938 г. Іван Цімафеевіч быў накіраваны на працу ў Валагодскі педагагічны інстытут імя М.В. Ламаносава, дзе працаваў выкладчыкам, а з 1942 г. загадчыкам кафедры гісторыі СССР. З 1947 па 1950 гг. працаваў у Стаўрапольскім дзяржаўным педагагічным інстытуце. У 1942 г. І.Ц. Казлоў абараніў кандыдацкую дысертацыю, а ў 1943 г. – атрымаў вучонае званне дацэнта.

Але на пасадзе загадчыка кафедры ў ВДПІ І.Ц. Казлоў не затрымаўся. 15 лютага 1951 г. з-за сваіх чалавечых слабасцяў Іван Цімафеевіч быў пазбаўлены пасады [3, арк. 11]. Пасля гэтага ён пэўны час працаваў дацэнтам кафедры гісторыі СССР.

З лютага па ліпень 1951 г. часова выконваючым абавязкі загадчыка кафедры гісторыі СССР быў *Віктар Аляксеевіч Ваяхін*. Ён нарадзіўся ў 1911 г. у Санкт-Пецярбурзе. У маладосці працаваў у сельскай гаспадарцы і Ленінградскім гандлёвым порце, скончыў рабфак пры Ленінградскім педагагічным інстытуце імя А. Герцэна. З 1932 па 1937 гг. навучаўся на гістарычным факультэце Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта. У 1937 – 1948 гг. працаваў у Благавешчанскім дзяржаўным педагагічным інстытуце Амурскай вобласці на пасадах выкладчыка і загадчыка кафедры.

У ВДПІ В.А. Ваяхін пачаў працаваць з пачатку 1949 г. на пасад-

зе старшага выкладчыка кафедры гісторыі СССР, непрацяглы час ён узначальваў названую кафедру, але з-за адсутнасці навуковай ступені быў пераведзены на ранейшую пасаду. У час працы у інстытуце Віктар Аляксеевіч характарызаваўся вельмі станоўча як навуковец, педагог, арганізатар і ідэалагічны работнік [4, арк. 15]. У канцы 1954 г. В.А. Ваяхін абараніў дысертацыю "Руская метадычная думка ў канцы XIX – пачатку XX стст." і атрымаў навуковую ступень кандыдата педагагічных навук. У 1955 г. ён быў вызвалены ад займаемай пасады ў ВДПІ у сувязі з пераводам гістфака ў Магілёў.

З ліпеня 1951 г. кафедру гісторыі СССР узначаліў *Аляксандр Іванавіч Раманоўскі,* які нарадзіўся ў 1903 г. у сялянскай сям'і на Міншчыне. Пасля заканчэння сямігодкі і Мінскага педтэхнікума (1927 г.) працаваў на пасадах настаўніка, дырэктара і інспектара школ на Лоеўшчыне. З 1937 па 1940 г. навучаўся на гістарычным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Пасля гэтага быў накіраваны на працу ў Рэчыцкае педагагічнае вучылішча.

Напачатку Вялікай Айчыннай вайны А.І. Раманоўскі быў пакінуты на акупаванай тэрыторыі і ўзначаліў штаб партызанскага атрада імя Фрунзе на Гомельшчыне. У баях з акупантамі атрымаў раненне і кантузію. За удзел у баявых дзеяннях Аляксандр Іванавіч быў узнагароджаны медалём "Партызану Айчыннай вайны" I ступені, ордэнам "Айчыннай вайны" II ступені, медалямі "За Перамогу над Германіяй" і "За мужную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 гг." Пасля вызвалення А.І.Раманоўскі працаваў загадчыкам Рэчыцкага ГарАНА, дырэктарам Рэчыцкага педагагічнага вучылішча [5].

У 1947 г. ён паступіў у аспірантуру пры кафедры гісторыі СССР Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя. У.І. Леніна, дзе працаваў над дысертацыяй "Партызанскі рух у Гомельскай вобласці ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны 1941 – 1945 гг.". Пасля заканчэння аспірантуры А.І.Раманоўскі быў накіраваны на працу ў ВДПІ, дзе ён, як адзначалася раней, з ліпеня 1951 па жнівень 1953 гг. кіраваў кафедрай гісторыі СССР, а затым да пераводу гістарычнага факльтэта ў Магілёў займаў пасаду старшага выкладчыка.

З верасня 1953 г. і да пераводу гістарычнага факультэта ў Магілёў кафедру гісторыі СССР узначальваў *Генадзь Аляксандравіч Грэчкін*. Ён нарадзіўся ў 1928 г. у м. Ула Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і. У 1945-1949 гг. вучыўся на гістарычным факультэце ВДПІ імя С.М. Кірава, а пасля ў аспірантуры Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР (1949 – 1952 гг.). Затым Г.А. Грэчкін працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам у тым жа інстытуце. У 1953 г. паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Год вялікага пералома ў калгасным будаўніцтве Беларускай ССР", адначасова актыўна працаваў над навуковай тэмай "Гісторыя горада Мінска".

У верасні 1953 г. Генадзь Аляксандравіч быў пераведзены з Інстытута гісторыі АН БССР у ВДПІ на пасаду загадчыка кафедры ВДПІ, дзе і працаваў да 1955 г. [6].

Такім чынам, загадчыкі кафедры гісторыі СССР былі выхадцамі з сялян, многія да пачатку працы ў вну працяглы перыяд займаліся фізічнай працай. Большасць кіраўнікоў кафедры не былі ўраджэнцамі Беларусі (акрамя трох) і профільную адукацыю атрымалі па-за яе межамі. Гэта тлучацыцца тым, што беларуская гістарычная школа знаходзілася яшчэ ў стадыіі станаўленя і яе развіцю садзейнічалі выхадцы з іншых рэгіёнаў Савецкага Саюза, многія з якіх атрымалі гістарычную адукацыю ці працавалі над дысертацыйнымі даследаваннямі пры лепшых ВНУ Ленінграда і Масквы. Гэта забяспечвала іх высокі прафесійны ўзровень. Г.А. Грэчкін стаў не толькі самым маладым кандыдатам гістарычных навук і загадчыкам кафедры, але і першыім яе кіраўніком, які скончыў гістфак ВДПІ.

Амаль усе загадчыкі кафедры гісторыі СССР прынялі ўдзел у барацьбе з нацызмам, жылі і працавалі ў цяжкіх пасляваенных умовах, уносілі ўклад у аднаўленне дзейнасці педагагічнага інстытута, гістарычнай адукацыі на Віцебшчыне. На вялікі жаль, далейшы лёс большасці прыгаданых тут гісторыкаў покуль нявысветлены. На нашу думку, вывучэнне іх жыцця і навуковай спадчыны трэба працягваць, бо гэта паспрыяе стварэнню цэласнай карціны развіцця гістарычнай адукацыі і навукі на Віцебшчыне.


1. Личное дело Кочетова Николая Васильевича. На 45 л. // Архив УО “ВГУ им. П.М. Машерова”.
2. Личное дело Ринбурга Евсея Мойсеевича. На 18 л. // Там же. Ф. 204. Оп. 2л. Д. 83.
3. Личное дело Козлова Ивана Тимофеевича. На 22 л. // Там же.
4. Личное дело Ваяхина Виктора Алексеевича. На 33 л. // Там же.
5. Личное дело Романовского Александра Ивановича. На 22 л. // Там же.
6. Личное дело Гречкина Геннадия Александровича. На 45 л. // Там же.


**Гаравая А.А.**

## СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ СІСТЭМЫ ВЫШЭЙШАЙ ФІЛАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў БССР (1944–1961 гг.)

Праблема станаўлення і развіцця сістэмы вышэйшай філалагічнай адукацыі ў БССР у пасляваенны перыяд мае асаблівае значэнне як з навуковага, так і з ідэалагічна-выхаваўчага пункту гледжання пры станаўленні сучаснай мадэлі вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Вышэйшая адукацыя і навука на сёняшнім эта-

пе імкнуцца адпавядаць міжнародным стандартам. Таму ўзнікла неабходнасць грунтоўна скарэкціраваць асноўныя падыходы да накірункаў і перспектыў развіцця вышэйшай адукацыі і ў той жа час захаваць усё лепшае, што было створана савецкай уладай у сістэме вышэйшай адукацыі. Сёння асноўныя ацэнкі гістарычнага развіцця вышэйшай школы ў цэлым, і філалагічнай у прыватнасці, мяняюцца па сутнасці, адбываецца працэс пераасэнсавання навукова-педагагічнай спадчыны савецкага перыяду. Ёсць патрэбнасць у вызначэнні эвалюцыи системы адукацыі ў савецкі час і вывучэнні як пазітыўнага, так і негатыўнага вопыту, які можа быць узяты ў якасці прыкладу для сучаснай мэдэлі адукацыі ці пакінуты ў гісторыі.

Зварот менавіта да вопыту развіцця ***філалагічнай адукацыі*** абумоўлены шэрагам прычын. Па-першае, пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны пачыналася структурнае фарміраванне філалагічнай адукацыі ў ВНУ рэспублікі. Па-другое, філалогія несла на сабе адбітак афіцыйнай дзяржаўнай палітыкі, што дазваляе прааналізаваць яе вызначальны ўплыў на грамадскую і агульнакультурную сферу. Таму, патрэцяе, на гэтым накірунку гістарычнага даследавання ёсць магчымасць для аналізу шляхоў і формаў сацыялізацыі асобы і фарміравання светапогляду савецкага грамадзяніна (нават праз дачыненне да відавочных праяўленняў і вынікаў філалагічнай адукацыі – літаратурных твораў і адметнасці мастацкага слова). Акрамя таго, эфектыўнасць дзейнасці філалагічнай адукацыі ў цэлым уплывала на развіццё адукацыі і навукі ў рэспубліцы. Так як без мовы не можа быць кваліфікаванай падрыхтоўкі на любым профілі навучання.

З вызваленнем у 1944 г. тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкай акупацыі пачынаецца аднаўленне народнай гаспадаркі і многіх бакоў жыцця грамадства ў цэлым. Якраз у гэты час адбываецца станаўленне па сутнасці кардынальна рэфармаванай сістэмы вышэйшай філалагічнай адукацыі. У 1944–1961 гг. ствараецца менавіта ***сістэма*** вышэйшай філалагічнай адукацыі. Нягледзячы на тое, што ў савецкай Беларусі і ў 1920-я і 1930-я гг. філалагічная адукацыя мела месца, але ***сістэмы не было***! Адзіны яскравы факт, што толькі ў 1939 г. створаны першы філалагічны факультэт у БДУ! А пасля вайны ўжо складвалася сістэма вышэйшай філалагічнай адукацыі. У 1961 г. відавочна завяршаецца гэты працэс, што канстатавалася ў абвешчаным на XXII з’ездзе КПСС пераходзе да якасна новага этапу ў развіцці вышэйшай школы і пастаноўкай перад філалогіяй, як адной з гуманітарных навук, задач фарміравання камуністычнай свядомасці ў грамадстве, вывучэння і тэарэтычнага абагульнення вопыту камуністычнага будаўніцтва, распрацоўкі сваімі сродкамі праблем камуністычнага выхавання.

У 1944–1954 гг. была створана сістэма вучэбных установ у Беларусі, якія забяспечвалі падрыхтоўку настаўнікаў-філолагаў. Яна ўключала ў сябе тры складальнікі: філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (5 год навучання), філалагічныя факультэты педагагічных інстытутаў (4 гады навучання), аддзяленні філалогіі настаўніцкіх інстытутаў (2 гады навучання).

Да пачатку 1945 г. у Беларусі ўзнавілі сваю дзейнасць 5 педагагічных (Віцебскі, Гомельскі, Гродзенскі, Мінскі, Магілёўскі) і 9 настаўніцкіх інстытутаў (Баранавіцкі, Віцебскі, Гомельскі, Мінскі, Магілёўскі, Брэсцкі, Мазырскі, Аршанскі, Пінскі) [1, арк. 203]. Факультэты/аддзяленні ВНУ былі традыцыйныя. Філалагічнае аддзяленне ў межах Наркамасветы БССР прысутнічала ў 8 з 9 настаўніцкіх інстытутаў. У першыя пасляваенныя гады тут не было ні аднаго выкладчыка філалагічнага профілю са ступенню ці званнем. З агульнага ліку выкладчыкаў 458 ужо ў 1946/1947 навучальным годзе 10 мелі вучоную ступень доктара навук ці званне прафесара, 71 – ступень кандыдата навук ці званне дацэнта [2, арк. 2]. Педагагічную працу ВНУ распачыналі ва ўмовах матэрыяльна-метадычнай і кадравай нястачы.

У пасляваенны перыяд у БССР востра паўстала праблема размяшчэння ВНУ. СНК БССР прыняў пастанову (у адпаведнасці з рашэннем СНК СССР ад 1943 г., снежань) “О порядке возвращения зданий вузов и техникумов, используемых не по назначению” (1944 г., ліпень). Вучэбныя корпусы, якія часова на перыяд вайны выкарыстоўваліся на патрэбы фронту, павінны былі вяртацца вучэбным установам і выкарыстоўвацца па прамым прызначэнні [3, арк. 40]. Многія вучэбныя карпусы ВНУ амаль цалкам былі знішчаны ў час акупацыі, і матэрыяльна-тэхнічную базу трэба было аднаўляць амаль што з нуля.

Па плану чацвёртай пяцігодкі (1946–1950 гг.) значная ўвага ў аднаўленні грамадства пасля нямецкай акупацыі надавалася ў тым ліку і народнай адукацыі. Выключна важнае месца ў першым пасляваенным пяцігадовым плане як па СССР, так і па БССР адводзілася пытанням падрыхтоўкі кваліфікаванай савецкай інтэлігенцыі, якая павінна была забяспечваць рост сацыялістычнай вытворчасці і культурнага ўзроўню жыцця савецкага народа. Закон аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР паставіў перад савецкай вышэйшай школай наступныя задачы: аднаўленне і пашырэнне сеткі ВНУ; аднаўленне даваеннага кантынгенту студэнтаў ВНУ і інш.

З улікам колькаснага росту агульнаадукацыйных школ былі пабудаваны новыя ВНУ: у 1947 г. – настаўніцкі інстытут у Маладзечне, вячэрні Гродзенскі дзяржаўны педагагічны інстытут. У 1948 г. створаны Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў, у 1949 г. адкрыты Бабруйскі настаўніцкі інстытут, завочнае аддзяленне пры

Мінскім педагагічным інстытуце замежных моў. Такім чынам, у 1950 г. функцыянавала 29 ВНУ, у якіх навучалася 31,6 тысяч студэнтаў (на 67,7% больш, чым да вайны). За перыяд чацвёртай пяцігодкі педагагічнымі ВНУ былі выпушчаны 14022 спецыялісты з вышэйшай адукацыяй, з іх – 9045 (65%) філолагі [4, с. 478]. Аднак гэта не вырашала праблемы настаўніцкіх філалагічных кадраў для школ.

Запатрабаванасць спецыялістаў-філолагаў у школе тлумачылася тым, што менавіта праз мову і літаратуру закладваліся не толькі асновы пісьменнасці і культуры моладзі, але і асновы выхавання савецкага грамадзяніна. Філалогія давала культуралагічны пласт ведаў, выхоўвала адукаваную асобу, што адлюстравана ў задачах філалагічных курсаў (дысцыплін) і кафедральных планах.

Можна канстатаваць, што спецыялісты-філолагі ў грамадства нясуць свой творчы патэнцыял, рэалізуючы наступныя функцыі: прадметна-інфармацыйную (фарміраванне мастацкага разумення слова праз лінгвістыку і літаратуразнаўства, уменне карыстацца лексікалогіяй роднай мовы, а таксама моў іншых народаў, засваенне тэрміналогіі лінгвістыкі і літаратуразнаўства, знаёмства з адметнымі асаблівасцямі біяграфічных звестак праз мастакоў слова); дзейнасна-камунікатыўную (развіццё камунікатыўных здольнасцей, ацэньванне вартасці літаратурнага твора); цэннасна-арыентацыйную (выхаванне ў людзей светапогляду, уздзейнічанне на фарміраванне грамадскай пазіцыі, патрыятызму).

У БССР настаўнікі-філолагі з другой паловы 1940-х гг. і да 1955 г. у асноўным рыхтаваліся праз падобныя інстытуты (тэрмінам 2 гады) – гэта быў самы пашыраны тып ВНУ, якая давала няпоўнаю вышэйшую адукацыю і знаходзілася пад непасрэдным кантролем Міністэрства асветы рэспублікі.

Да пачатку 1950-х гг. ужо была ліквідавана запатрабаванасць школ у педагагічных кадрах па гісторыі, геаграфіі, біялогіі. Аднак астатнія дысцыпліны школьнага курсу – у першую чаргу, філалогія беларуская, руская, замежная – усё яшчэ адчувалі востры кадравы дэфіцыт. Так, з 1290 настаўнікаў, якіх не хапала для школ на 1 верасня 1951 г., – 620 (51%) былі спецыялістамі філалогіі рускай, беларускай і замежнай [5, арк. 299]. Гэта сітуацыя змянялася вельмі марудна. У 1953 г. дэфіцыт настаўнікаў па беларускай/рускай мове і літаратуры складаў 600 (50%) чалавек ад агульнай колькасці неабходных для сярэдняй школы. У той жа час педагагічныя інстытуты ў 1953 г. падрыхтавалі толькі 224 спецыялісты. У першую чаргу, дэфіцыт настаўнікаў-філолагаў тлумачыцца значнай колькасцю гадзін, якія адводзіліся вучэбным планам у школьным навучанні. У іх філалогія займала каля 30% ад агульнай колькасці. З другога боку, пачынаючы з 1951 г., як адзначалася вышэй, хуткімі тэмпамі павялічвалася сетка

сярэдніх школ, што перадвызначыла далейшы лёс настаўніцкіх інстытутаў як прамежкавага тыпу паміж вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія рыхтавалі спецыялістаў толькі для сямігадовай школы (V – VII класаў). І ўжо ў 1955 г. настаўніцкі інстытут быў ліквідаваны.

Да сярэдзіны 1950-х гг. намаганнямі савецкай улады сістэма вышэйшай школы ў цэлым была адноўлена ад наступстваў вайны. З мэтай паляпшэння працы сістэмы вышэйшай школы з сярэдзіны 1950-х гг. пачынаюцца грунтоўныя змены ў структуры вышэйшай філалагічнай адукацыі – уведзены факультэты "шырока профілю" (двухпрофільная падрыхтоўка спецыялістаў па сумежных спецыяльнасцях) і пераход на пяцігадовы тэрмін навучання. Рэфармаванне вышэйшай школы адбывалася ва ўмовах лібералізацыі грамадска-палітычнага жыцця краіны пасля "начнога дакладу" М.С. Хрушчова.

Змены ў наменклатуры спецыяльнасцей афіцыйна былі абгрунтаваны, па-першае, неабходнасцю рацыянальнага выкарыстання настаўніцкіх кадраў; па-другое, хутчэйшым рашэннем праблемы забеспячэння малакамплектных вясковых школ кваліфікаванымі кадрамі настаўнікаў-прадметнікаў; па-трэцяе, неабходнасцю палітэхнізацыі ўсіх сфер вышэйшай адукацыі.

Рэформы сістэмы вышэйшай школы сярэдзіны 1950-х гг. мелі супярэчлівы характар. З аднаго боку, міжпрадметныя сувязі спрыялі больш глыбокаму асэнсаванню і засваенню спецыяльных прадметаў, фарміраванню прафесійных навыкаў. З другога, рэформы праводзіліся без папярэдняй падрыхтоўкі, што выклікала цяжкасці ў арганізацыі працэсу навучання ў ВНУ. Узрасла вучэбная нагрузка на студэнтаў і прафесарска-выкладчыцкі састаў, асобныя тэмы і пытанні дысцыплін дубліраваліся і інш.

Найвышэйшым уздымам у рэфармаванні ўсёй сістэмы народнай адукацыі ў Беларусі, уключаючы і вышэйшую школу, стала прыняцце Вярхоўным Саветам СССР у снежні 1958 г. закона "Об укреплении связи школы с жизнью и о дальнейшем развитии системы народного образования в СССР". Прыняцце гэтага закона ў сферы адукацыі стала рэальным адлюстраваннем ходу тых новых складаных унутрыпалітычных і сацыяльна-эканамічных працэсаў у жыцці савецкага грамадства, пачатак чаму паклаў у 1956 г. ХХ з’езд КПСС. Адначасова падкрэслівалася і неабходнасць канкрэтных дзеянняў па рашэнні складаных праблем, з якімі сутыкнулася савецкае грамадства ў сярэдзіне 1950-х гг., у тым ліку і ў сферы адукацыі. У законе адзначалася, што вышэйшая школа не паспявала за дасягненнямі ў навуцы і тэхніцы, яна аддалялася ад патрабаванняў жыцця, перадача ведаў часцей за ўсё ішла праз "гатовыя" палажэнні без актыўнага ўдзелу аўдыторыі.

Уся сістэма вышэйшай школы павінна была прыняць актыўны ўдзел у разгорнутым будаўніцтве камунізму ў СССР, уводзіліся зусім но-

вые прынцыпы камплектавання ВНУ, зноў новы вiток набыло рэфармаванне iх арганiзацыйнай структуры, форм i метадаў навучання i выхавання студэнцтва, абвешчаныя ўжо ў 1961 г. на XXII з’ездзе КПСС.

Такiм чынам, вывучэнне гiсторыi развiцця вышэйшай школы фiлалагiчнага накiрунку ў перыяд з 1944 па 1961 гг. дазваляе больш глыбока асэнсаваць рэфармацыйныя працэсы сiстэмы адукацыi. Да сярэдзiны 1950-х гг. ствараецца сiстэма вышэйшай адукацыi фiлалагiчнага профiлю. I адразу пачынаецца пошук найбольш аптымальнага i перспектыўнага напрамку ў развiццi вышэйшай школы. На агульнасаюзным i, адпаведна, рэспублiканскiм узроўнi ў сiстэме вышэйшай адукацыi, у тым лiку i фiлалагiчнай, праходзiлi арганiзацыйна-структурныя, мадэрнiзацыйныя працэсы (раздзяленне падвоеных спецыяльнасцей, увядзенне факультэтаў “шырокага профiлю” i пераход на пяцiгадовы тэрмiн навучання, ажыццяўленне “Закона аб сувязi школы з жыццём” i iнш.). У вынiку, можна сцвярджаць, што ў даследаваны час былi сфармiраваны фундаментальныя i практычныя асновы савецкай вышэйшай школы.

1. Материалы Министерства просвещения БССР в плане выпускников педагогических учебных заведений республики. 1953–1955 гг. // НАРБ. Фонд 4 п. Воп. 17. Спр. 153.

2. Приказы Министра высшего образования СССР, о нормах оплаты преподавателям вузов педагогических часов, данных сверх уста-новленных норм педагогической работы 1947 г. // ДАВВ. Ф. 204. Воп. 10. Спр. 8.

3. Постановления СНК БССР, о возобновлении сети заочного педагогического образования. 1944 г. // НАРБ. Ф. 7. Воп. 3. Спр. 20.

4. Навука БССР за 50 год / Акадэмiя навук Беларускай ССР; рэкал.: В.Ф. Купрэвiч [i iнш.]. – Мiнск: Навука i тэхнiка, 1968. – 608 с.

5. Приказы по Министерству просвещения БССР 1952 г. // НАРБ. Ф. 42. Воп. 4. Спр. 80.

**Качан Г.А.**

## ВЫСШЕЕ ПЕДАГОГИЧЕСКОЕ ОБРАЗОВАНИЕ НА ВИТЕБЩИНЕ (1944–1961 гг.)

После освобождения территории Белоруссии от немецко- фашистских захватчиков в республике начался процесс активного восстановления разрушенного войной хозяйства. Одновременно велась работа по подготовке к 1944/45 учебному году системы народного образования, средних специальных и высших учебных заведений. Так, в республике было открыто 10 462 школы, в том числе 8613 – начальных, 1563 – семилетних и 286 – средних.

Масштабность задач послевоенного возрождения народного хозяйства требовала быстрых темпов количественного и качественного роста кадров для всех его сфер. В связи с этим на 6-ой сессии Верховного Совета БССР (март 1944 г.) отмечалось, что «центральное место в области народного просвещения принадлежит мероприятиям, направленным на осуществления закона о всеобщем обязательном обучении» [7, с. 138-139]. Восстановление и расширение сети школ, детских садов, детских домов породило проблему дефицита учительских кадров. По данным Наркомпроса БССР, в республике в 1944/45 учебном году не хватало 11 тыс. педагогов [2, с. 390]. Качественный состав работников народного образования был так же низок. В том же 1944/45 учебном году лишь 8,8% учителей имели высшее педагогическое образование [6, с. 23]. Все эти факторы явились основными побуждающими мотивами для быстрейшего восстановления системы высшего педагогического образования в Беларуси, а, следовательно и на Витебщине.

В ноябре- декабре 1942 года по инициативе ЦК КП(б)Б из рядов Красной Армии и партизанских отрядов была отозвана большая группа сотрудников высших учебных заведений, которой под руководством Наркомпроса БССР было поручено разработать мероприятия по восстановлению вузов республики, в том числе педагогических и учительских институтов. Следует отметить, что вопрос ставился о возобновлении деятельности не отдельных педагогических вузов, а именно всей системы высшего педагогического образования.

На Витебщине первыми среди педвузов начали функционировать Витебский педагогический и учительский институты, в которых учебные занятия начались со 2 октября 1944 года. Витебский пединститут возобновил свою деятельность в составе физико-математического, естественного и исторического факультетов, а учительский институт – в составе физико-математического и естественно-географического отделений. На все курсы всех факультетов пединститут должен был принять 180 человек, а учительский – 210 [1, с. 17].

Осенью 1944 года начал свою работу также и Оршанский учительский институт в составе двух отделений: исторического, языка и литературы. План приема на все курсы всех отделений составил 130 человек [1, с. 18]. С 1945 года в Оршанском учительском институте открылось историко - филологическое отделение, которое спустя год было реорганизовано в два самостоятельных отделения: отделение языка и литературы (русское и белорусское).

Следует отметить, что, несмотря на все усилия: организацию месячных подготовительных курсов, оповещения по радио и в печати о возобновлении своей деятельности, выезда преподавателей в различные районы для проведения разъяснительной работы первый послевоенный план набора в педагогический и учительские институты

выполнить не удалось. Причины недобора были связаны, с одной стороны, с тем, что значительная часть молодежи еще находилась в действующей армии, а, с другой, с малочисленным выпускам учащихся средних школ. В 1944 году в Беларуси 10- ые классы окончило всего 180 человек, а только в одни учительские институты планировалось принять 1320 человек [3, с. 1]. Как следствие этого на первый курс Витебского пединститута было принято 91 чел., а Витебского учительского института – 104 чел.

В апреле 1949 года правительство Белоруссии принимает постановление за № 394 «О мерах по обеспечению школ республики педагогическими кадрами в связи с введением всеобщего семилетнего образования». В связи с этим увеличивался набор в педвузы, а также расширялся перечень специальностей, по которым осуществлялась подготовка.

С 1949/50 учебного года в 10 классах средних школ республики вводится новый предмет – логика и психология. Учительские кадры, имевшие соответствующую подготовку, отсутствовали. В связи с эти в ряде педагогических институтов открывается новая специальность логика и психология. В Витебском пединституте она была введена на историческом факультете с 4 курса. В 1954 году исторический факультет Витебского педагогического института был передан историческому факультету Могилевского пединститута. Одна из мотиваций принятия такого решения - слияние малочисленных факультетов в более крупные.

На развитие высшего педагогического образования на Витебщине оказывали влияние изменения, происходившие в системе образования. Так, в начале 50-х годов произошло некоторое сокращение семилетних школ, и расширилась сеть средних школ, что привело к дефициту кадров для средней школы, а выпуск специалистов для работы в 5-7 классах начал превышать их реальную потребность. Как следствие этого, в 1953 году закрывается Витебский учительский институт, а с 1953/54 учебного года начинает свою деятельность Полоцкий пединститут [4, с. 42]. Приказом № 243 по Министерству просвещения БССР с 1 сентября 1955 года закрылся последний учительский институт в Витебском регионе – Оршанский.

Закрытие учительских институтов было вполне логичным шагом в упорядочении сети высшей педагогической школы Беларуси. Однако следует отметить, что недостатки в планировании структуры пединститутов и контингента студентов в них привели к отставанию подготовки учительских кадров по отдельным специальностям (физика, иностранные языки, филология) от их потребности.

С 1956/57 учебного года педагогические институты Республики были переведены на 5-летний срок обучения и специализацию студентов по широкому профилю. В результаты произошла реорганиза-

ция и структуры педвузов. Так, на базе отделений физики и математики образовывались физико-математические факультеты, осуществляющие подготовку по 4 специальностям: физика, черчение и основы производства; математика, черчение; физика, математика и основы производства; математика, черчение и основы производства. В составе факультетов языка и литературы отделения белорусского языка и литературы, русского языка и литературы упразднялись и создавались филологические факультеты готовящие, преподавателей белорусского и русского языка и литературы.

Реформа системы высшего педагогического образования в 1956-57 гг. привела к неоднозначным результатам в деле подготовки учительских кадров. Это проявилось в увеличении сроков обучения и расширении профиля специальностей, что позволило, с одной стороны, полнее использовать выпускников педвузов на работе в небольших семилетних, да и средних школах, обеспечивая их необходимой учебной нагрузкой, а также более качественно готовить будущих педагогов к практической работе. С другой стороны, высшая педагогическая школа Беларуси, не была подготовлена к преобразованиям в своей деятельности и перестраивалась методом проб и ошибок. В процессе учебного года объединялись факультеты, вводились новые учебные планы, пересматривались учебные поручения преподавателей, менялось расписание занятий. Не совсем удачным было и порой объединение специальностей.

Дальнейшие изменения в системе высшего педагогического образования (1958-1961 гг.), а, следовательно, и в функционирование педагогических институтов Витебщины были продиктованы реорганизацией общеобразовательной школы, Законом «Об укреплении связи школы с жизнью и о дальнейшем развитии системы народного образования в Белорусской ССР» [5, с. 44-49]. Педвузы республики были призваны улучшить подготовку учителей с учетом введения всеобщего обязательного восьмилетнего образования, расширить выпуск специалистов с высшем образованием для начальной школы, а также усилить политехническую подготовку педагогических кадров. Изменялся несколько и порядок комплектования вузов студентами. Преимуществом пользовалась молодежь, имевшая опыт практической работы.

На протяжении 1957- 1958 гг. в пяти педагогических институтах, в том числе и Витебском, были открыты факультеты начальных классов. В Витебском désинституте открывается также художественно- графический факультет на базе ранее существовавшего в городе художественно- графического училища.

Значительное влияние на функционирование педвузов Витебщины в 40-50 –е годы XX столетия оказывала их учебно-материальная база, наличие конкурсного отбора при зачислении абитуриентов, а

также качественный и количественных состав профессорско - преподавательских кадров.

В первый послевоенный учебный год все педвузы Беларуси столкнулись с серьезными проблемами и не смогли вовремя начать учебный год. Так, не были подготовлены учебные корпуса, не хватало мебели, учебного оборудования, практически отсутствовали общежития для студентов. Как следствие этого, учебные занятия проводились в 2, а то и 3 смены, в переполненных аудиториях. Учебные корпуса Витебского педагогического и учительского институтов были полностью сожжены во время войны, поэтому учебные занятия пришлось организовывать в одном из корпусов частично уцелевшего студенческого общежития. Оршанский учительский институт также размещался в здании бывшего студенческого общежития. В 1946/47 учебном году здесь на одного студента приходилось в среднем 1,15 кв. м. полезной площади.

Несмотря на трудное экономическое положение правительство, местные советские и партийные органы республики провели ряд мероприятий по упрочению материально-технической базы институтов: выделялись финансовые и материальные средства на строительство учебных корпусов, закупку оборудования, на издание учебников, учебно-наглядные пособий. Так, в 1947 году Витебскому пединституту на восстановительные работы было выделено 2479, 5 тыс. руб., Оршанскому учительскому институту – 618, 6 тыс. руб. [1, с.33]. Активную роль в восстановлении учебно- материальной базы своих учебных заведении играли студенты: ремонтировали мебель, участвовали в восстановительных работ, изготавливали наглядные пособия и оборудование.

Совместное взаимодействие комплекса мер, направленного на укрепление учебно- материальной базы педвузов республики на протяжении 1944 - 1950 гг., позволило заметно ее улучшить. Так, в 1949 году был восстановлен корпус студенческого общежития Витебского пединститута, а к концу 1950 г. – учебный корпус. В последующие годы пристальное внимание правительством республики уделялось восстановлению, капитальному ремонту и строительству учебных корпусов и общежитий педагогических институтов, а также оснащенности их необходимым учебным оборудованием, пополнению книжных фондов. К примеру только в 1957/58 учебному году педвузы республики закупили оборудования на сумму 792, 3 тыс. руб., а на приобретение учебной, методической, политической и художественной литературы им было ассигновано более 2 млн. руб. [1, с.35]. Библиотека Витебского пединститута в 1959/60 учебном году насчитывала 88649 книг, 17400 журналов.

Однако, несмотря на все предпринимаемые меры острой для высшей педагогической школы оставалась проблема наличия учебных и жилых площадей. Так, в Витебском пединституте учебные занятия

по- прежнему проводились в две смены, отсутствовали жилые дома для преподавателей и научных сотрудников, что значительно осложняло дело с подбором для вуза квалифицированных кадров. Следует отметить, что из всех педвузов республики в 1957/58 учебном году учебные занятия проводились в одну смену только в Полоцком и Мозырском педагогических институтах.

Таким образом, к концу 1960 года на Витебщине функционировал единственный педагогический институт – Витебский, так как Полоцкий педвуз был закрыт в 1959 году, а его два курса физико-математического факультета были переданы Витебскому пединституту. Значительно улучшилась и учебно- материальная база Витебского педагогического института, которая в основном удовлетворяла требования к организации учебно- воспитательного процесса. И все-таки, необходимо признать, что рост учебных площадей постоянно поглощался ростом контингента студентов, что не лучшим образом сказывалось на функционировании учебного заведения.


1. Качан, Г.А. Развитие системы высшего педагогического образования в Белоруссии (в период с 1944 по 1960 годы): дис. … канд. пед. наук: 13.00.01 / Г.А. Качан. – Минск, 1994. – 196 с.
2. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). Ф. 4, оп. 17, д. 21
3. НАРБ. Ф.4, оп.17, д. 21
4. НАРБ. Ф. 42, оп. 4, д. 257
5. Першая сессія Вярхоунага Савета Беларускай ССР пятага склікання, 7-9 красавіка 1959 года: Стэнаграфічная справаздача. – Мн., 1959. – 260 с.
6. Саевич, П.В. Народное образование в БССР / П.В. Саевич. – Мн.: Госиздат, 1950. – 39 с.
7. Шостая сессія Вярхоунага Совета БССР, 22-24 сакавіка 1944 года. – Мн., 1946. – С. 138 – 139.



**Юргевіч Н.К.**


## АДНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ АДУКАЦЫІ НА ВІЦЕБШЧЫНЕ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1940-х – ПАЧАТКУ 1950-х гг.

У гады Вялікай Айчыннай вайны разам з усім беларускім народам работнікі адукацыі і культуры змагаліся супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Многія з іх не вярнуліся з франтоў Вялікай Айчыннай вайны. Значнымі былі і матэрыяльныя страты ў галіне адукацыі БССР. Асабліва цяжкае становішча было ва ўсходніх раёнах БССР, дзе праходзілі самыя крывапралітныя і жорсткія баі ў гады вайны. У Суражскім, Лёзненскім, Віцебскім раёнах Віцебскай і іншых абласцей БССР ворагі знішчылі і разбурылі ўсе набыткі даваеннага

будаўніцтва. Агульныя страты, прычыненыя ўстановам адукацыі БССР у гады вайны, склалі 4,6 млрд руб. (у даваенным маштабе цэн).

Аднаўленчыя работы ў рэспубліцы разгортваліся адразу пасля выгнання нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У галіне адукацыі, у першую чаргу, асноўная ўвага ўдзялялася аднаўленню агульнаадукацыйнай школы. На 15 лістапада 1943 г. заняткі вяліся ў 259 школах на тэрыторыі Віцебскай (19 школ), Гомельскай (38 школ), Магілёўскай (193 школы), Палескай (9 школ) абласцей [3, арк. 5]. Для стварэння і ўмацавання матэрыяльнай базы ўстаноў адукацыі VI сесія Вярхоўнага Савета БССР, якая адбылася ў красавіку 1944 г., прыняла рашэнне аб выдзяленні з бюджэтных сродкаў на аднаўленне народнай адукацыі рэспублікі 146300 тыс. руб. або 34,5% ад усіх асігнаванняў, прадугледжаных на развіццё народнай гаспадаркі рэспублікі [2, с. 74]. У адпаведнасці з пастановай ЦК УКП(б) "Аб бліжэйшых задачах партыйных арганізацый КП(б)Б у галіне масава-палітычнай і культурна-асветніцкай работы сярод насельніцтва" ад 9 жніўня 1944 г. СНК БССР і ЦК КП(б)Б абавязаліся, у першую чаргу, аднавіць да пачатку 1944 – 1945 навучальнага года сетку пачатковых, сямігадовых і сярэдніх школ і ахапіць навучаннем усіх дзяцей школьнага ўзросту. У снежні 1944 г. у Беларусі ўжо працавала 10657 школ, навучаннем было ахоплена 124637 дзяцей і падлеткаў [5, с. 141].

Дзяржаўныя асігнаванні, будаўніцтва метадам народнай ініцыятывы і сацыялістычнае спаборніцтва спрыялі будаўніцтву новых школьных будынкаў, вывядзенню школ з наёмных памяшканняў, умацаванню іх матэрыяльнай базы, набыццю вучэбнага абсталявання, падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, уладкаванню прышкольных тэрыторый,. Вялікую ролю адыграла дапамога мясцовых прадпрыемстваў і арганізацый у папаўненні матэрыяльнай базы школ, а таксама ўдзел грамадскасці, саміх настаўнікаў, вучняў і іх бацькоў у рамонтных работах і падрыхтоўцы школ да новага навучальнага года. Так, у сельскай мясцовасці значную ролю адыграла ініцыятыўнае будаўніцтва намаганнямі вяскоўцаў, якія на свае і калгасныя сродкі аднавілі толькі з 1946 па 1955 гг. 4356 школ на 377 тыс. вучнёўскіх месцаў, што дазволіла кіраўніцтву многіх раёнаў поўнасцю вывесці сельскія школы з наёмных памяшканняў. Колькасны рост агульнаадукацыйных школ БССР адбываўся да сярэдзіны 1950-х гг.: калі ў 1945 – 1946 гг. іх было 10915, то ў 1950 – 1951 гг. — 11167. Але ў выніку наступстваў ад пагаршэння дэмаграфічнай сітуацыі ў гады вайны іх колькасць да сярэдзіны 1950-х гг. зменшылася (да 10831) [6, с. 38]. У сувязі з наяўнасцю вялікай колькасці дзяцей-пераросткаў аднаўляліся і будаваліся перш за ўсё пачатковыя школы.

У першыя пасляваенныя гады матэрыяльная база ўстаноў адукацыі БССР заставалася вельмі слабай. У пастанове Калегіі Народ-

нага Камісарыята асветы БССР (з 1946 г. Міністэрства адукацыі) ад 13 снежня 1945 г. адзначалася, што да 1944 – 1945 навучальнага года не падрыхтавана большасць школ у Талачынскім, Сіроцінскім, Мехаўскім раёнах Віцебскай вобласці: заставаліся неадрамантаванымі памяшканні, не было завезена паліва, не набыта абсталяванне [1, арк. 4]. Асаблівыя цяжкасці ўзнікалі ў школах пры набыцці паліва ў перыяд наступлення халадоў. Як правіла, усе справаздачы сведчылі пра падрыхтаванасць школ да работы ў такіх умовах. Аднак рэальнае становішча даволі часта было зусім іншым. Так, на пачатак ацяпляльнага сезона ў 1950 – 1951 навучальным годзе ў Віцебскай вобласці толькі 580 школ мелі гадавы запас паліва, 258 мелі крыху больш за 50%, а ў 86 школах паліва зусім не завезлі [4, арк. 127]. Гэта, у асноўным, былі пачатковыя школы, якія размяшчаліся ў наёмных памяшканнях і ацяпляліся гаспадарамі. У некаторых школах адказнасць за нарыхтоўку паліва ўскладалася на саміх настаўнікаў. У такіх умовах вельмі цяжка было дабіцца станоўчых вынікаў у навучанні і выхаванні дзяцей (вучні часта хварэлі і прапускалі заняткі). Праблема з палівам заставалася актуальнай і для пазнейшых часоў.

Нягледзячы на пастаянную ўвагу партыйных і савецкіх органаў, аддзелаў народнай адукацыі да названай праблемы, нават у 1950-я гг. па-за школай заставалася шмат дзяцей. Значным заставаўся і адсеў сярод вучняў са школ на працягу года. Нават у сярэдзіне 1954 г. усе дзеці былі ахоплены школай толькі ў 6-ці раёнах БССР. Эканамічныя праблемы ў пасляваенныя гады ў БССР амаль паўсюдна выклікалі выкарыстанне дзіцячай працы на прадпрыемствах, у калгасах, сялянскіх гаспадарках, што не дазваляла органам народнай адукацыі вырашыць праблему ўсеагульнага навучання дзяцей школьнага ўзросту. У многіх выпадках паўплывала на гэта і недаацэнка вучнямі і іх бацькамі ролі і месца адукацыі ў жыцці.

Дзяржавай вырашаліся пытанні аб забеспячэнні агульнаадукацыйных школ БССР педагагічнымі кадрамі праз рээвакуацыю і запрашэнне настаўнікаў з усходніх абласцей СССР. Асаблівую ўвагу ў пасляваенныя гады органы народнай адукацыі надавалі якаснаму складу педагагічных кадраў, асабліва ў заходніх абласцях Беларусі. Падазроныя адносіны былі да тых настаўнікаў, якія пражывалі ў гады вайны на акупаванай немцамі тэрыторыі ці працавалі ў нямецкіх установах. У 1944 г. Народным камісарыятам асветы быў выдадзены загад аб звальненні з працы настаўнікаў, якія ў час акупацыі займалі кіруючыя пасады, а тых, што працавалі ў школе, прымусова прапаноўвалася перавесці ў іншыя раёны БССР, бо яны не маглі карыстацца аўтарытэтам сярод насельніцтва.

У першыя пасляваенныя гады дзяржава актыўна вырашала праблему падрыхтоўкі прафесійных настаўніцкіх кадраў праз адкрыц-

цё сеткі педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў, педвучылішчаў, завочнага і вячэрняга навучання. У жніўні 1944 г. у рэспубліцы былі адкрыты Беларускі інстытут культуры і спорту, Мінскі, Гомельскі, Гродзенскі, Магілёўскі педагагічныя інстытуты, Баранавіцкі, Мазырскі, Пінскі настаўніцкія інстытуты, 24 педвучылішчы. Асаблівую ролю адыгралі створаныя пры іх шматлікія настаўніцкія курсы, арганізаваныя ў абласных і раённых цэнтрах. Паводле дадзеных Наркамасветы БССР летам 1944 г. на кароткатэрміновых курсах вучыліся 1222 чалавекі, а ў лістападзе-снежні для работы ў пачатковых класах было падрыхтавана больш 2700 настаўнікаў [2, с. 76]. Аднак кваліфікацыйны ўзровень настаўнікаў, якіх рыхтавалі на курсах, быў вельмі нізкім. Таму ў пасляваенныя гады большасць настаўнікаў, асабліва з сельскай мясцовасці, павышала свой кваліфікацыйны ўзровень праз завочнае навучанне. Так, у 1946 г. Віцебскі АблАНа разам з кіраўнікамі педагагічных навучальных устаноў арганізаваў у сярэдніх школах абласнога і раённых цэнтраў прыёмныя іспыты і афармленне на вучобу ў гг. Віцебск, Бешанковічы, Гарадок, Орша для настаўнікаў-завочнікаў. Разам з тым у нядзельныя дні праводзіліся прыёмы залікаў і кансультацыі па вывучаемых прадметах. На перыяд зімовай сесіі арганізоўваліся філіялы Лепельскага педвучылішча ў г. Орша, Віцебскага педвучылішча – у Бешанковічах [10, арк. 1]. Такія мерапрыемствы, безумоўна, былі добрай маральнай і матэрыяльнай падтрымкай (выдаткі на вучобу, пражыванне, праезд зніжаліся) для сельскай інтэлігенцыі ў пасляваенныя гады.

Адцягвала ўвагу настаўнікаў ад вучобы актыўнае прыцягненне іх да ўдзелу ў розных дзяржаўных мерапрыемствах – ад ліквідацыі непісьменнасці да збору падаткаў. Так, на зімовую сесію 1945 – 1946 навучальнага года ў педагагічныя вучылішчы і інстытуты Віцебскай вобласці прыехалі не ўсе студэнты: у Віцебскае педвучылішча 141 завочнік (26%), Лепельскае – 72 (38%), у Віцебскі педагагічны і настаўніцкі інстытуты – 224 (69%), у Аршанскі настаўніцкі інстытут – 124 (65%) чалавекі [7, арк. 5]. Галоўнай прычынай стала занятасць настаўнікаў у выбарчай кампаніі: яны працавалі старшынямі ці сакратарамі выбарчых камісій. Да таго ж, для студэнтаў-завочнікаў часта не хапала месцаў у інтэрнатах, у перыяд сесіі ім даводзілася шукаць прыватныя кватэры, што ўплывала на матэрыяльнае становішча сямей настаўнікаў. Частка беларускіх настаўнікаў заставалася не ахопленай завочным навучаннем і з прычыны работы ў дзве ці тры змены, складанасцямі з вучэбнай літаратурай, грамадскай работай, цяжкім матэрыяльным становішчам. У пасляваенныя гады не мелі патрэбнай адукацыі дырэктары школ, загадчыкі раённых аддзелаў народнай адукацыі і педагагічных кабінетаў рэспублікі. Па стане на 15 студзеня 1953 г. з 58 дырэктараў сярэдніх школ Віцебскай вобласці 18

не мелі вышэйшай адукацыі, з 254 дырэктараў сямігадовых школ 104 не мелі дыпломаў за настаўніцкія інстытуты, з 16 загадчыкаў РАНа гэтай вобласці толькі 2 мелі вышэйшую адукацыю [9, арк. 5]. Часта на кіруючыя пасады прызначаліся людзі, якія не мелі ні патрэбнай педагагічнай адукацыі, ні вопыту працы.

Характэрнай з'явай у пасляваенныя гады было камплектаванне спачатку школ сталіцы, абласных і раённых цэнтраў і толькі потым – сельскіх. Так, да пачатку 1954 – 1955 навучальнага года ў г. Віцебск былі накіраваны 23 чалавекі з вышэйшай адукацыяй, г. Оршу – 6 чалавек, г. Полацк – 9 чалавек, у той час як у Расонскі раён – 3 настаўнікі, Ульскі – 4 чалавекі, Коханаўскі – 2, Ушацкі – 3, Суражскі – 1, Сенненскі – 1 [10, арк. 1]. Унутрыраённае размеркаванне на працу вялося па аналагічным прынцыпе – больш падрыхтаваныя спецыялісты заставаліся ў школах раённага цэнтра. Такім чынам, сельскія школы ў пасляваенныя гады камплектаваліся педагагічнымі кадрамі па астаткавым прынцыпе – толькі пасля размеркавання ў гарадскіх школах.

Мясцовыя ўлады выконвалі дзяржаўныя пастановы аб замацаванні педагагічных кадраў праз адміністрацыйныя і гаспадарчыя мерапрыемствы. Але часта няўважлівыя адносіны да праблем сельскай інтэлігенцыі ў пасляваенныя гады (размеркаванне настаўніцкіх картак і талонаў сярод іншых асоб, немагчымасць іх атаварыць у магазінах, затрымка заработнай платы на 2-11 месяцаў, недахоп жылля, газы, паліва з прычыны іх адсутнасці) выклікалі зменнасць сярод настаўнікаў і ўладкаванне іх у іншыя арганізацыі. З прычыны цяжкага матэрыяльнага становішча і складаных умоў працы значная колькасць выпускнікоў навучальных педагагічных устаноў не жадала працаваць у школе і не прыязджала да месца размеркавання, асабліва ў сельскую мясцовасць. Толькі з Віцебскай вобласці ў 1952 г. выбылі 324 настаўнікі, 10 чалавекам у раённых аддзелах адукацыі былі выдадзены "неабгрунтаваныя адмацаванні" [10, арк. 6].

Нягледзячы на цяжкасці пасляваеннага жыцця, у рэспубліцы назіраўся колькасны рост педагагічных кадраў: калі ў 1940 – 1941 навучальным годзе працавала ў беларускіх школах 56,9 тыс. настаўнікаў, у 1945 – 1946 гг. — 40,2 тыс. чалавек, то ў 1950 – 1951 гг. — 64,4 тыс., у 1955 – 1956 гг. — 78,8 тыс. [6, с. 398]. Паляпшаўся і якасны склад настаўніцкіх кадраў: калі ў 1944 – 1945 навучальным годзе ў школах БССР працавала 19,7% настаўнікаў з вышэйшай і няпоўнай вышэйшай адукацыяй, то ў 1950 – 1951 гг. — 30,2%, а ў 1955 – 1956 гг. — каля 50% [8, с. 306].

Такім чынам, аднаўленню сістэмы адукацыі БССР садзейнічалі дзяржаўныя асігнаванні, пастановы і рашэнні цэнтральных партыйных і савецкіх органаў кіравання па будаўніцтве і развіцці сеткі агульнаадукацыйных школ, педвучылішчаў і ВНУ рэспублікі, ініцыятыўнае

будаўніцтва вучэбных памяшканняў намаганнямі грамадскасці, меры, якія прымаліся дзяржавай па падрыхтоўцы настаўніцкіх кадраў, іх матэрыяльнай падтрымцы, па забеспячэнні ўсеагульнага навучання дзяцей і моладзі. Аднак эканамічныя праблемы і цяжкасці пасляваеннага жыцця стрымлівалі развіццё ўстаноў адукацыі Беларусі.


1. Витебский областной отдел народного образования (декабрь 1944 – апрель 1952 гг.) // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 2797. Воп. 1. Спр. 3.
2. Грыгор'ева, А. Кампартыя Беларусі ў барацьбе за аднаўленне школы і выхаванне педагагічных кадраў у 1944 – 1945 гг.: [з гісторыі школы] / А. Грыгор'ева // Народная асвета. – 1966. – № 4. – С. 74 – 79.
3. Докладные записки на имя СНК БССР и ЦК КП(б)Б (29.06.1944 – 20.12.1944 гг.) // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 42. Воп. 4. Спр. 5.
4. Докладные о выполнении решений вышестоящих органов партии и правительства (15.01.1951 – 03.08.1951 гг.) // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 2797. Воп. 1. Спр. 195.
5. Макарэвіч, М.В. Развіццё агульнаадукацыйнай школы ў БССР за пасляваенныя гады / М.В. Макарэвіч // Весці АН БССР. Серыя грам. навук. – 1958. – № 3. – С. 140-149.
6. Народное образование, наука и культура в СССР: стат. сборник / сост. Н.Я. Панферова. – М., 1977. – 448 с.
7. Отчет ОблОНо о работе школ и материалы к нему за 1945 – 1946 гг. // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 2797. Воп. 1. Спр. 11.
8. Парашкоў, С.А. Гісторыя культуры Беларусі: вучэбны дапаможнік / С.А. Парашкоў. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2001. – 296 с.
9. Постановления и директивные указания вышестоящих органов по вопросам народного образования (26.01.1953 – 08.12.1953 гг.) // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Фонд 2797. Воп. 2. Спр. 3.
10. Решения облисполкома, отчеты о работе школ и докладные (1953 – 1954 гг.) // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Фонд 2797. Воп. 2. Спр. 6.


**Касатая Т.У.**

## КАМУНІСТЫЧНАЯ ІДЭАЛОГІЯ І РЭЛІГІЙНАЕ ВЫХАВАННЕ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1940-Х-1960-Я ГГ. (НА ПРЫКЛАДЗЕ ДЗЕЙНАСЦІ ЕВАНГЕЛЬСКІХ ХРЫСЦІЯН-БАПТЫСТАЎ У ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ)

"Пусціце дзяцей прыходзіць да Мяне і не перашкаджайце ім, бо такіх ёсць Царства Божае" (Мр. 10:14). Так гучыць асноўны евангельскі прынцып, якога павінны прытрымлівацца бацькі хрысціяне ў выхаванні сваіх дзяцей. Але ў БССР падчас панавання ідэлогіі камунізму прыярытэтнымі з'яўляліся навукова-матэрыялістычны светапогляд і атэістычныя ідэі.

23 студзеня 1918 года СНК РСФСР прыняў дэкрэт “Аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы” [1, с. 373—374]. Гэты акт акрэсліваў прававыя нормы ўзаемаадносін дзяржавы і царквы, пры якіх дзяржава не павінна была ўмешвацца ў дзейнасць рэлігійных арганізацый. У артыкуле 9, напрыклад, адзначалася, што “грамадзяне могуць навучаць і навучацца рэлігіі ў прыватным парадку”. Але на справе праводзілася зусім іншая палітыка. Умяшанне ў канфесіянальныя справы стала нормай на працягу ўсіх гадоў існавання СССР. Асноўнымі задачамі кіраўніцтва краіны былі выкараненне хрысціянскай веры, рэлігійнага светапогляду і пабудова атэістычнага грамадства. На гэта былі скіраваны атэістычнае выхаванне, прапаганда камуністычных ідэй. Але паўплываць на духоўны свет дарослых, змяніць іх перакананні вельмі цяжка. Таму, прытрымліваючыся асветніцкага прынцыпу, што дзіця ёсць “tabula rasa” (з лац. “чыстая дошка”), савецкае кіраўніцтва разгарнула шырокае кола мерапрыемстваў па атэітычным выхаванні ва ўсіх навучальных установах. У 1947 г. было створана таварыства “Веды”. У яго дзейнасці вялікае месца займалі пытанні атэістычнай прапаганды. Віцебскае абласное аддзяленне таварыства праводзіла семінары, арганізоўвала лекцыі, перасоўныя кіналекторыі на навукова-атэістычныя тэмы, выдавала метадычную літаратуру, брашуры. Упаўнаважаны Савета па справах рэлігій пры Саўміне СССР па Віцебскай вобласці ў 1967 г. пісаў пра тое, што дзякуючы дзейнасці партыйных і савецкіх органаў Віцебская вобласць можа і нават павінна стаць перадавой вобласцю ў навукова-атэістычным выхаванні [2].

Але многія вернікі, у тым ліку і Евангельскія хрысціяне-баптысты (ЕХБ) супрацьстаялі такому ідэялагічнаму ціску. Адэпты нелегальнага Савета цэркваў ЕХБ (СЦ ЕХБ) навучалі сваіх дзяцей рэлігіі, прыводзілі іх на богаслужэнніі нават забаранялі ім уступаць у піянеры і камсамол [3]. Так, у “Справаздачна-інфармацыйным дакладзе за 1966 г.” Упаўнаважаны Савета па Віцебскай вобласці адзначаў: “Активная сектантка Н.С. Слобода из д. Дуброва Верхнедвинского района, имея пятерых детей применят к ним меры насилия при обучении их религии и угрожала старшей дочери, что если та придёт домой в пионерском галстуке, она повесит её на этом “дьявольском флажке” [2, арк. 32]. Галоўным уздзеяннем на такіх вернікаў з’яўлялася прыцягненне іх да адміністрацыйнай ці крымінальнай адказнасці. Прасвітараў, якія дазвалялі ўдзел у богаслужэннях дзяцей пазбаўлялі рэгістрацыі, здымалі з пасады. Згодна Пастанове УЦВК і СНК РСФСР “Аб рэлігійных аб’яднаннях” 1929 г. рэлігійным аб’яднанням забаранялася арганізоўваць спецыяльныя дзіцячыя, моладзевыя малітоўныя сходы, мерапрыемствы па навучанню рэлігіі, адчыняць бібліятэкі і кнігарні [3, воп. 2, спр. 15, арк. 61]. Прадстаўнікі СЦ ЕХБ Віцебскай

вобласці звярталіся ў Савет па справах рэлігійных культаў і да старшыні урада СССР з просьбай адмяніць гэту Пастанову і дазволіць рэлігійнае выхаванне дзяцей. Але пасля такіх лістоў толькі ўзмацнялася барацьба супраць вернікаў, што, у сваю чаргу, падштурхоўвала Евангельскіх хрысціян-баптыстаў парушаць заканадаўства аб культах. Сярод баптыстаў Верхнядзвінскага і Докшыцкага раёнаў прыхільнікамі СЦ ЕХБ распаўсюджвалася нелегальная літаратура “Біблейскія размовы з дзецьмі” (10 гутарак-урокаў), “Дарагім малышам” і інш. У гэтай літаратуры адзначалася, што “слово Божие призывает верующих родителей возвещать своим детям о Господе” [3, спр. 19, арк. 87—98]. Таму некаторыя ЕХБ нягледзячы на праследванне з боку дзяржаўных органаў навучалі сваіх дзяцей рэлігіі.

У 1966 г. народны суд Верхнядзвінскага раёна пазбавіў прыхільніцу СЦ ЕХБ Н.С. Слабаду бацькоўскіх правоў за парушэнне заканадаўства аб культах, двух яе дзяцей адправілі ў дзіцячы дом. Але вернікі выступілі супраць гэтага рашэння. З Ленінграда і Малдовы ў дзіцячы дом дзецям Н.С. Слабады дасылалі лісты рэлігійнага зместу. Аб цяжкім лёсе Н.С. Слабады было перададзена па лонданскім радыё “Бі-бі-сі” і амерыканскім – “Голас Амерыкі”. Акрамя гэтага прыхільнікі СЦ ЕХБ напісалі лісты Генеральнаму сакратару ААН У Тану, старшыні Саўміна СССР А.У. Касыгіну і ў іншыя інстанцыі. У лісце да У Тана адзначалася: “… милиционер и несколько лиц в штатском взяли девочек (дети Н.С. Слободы) прямо с урока. Перепуганные дети стали кричать, их посадили в машину. Работавший поблизости отец, услышал крик и прибежал, и бросился к детям, его оттолкнули, из машины неслись душераздирающие вопли. Отец вцепился в машину, его стали бить по рукам… Мы не стали бы обращаться в Международные организации, если бы была хоть маленькая надежда, что наши ходатайства перед Правительством СССР дадут положительные результаты. Но жестокая война против незарегистрированных общин расширяется… Просим сделать всё возможное, чтобы обеспечить: 1) свободу вероисповедания; 2) родителям – право воспитывать детей до совершеннолетия” [2, спр. 5, арк. 53-54]. Але гэты ліст і актыўная дзейнасць прыхільнікаў СЦ ЕХБ не дапамаглі. У 1968 г. Н.С. Слабада і брат яе мужа былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці па артыкулу 222 крымінальнага кодэкса БССР “посягательство на личность и права граждан под видом исполнения религиозных обрядов” да 4-х гадоў пазбаўлення волі [2, воп. 2, спр.12, арк. 1-5]. У 1970 г. астатніх 3-х дзяцей Н.С. Слабады адправілі ў дзіцячы дом, пасля чаго савецкаму ўраду дасылалі тэлеграмы з розных рэгіёнаў Савецкага Саюза. Напрыклад, у тэлеграме ад “матерей-единоверцев” Барнаула гаварылася: “… это преступление перед человечеством, требуем освободить мать, а детей вернуть в свой дом” [2, воп. 2, спр. 15, арк. 21].

Вышэй апісаны толькі адзін з прыкладаў зламаных лёсаў сем'яў ЕХБ. Барацьба з "рэакцыйным сектанцтвам" суправаджалася пакутамі тысяч людзей, у тым ліку і дзяцей са звычайна шматдзетных баптысцкіх сям'яў. Пры гэтым ідэя аб тым, што "баптист должен отделиться от мира", полностью отдать себя в "собственность Богу" [4, с. 419] дапамагала псіхалагічна выжыць у любых умовах.

Такім чынам, ішла жорсткая барацьба ідэялогій. Больш выгоднае становішча меў, канешне, атэізм, бо на яго баку былі і дзяржава і заканадаўства. У газеце «Гродненская правда» быў надрукаваны артыкул карэспандэнта Б. Папова з іранічнай назвай «Святоши села Бородичи». Аўтар абвінавачваў некаторых членаў абшчыны ЕХБ в. Бародзічы Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці ў маральнай шкодзе. ЕХБ «сводили на нет усилия школы, направленные на то, чтобы подготовить из сегодняшних мальчишек и девчонок строителей коммунизма» [5]. Карэспандэнт сцвярджаў, што гэта шкода была нашмат страшней, чым забойства чалавека (!). Бо вернікі жадалі «учредить господство «евангельской идеологии» [5], а гэта значыць атрымаць магчымасць уплываць на грамадскую свядомасць, на што прэтэндавала сама камуністычная партыя. Але пабудаваць камунізм так і не атрымалася. А евангельскі прынцып адказнасці бацькоў за духоўнае выхаванне сваіх дзяцей існуе і зараз.

1. Декреты Советской власти. Т. 1: 25 окт. 1917 – 16 марта 1918. – М.: Госполитиздат, 1957. – 625 с.
2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 1439. Оп. 1. Спр. 3. Арк. 95.
3. ДАВВ. Ф. 4029. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 24
4. Митрохин, Л.Н. Баптизм: история и современность (философско-социологический очерк) / Л.Н. Митрохин. – СПБ, 1997.
5. Попов, Б. "Святоши" села Бородичи / Б. Попов // Гродненская правда. – 1970. – 22 янв. – С. 3.

**Мандрык І.У.**

## СТВАРЭННЕ НЕДЗЯРЖАЎНЫХ ВНУ Ў 90-х гг. ХХ ст.: СТАНОЎЧЫЯ РЫСЫ І ПРАБЛЕМЫ

Рэфарміраванне эканомікі, пераход да рынку, дэмакратызацыя грамадскіх працэсаў, другія фактары значна павысілі прагу насельніцтва да атрымання вышэйшай адукацыі. Гэта і стала адной з прычын стварэння і развіцця новых адукацыйных устаноў недзяржаўнай платнай формы.

На Беларусі недзяржаўныя ВНУ паявіліся ў пачатку 90-х гг. ХХ ст. і да сярэдзіны дзесяцігоддзя адбываўся іх бурны рост: адкрыта

больш двух дзесяткаў. Але стала бачна, што ад вялікай колькасьці ўзнікшых устаноў на выдачу дыплома аб вышэйшай адукацыі адэкватнай аддачы ў галінах гаспадарчага комплексу рэспублікі не адбылося. Па ініцыятыве дзяржаўных улад, саміх стваральнікаў значная частка іх была ліквідавана. У 2000 г. функцыяніравала толькі 13 недзяржаўных ВНУ, 14 іх філіялаў і 5 прадстаўніцтваў. У гэты ж год яны выпусцілі больш 3 тысяч спецыялістаў.

Па дадзеным, якія меліся ў аўтара гэтага артыкула, да 2000 г. на Віцебшчыне было адчынена 8 недзяржаўных фарміраванняў, заявіўшых аб выкананні задач падрыхтоўкі спецыялістаў на ўзроўні вышэйшай школы. Гэта – філіялы Міжнароднага недзяржаўнага інстытута працоўных і сацыяльных адносін (адкрыўся у 1994 г.), Інстытута Сучасных ведаў у Віцебску (1996 г.). Паздней з’явіліся два філіялы Беларускага камерцыйнага інстытута кіравання ў Оршы і Полацку, тры ц’ютарскіх пункты дзістанцыйнай адукацыі Сучаснага Гуманітарнага інстытута, вучэбна-кансультацыйны пункт Санкт-Пецярбуржскага тэхналагічнага універсітэта сервіза ў Віцебску, Оршы і Наваполацку.

Паколькі ў папярэднія гады, у час савецкай улады, вышэйшая школа ў СССР была ў ліку лепшых у Свеце, на першапачатковым этапе свайго развіцця па ўзроўню вучэбнага працэса недзяржаўныя ВНУ адставалі ад сфарміраваўшыхся значна раней дзяржаўных устаноў. У асобных недзяржаўных ВНУ, матэрыяльная база, выкладчыцкі склад, навукова-метадычнае забеспячэнне і сам навучальны працэс былі далекімі ад дасканаласці. Іх бяда заключалася яшчэ і ў тым, што пры стварэнні, начале гэтых устаноў стаялі, часам, людзі, якія да гэтага не працавалі ў сістэме вышэйшай адукацыі, не ведалі спецыфікі яе функцыяніравання. У іх быў, бачна, вялікі вопыт, які яны набылі ў сярэдніх школах, тэхнікумах, а, часам, і ў будаўнічай галіне, але вышэйшая школа – асобны тып установы са сваімі характэрнымі толькі ёй падыходамі. Легкавесны падыход да адкрыцця ўстаноў такой важнасці меў негатыўны вынік: прафанацыя вышэшай ступені адукацыі. Жыццё патрабавала якаснага ўдасканальвання работы вышэйшай школы. Іх праца была ўзята на кантроль у органах дзяржаўнага кіравання. Філіялы беларускіх інстытутаў прайшлі праз ліцэнзіраванне, асобныя – не вытрымалі атэстацыі. Канешне, на гэтым этапе для ВНУ, якія называліся недзяржаўнымі, патрабаванні да ліцэнзіравання і акрэдэтацыі былі жорсткімі, здаваліся завышанымі. Сёння, калі стала бачна, што асобныя недзяржаўныя ВНУ нанеслі сваёй працай шкоду дзяржаве, погляды на такі падыход памяняліся.

Што тычыцца філіялаў расійскіх ВНУ і розных іншых іх структурных адзінак, то яны, можна сказаць, дзейнічалі не зусім легальна. Думаецца, што уладныя структуры аб іх функцыяніраванні доўгі час

нават не ведалі. Падмацаванне гэтых слоў – скандальная справа, звязаная з незадавальняючай падрыхтоўкай спецыялістаў Сучаснай гуманітарнай акадэміяй, структуры якой рашэннем Міністэрства Адукацыі Рэспублікі Беларусь зачынены ў 2010 годзе.

Устаяліся і заваевалі права на далейшую работу толькі тыя ўстановы, стваральнікі і кіраўнікі якіх з самага пачатку ведалі, за якую складаную справу яны бяруцца, якая вялізарная адказнасць на іх кладзецца.Трэба было адкінуць нават думкі аб набыцці сваего матэрыяльнага дастатку праз модны ў той час накірунак дзейнасці. З самага пачатку неабходна было думаць аб агульнаграмадскай карысці і аб якасці вычэбна – выхаваўчага працэса.

Сення ў Беларусі засталося 11 недзяржаўных ВНУ і 2 філіялы. Працуюць на карысць грамадства недзяржаўныя ВНУ, якія с самага пачатку будавалі сваю работу на фундаментальнай аснове, у паўсядзённым жыцці кіраваліся існуючай у Рэспубліцы Беларусь нарматыўнай базай; клапаціліся аб стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы; аб падборы і падрыхтоўцы кваліфікаваных выкладчыкаў; укараненні сучасных педагагічных методык і тэхналогій.

У Віцебскай вобласці, сумесна з устойлівымі дзяржаўнымі ВНУ, пошук спосабаў адаптацыі на пераходным этапе, веў філіял установы адукацыі ФПБ "Міжнародны інстытут працоўных і сацыяльных адносін". Тут з першага дня існавання ставілася мэта дабівацца агульнаграмадскай карысці, пашыраць магчымасці грамадзян Рэспублікі Беларусь у атрыманні вышэйшай адукацыі, весці падрыхтоўку спецыялістаў на ўзроўні еўрапейскіх стандартаў. Філіял першым у Віцебскай вобласці стаў рыхтаваць спецыялістаў вышэйшай адукацыі, якія ў той час былі запатрабаваны на рынку працы рэгіена: эканамістаў-менэджэраў і юрыстаў. Толькі праз два-тры гады гэтыя спецыяльнасці былі адкрыты ў ВДУ, ВДТУ, ПДУ. Прафесарска выкладчыцкі састаў філіала прайшоў не адзін іспыт на права называцца ўстановай па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных эканамістаў, лагістаў, юрыстаў. Як адзначалася ў выніковых даведках камісій Дэпартамента па кантролю за якасцю працы ВНУ, пры пэўнай самастойнасці арганізацыі вучэбнага працэса, іншых пытаннях, калектыў філіала выказваў інтарэсы дяржавы, патрабаванні прынятых у краіне стандартаў адукацыі. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (12.07.2005 г.) МІПСА прыраўнен да джяржаўных ВНУ. Згодна Ўказу № 319 грамадзянам рэспублікі, атрымліваючым першую вышэйшую адукацыю на платнай аснове, прадстаўлены льготы на атрыманне крэдыта для аплаты за навучанне. Вызначаны і іншыя меры, якія садзейнічаюць павялічэнню колькасці падрыхтаваных ВНУ ФПБ спецыялістаў для ўстаноў усіх форм уласнасці.

За 15 год існавання ўзрос лік студэнтаў: пры адкрыцці філіяла набор склаў толькі дзве групы. На пачатак 2009 г. ужо налічвалася 1485 студэнтаў. З філіала выпушчана 1143 маладых спецыяліста. Яны паспяхова выконваюць абавязкі на прамысловых прадпрыемствах, установах розных форм уласнасці. Напрыклад, Аляксей Гапоненка займае пасаду намесніка генеральнага дырэктара Віцебскага ДСК, Міхаіл Кейзераў – кіраўніка юрыдычнай фірмы "Закон і Парадак", Марыя Фёдарава – загадчыцы натарыяльнай канторы ў Сянно, Таццяна Дзегцярова – суддзі Віцебскага раёна.

У 2008 годзе ў філіале працавала на штатнай аснове 100 чалавек. Выкладанне, навукова-даследчую работу ажыццяўлялі 45 выкладчыкаў, каля 50 % з іх мелі навуковыя ступені і званні, 1/3 выкладчыкаў - выпускнікі сваей ВНУ. За час працы ў філіяле супрацоўнікі абаранілі 1 доктарскую і 6 кандыдатскіх дэсертацый, 8 - з'яўляліся аспірантамі і саіскальнікамі.

У 2004 г. у складзе філіяла адкрыт ліцэнзіраваны цэнтр падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. За 2006-2009 г.г. у цэнтры прайшлі падрыхтоўку 4,5 тысячы прафсаюзных работнікаў Віцебскай і Магілёўскай вобласці. Пасля выканання праграмы ім выданы дакументы дзяржаўнага ўзору. Цэнтр вядзе падрыхтоўку асоб, якія адказваюць за тэхніку бяспекі ў працоўных калектывах вобласці. За тры гады адукацыю па зацверджанай праграме з адрывам ад вытворчасці атрымалі 2500 кіраўнікоў і спецыялістаў.

Стабільнасць у рабоце філіяла, якасная падрыхтоўка спецыялістаў закладывалася на стадыі планавання вучэбнага і выхаваўчага працэса, працягвалася пры яго арганізацыі, праз умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, пры падборы прафесарска-выкладчыцкага саставу, наладжаным сістэмным кантролем за ходам заняткаў. Гэтыя праблемы пастаянна займалі кіраўніцтва філіяла, дэканатаў і кафедр. Метады кіравання (пастаноўка задач, прыняцце рашэнняў, іх тлумачэнне, вывучэнне стану вучэбнага працэса, распаўсюджванне лепшага вопыту) былі сарыентаваны на развіцце ў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў працавітасці, адказаных і добрасумленных адносін да выканання сваіх абавязкаў. Усе гады ў філіяле рэалізоўвалася канцэптуальная ўстаноўка на фарміраванне ў студэнтаў самастойнай пазнавальнай дзейнасці.

Для адаптацыі студэнтаў малодшых курсаў была распрацавана спецыяльная праграма, згодна з якой вывучаўся агульнаадукацыйны ўзровень студэнта, яго схільнасці і магчымасці пошуковай дзейнасці, вялося фарміраванне ў студэнта поўнага ўяўлення аб яго будучай прафесіі.

Як было заўважана, добрым стымулам для павышэння самаадукацыйнай матывацыі ў студэнтаў з'яўляліся сучасныя адукацыйныя тэхналогіі. У кароткі тэрмін прыйшлі да таго, што 80% дысцыплін

забяспечваліся матэрыяламі да лекцый, аўтарскімі лекцыйнымі курсамі. Наяўнасць такіх матэрыялаў дазваляла праводзіць лекцыі больш змястоўна, у праблемным, дыскусійным плане, з зваротнай сувяззю. Матэрыялы да лекцый і аўтарскія курсы лекцый ўмацоўвалі глыбіню разглядаемых пытанняў, высноў і абагульненняў. Паколькі студэнты мелі магчымасць азнаеміцца з пытаннямі і сутнасцю тэмы напярэдадні лекцыі, гэта вызваліла навучальны працэс ад руціннай працы – так часта ўжываемага дыктанта. Добрыя вынікі прынесла распрацаваная ў 1996 г. сістэма арыентацыі студэнта на самаадукацыю.

Каб не адстаць ад жыцця адміністрацыя ВНУ праводзіла маніторынг паспяховасці студэнтаў, іх атэстацыю, комплексныя кантрольныя работы. Вялося назапашванне валіднай інфармацыі. Усе гэта садзейнічала ўкараненню перадавых падыходаў да арганізацыі і кіравання навучальным працэсам, састаўленню рацыянальнага раскладу заняткаў, больш дакладнай каардынацыі работы кафедр, узгадненню міждысцыплінарных сувязей, ліквідацыі дубліравання і перагружанасці дысцыплін састарэўшымі палажэннямі і стэрыятыпамі.

Добра разумеючы, што выпуск спецыялістаў, здольных стамастойна працаваць і вучыцца ў далейшым, магчыма ажыццяўляць толькі пры практыкаарыентаваным працэсе, выпускаючыя кафедры наладзілі пастаяннае ўзаемадзеянне з прамысловымі прадпрыемствамі, бізнес-фірмамі, упраўленнем юстыцыіі аблвыканкама, іншымі установамі.

Абставіны, якія склаліся ў Віцебскім філіяле МІПСА на пачатку 2009-2010 навучальнага года падцвердзілі, што яго калектыў ішоў у верным напрамку, але не быў пазбаўлены ад недахопаў і хібаў. На першапачатковым этапе не хапала аўдыторнага фонда, слабым было метадычнае і тэхнічнае забяспячэнне вучэбнага працэса. Больш пяці год спатрэбілася каб скласці працаздольны калектыў. Пры станаўленні філіяла вялікая колькасць выкладчыкаў працавала па сумяшчальніцтву, што адмоўна адбівалася на вучэбна-выхаваўчай рабоце. Было што выпраўляць і на больш познім этапе існавання філіяла. У першую чаргу гэта тычыцца кампетэнтнасці выкладчыкаў, ад чаго залежыць 90-95% поспеху ў развіцці інтэлекта студэнта. У педагагічных дзеяннях асобных выкладчыкаў перабольшвала інфармацыйна-рэпрадукцыйная сістэма, якая не актывізіруе творчыя якасці студэнта, а разам з ім – прафесіяналізм студэнта на выхадзе з ВНУ. Маладыя выкладчыкі з-за недастатковасці метадычнай падрыхтоўкі не знаходзілі падыходаў каб навучыць студэнта дабываць веды з існуючых крыніц, дапамагчы яму своечасова пераадолець перашкоды, узнікаючыя пры вывучэнні дысцыплін.

Усе гады функцыяніраванны філіяла яго калектыў турбавала пытанне маруднага прыстасавання выпускнікоў школ да навучання ў ВНУ. Вялікія намаганні патрабаваліся каб сфарміраваць у студэнтаў навыкі работы з кніжкай, манаграфічнай літаратурай, уменне канспекціраваць лекцыю, засвайваць новыя веды ў ходзе іх выкладання. Яўна праглядвалася праблема адаптацыі большасці выкладчыкаў да выканання імі на сучасным этапе новай ролі – арганізатара вучэбнага працэса. Выхад шукалі праз падрыхтоўку саміх выкладчыкаў: працаваў пастаянна – дзеючы семінар, праводзіліся адкрытыя заняткі лепшых майстроў педагагічнай справы. Прымяняліся іншыя формы і метады ўплыву на выкладчыка з тым, каб падрыхтаваць яго да цэласнай педагагічнай дзейнасці, да ўмення фарміраваць студэнта як гарманічную асобу, патрыета сваей Радзімы, высокакваліфікаванага спецыяліста, чалавека, здольнага самастойна набываць веды і вучыцца праз усе жыццё.

У заключэнне: стварэнне і станаўленне недзяржаўных ВНУ на пачатку 90-х гг. XX ст. ішло складана. Перад стваральнікамі новай формы адукацыі ўзнікала шмат арганізацыйных, фінансавых, кадравых праблем. Большасць з іх з цягам часу ўдалося пераадолець, асобныя засталіся нявырашанымі і сення. Здаралася, што адкрыцце філіялаў, кансультацыйных і ц'ютарскіх пунктаў было паспешным, непрадуманым. Тады такія стуктуры аказваліся не дзеяздольнымі, ліквідаваліся. Тыя ж недзяржаўныя ВНУ, дзе правільна вызначылі тэндэнцыі ў развіцці беларускага грамадства, выкарысталі ў рабоце назапашаны вопыт вышэйшай школы савецкага перыяду, творчыя падыходы ў адукацыі айчынных і замежных універсітэтаў, устойліва працуюць і зараз. Адной з такіх устаноў з'яўляецца філіял УА ФПБ МІПСА ў Віцебску.

Па формам, па зместу і па накіраванасці недзяржаўныя ВНУ ўнеслі свой уклад у сферу айчыннай асветы. У іх дзейнасці праявіліся такія станоўчыя рысы як: здольнасць да хуткай самарэгуляцыі, эфектыўнай рэалізацыі прымаемых рашэнняў, эканомнага ўкладвання сродкаў і самае важнае – высокая ступень індывідуальнай работы са студэнтам. Дзяржава прызнала і ўзаконіла іх дзейнасць.

1. Мандрик, И.В. Вузовское образование: основные подходы к его организации, пути совершенствования / И.В. Мандрик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2006. – № 3. – С. 117 – 122.

2. Трапезникова, Л. Европейский стандарт – в образование (Витебскому филиалу УО ФПБ МИТСО – 15 лет.) / Л. Трапезникова // Беларускі час. 2009. – 27 ноября – 3 декабря. – С. 10.

3. Мандрик, И. Мы учим студентов мыслить / И. Мандрик, С. Залеская // Віцебскі рабочы. – 2008. – 12 чэрвеня. – С. 2.

**Русецкий А.В.**

# 15 ЛЕТ ПО УНИВЕРСИТЕТСКОМУ ПУТИ: ПОИСК, НАХОДКИ, ПРОБЛЕМЫ

Преобразование в 1995 г. Витебского педагогического института имени С.М. Кирова в государственный университет было не только данью моде. Перед коллективом ставилась задача выхода на новые горизонты образовательного процесса, соответствующие мировым стандартам, потребностям белорусского общества и его социально-духовной сферы. По сути, речь шла о переходе вуза из положения «догоняющего развития» (а главным ориентиром для педагогических институтов в Республике Беларусь в те годы оставался Белорусский государственный университет) в позицию реального лидера, способного, если не конкурировать, то соперничать с ведущими учебными заведениями. Основным принципом жизни коллектива стала реализация девиза: «движение вперед через поиск». Нет, этот принцип не провозглашался и не декларировался. Он незримо присутствовал во всех делах и начинаниях, позволил людям (преподавателям, студентам) понять, что нужно делать, чтобы университетская оболочка заполнилась реальными делами.

Прошло 15 лет университетского статуса. Как оценить и чем измерить прожитые годы? Мнения могут быть самыми разными, даже полярными, противоположными. Думаю, что будут правы и те, кто утверждает, что некоторые социальные проблемы университета (да и все системы образования) не решены и в начале XXI века. Оказывают тормозящее действие хроническое недостаточное финансирование, излишняя жесткая регламентация экономической и хозяйственной деятельности, да и чего греха таить, низкий уровень заработной платы преподавательского (неостепененного) и лаборантского состава, снижающие престиж профессии преподавателя (в вузе) и учителя (в общеобразовательной школе). Запредельная аудиторная нагрузка сводит на нет возможность творческого поиска и профессионального самосовершенствования. К тому же эти процессы усугубляются прогрессивным культурным разрывом между поколениями, частой невостребованностью социума «молодого» Знания (как и невостребованностью ценностей Знания у самой молодежи). Такими могут быть оппонирующие позиции скептиков, пессимистов.

И все же правильнее будет видеть не только деревья, а видеть за ними тот набирающий силу лес, в котором позиции университетского многопрофильного образования в регионе становятся все более устойчивыми, приобретают неподдельный авторитет, удовлетворяя не только потребности региона, но и потребности личности в развитии ее

способностей в быстро меняющемся мире. Без преувеличения можно утверждать, что к своему 100-летию университет имени П.М. Машерова идет как крупнейший учебный, научный и культурный центр, создающий и воспроизводящий интеллектуальный потенциал Витебского региона.

